ЧАСОПІС ДЛЯ ВАС

№11 (998), ЛІСТАПАД, 2016
Беларусь. Belarus

# БЕЛАРУСЬ

Палітыка, эканоміка, культура

ISSN 0320-7544




# СУСТРЭНЕМСЯ ЯК ДОБРЫЯ СЯБРЫ

INTERNATIONAL
The Minsk Times
Socio-political Weekly

Пра падзеі ў Беларусі і свеце

Штотыднёвік,
які чытаюць
у арыгінале

Не спазніцеся аформіць падпіску
Індэксы: ведамасны — 637302, індывідуальны — 63730

# ЗМЕСТ




**6** **Савет калектыўнай бяспекі АДКБ: Нас павінны паважаць, а не баяцца**

**14** **Час збіраць камяні** Візіт Прэзідэнта Беларусі ў Кітайскую Народную Рэспубліку многіх прымусіў успомніць пра асаблівасці гандлёва-эканамічнага ды інвестыцыйнага супрацоўніцтва з гэтай краінай. Напэўна, самы раскручаны праект у гэтай сферы — Кітайска-беларускі індустрыяльны парк "Вялікі камень"




**18** **Спяшайцеся рабіць дабро**

**24** **Калі ёсць сапраўдны інтарэс**

**32** **Паглядзець на прыгажосць і адчуць гісторыю**

**34** **Прэферэнцыі для рэзідэнтаў** У Беларусі адзін з эпіцэнтраў, дзе імкліва развіваецца агратурызм, — Гродзенская вобласць

**36** **Мінулае натхняе**

**38** **Усе таленты ў госці да Вялікага** Нічога падобнага ў Вялікім тэатры Беларусі яшчэ гадоў гэтак дзесяць-пятнаццаць назад не было. А цяпер што ні спектакль, то з удзелам зорак з розных краін свету

**43** **Шчаслівы бумеранг** У мінскай галерэі сучаснага мастацтва "АртПорт" адкрылася мастацкая экспазіцыя "5=3". Яе натхніцель і арганізатар — Ларыса Грыбалёва

**50** **Свет, які стварае Зузана** Мастацкая галерэя "Універсітэт культуры" ладзіць артпраекты вядомых замежных аўтараў, знаёмячы беларусаў з іх творчымі дасягненнямі

**52** **У музейным куфры заўсёды шмат цікавага** Нацыянальны мастацкі музей Беларусі — сапраўдная скарбніца прыгожага. У гэтым лёгка пераканацца, дастаткова прыйсці ў музей на экскурсію. Тут кожны знойдзе тое, што не можа не выклікаць цікавасці і пакінуць абыякавым да выстаўленых экспанатаў




**Беларусь. Belarus**

Штомесячны часопіс

**№ 11 (998), лістапад, 2016**
Выдаецца з 1930 года.

**Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 8.**
Выдадзена 2 сакавіка 2009 г. Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

**Заснавальнікі:**
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, Установа Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь "Рэдакцыя газеты "Советская Белоруссия", ААТ "Белзнешэканамбанк"

**Рэдактар**
Віктар Міхайлавіч Харкоў

**Адказны сакратар**
Валянціна Ждановіч

**Дызайн і вёрстка:**
Вадзім Кандрашоў
Надзея Панкратава

**"Беларусь.Belarus"** выходзіць на беларускай, англійскай, іспанскай і польскай мовах.

Часопіс распаўсюджваецца ў 50 краінах свету.

За дакладнасць фактаў, іх інтэрпрэтацыю адказнасць нясуць аўтары публікацый. Пры выкарыстанні матэрыялаў часопіса спасылка на **"Беларусь. Belarus"** абавязковая. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных паведамленняў.

**Выдавец:**
Установа Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь "Рэдакцыя газеты "Советская Белоруссия".
Вул. Б. Хмяльніцкага, 10[a], 220013, Мінск.

Часопіс надрукаваны ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве "Выдавецтва "Беларускі Дом друку". Паліграфічная ліцэнзія №02330/106 ад 30.04.2004. Пр-т Незалежнасці, 79, г. Мінск, Беларусь, 220013

Падпісана ў друк 16.11.16 г.
Выпуск у свет 25.11.16 г.

Афсетны друк. Папера крэйдаваная. Фармат 60х90 1/8. Друкаваных аркушаў 7. Гарнітура Міньён.

**Заказ № 2795**
**Агульны тыраж** — 1939 экз.
(на беларускай мове — 191)

**Адрас рэдакцыі:**
вул. Кісялёва, 11, г. Мінск, Беларусь, 220029.
Тэл.: +375 (17) 290-62-24, +375 (17) 290-66-45.
Тэл./факс: +375 (17) 290-68-31.

**E-mail:** belmag@sb.by
**Падпісны індэкс** — 74820.

**Цана дамоўная.**

© **"Беларусь. Belarus"**, 2016

# Падзеі бачацца ў развіцці

У тым, што спорт мае вялікі ўплыў, ніхто, напэўна, не сумняваецца. Нездарма спартыўныя падзеі ў сусветным, кантынентальным маштабах маюць такі высокі статус. Бо яны здольныя ствараць тую эмацыйную атмасферу, якая аб’ядноўвае людзей, робіць іх бліжэйшымі адзін да аднаго. Так, у апошні час спорт усё часцей атрымлівае палітычную афарбоўку — не без гэтага. Але яго аб’яднаўчы пачатак, пры ўсім пры тым, усё ж застаецца галоўным.

Вялікі гонар для краіны — праводзіць буйныя спартыўныя спаборніцтвы. Гэта трэба заслужыць. Тым больш моцная значнасць рашэння аб тым, што Беларусь атрымала права правядзення другіх Еўрапейскіх гульняў у 2019 годзе. Усё здарылася ў Мінску на нядаўнім пасяджэнні Генеральнай асамблеі Еўрапейскіх алімпійскіх камітэтаў. Што датычыцца арганізацыі маючых адбыцца Гульняў, то ў поспеху няма сумнення ні ў нас, ні ў выканкама ЕАК. Прыклад чэмпіянату свету па хакеі 2014 года пераканаў усіх, што Беларусь умее прымаць турніры самага высокага ўзроўню. Мінск тады паказаў, што можа стварыць такую атмасферу дружалюбнасці, у якой камфортна ўсім. Менавіта на такі стыль Беларусь будзе нацэльвацца і пры падрыхтоўцы Еўрапейскіх гульняў. Чытайце на гэтую тэму публікацыі **“Пад знакам даверу і прызнання”** і **“Гульні зладзім разам”.**



У гэтым нумары часопіса знойдуць адлюстраванне і іншыя важныя падзеі. Перш за ўсё, размова пойдзе пра змест візітаў Прэзідэнта Беларусі ў Катар і Аб’яднаныя Арабскія Эміраты. Матэрыял **“У рэгіёне Персідскага заліва — спрыяльнае надвор’е”** раскрые падрабязнасці. Так, Катар і Аб’яднаныя Арабскія Эміраты з тых дзяржаў, узроўню гандлёва-эканамічных адносінаў з якімі яшчэ давядзецца падцягнуцца да палітычнага. Мы вядзём даверны дыялог. Выдатна разумеем адзін аднаго і на многія пытанні сучаснага светапарадку глядзім з падобных пазіцый. Аказваем узаемную падтрымку на міжнародных пляцоўках. А вось эканамічнае ўзаемадзеянне наяўнаму патэнцыялу яшчэ відавочна не адпавядае. Аб’ёмы тавараабароту — мільёны і дзясяткі мільёнаў долараў, хоць відавочна, што маглі б быць як мінімум на парадак вышэйшыя. Візіты Прэзідэнта Беларусі ў гэтыя краіны якраз і закліканы надаць большую дынаміку дзелавому супрацоўніцтву.

Сёння Мінск прапаноўвае Доху ўжо не раз апрабаваную з рознымі краінамі мадэль развіцця супрацоўніцтва. Руху наперад патрэбныя своеасаблівыя лакаматывы. Іх ролю маглі б выканаць тры-пяць добрых, выгадных абодвум бакам праектаў. Адпаведныя прапановы павінны сфармуляваць урады, а іх абмеркаванне будзе працягнута ўжо падчас будучага візіту Эміра Катара ў Беларусь. А вынікам перагавораў у Доху стала падпісанне пакета дакументаў аб развіцці ўзаемадзеяння ў розных сферах. У прыватнасці, у ахове здароўя і фінансах. Наш Банк развіцця атрымаў магчымасць прыцягнення крэдытаў для фінансавання праектаў у Беларусі на вельмі льготных умовах. Так што ўсё ідзе да таго, што сімвалаў Катара ў Беларусі стане больш. Як і беларускіх, у Катары.

Не менш дзейснымі былі і перагаворы ў Аб’яднаных Арабскіх Эміратах, дзе бакі выходзяць на даволі сур’ёзныя праекты ў сферах высокіх тэхналогій, ваенна-тэхнічнага супрацоўніцтва, навуковай, навукова-вытворчай.

Так, гэта важна, калі падзеі бачацца ў развіцці. Вось у Ерэване ў кастрычніку прайшла сустрэча кіраўнікоў дзяржаў — удзельніц АДКБ. Старшынства ў арганізацыі, дарэчы, перайшло да Беларусі. Але галоўнае, як адзначаюць эксперты, вызначана стратэгія калектыўнай бяспекі, разлічаная да 2025 года. Адным з важнейшых яе складнікаў стала тое, што лідары краін АДКБ вырашылі выступіць супраць міжнароднага тэрарызму адзіным фронтам.

І гэта таксама гаворыць пра прынцыповы падыход, які як ніколі важны ў няпростых умовах сучасных выклікаў. Дакладная рэалізацыя дамоўленасцяў адлюструе перспектыву неабходнасці і развіцця самой АДКБ. Арганізацыі, якая імкнецца ўмацаваць сваю ролю па забеспячэнні бяспекі ў рэгіёне.

**ВІКТАР ХАРКОЎ**

## Сцяг у космасе

**Лётчык-касманаўт Алег Навіцкі даставіць Дзяржаўны сцяг Беларусі на Міжнародную касмічную станцыю**

Гэты палёт для Алега Навіцкага, ураджэнца горада Чэрвеня Мінскай вобласці, стане другім. У першы раз, з 23 кастрычніка 2012 года па 16 сакавіка 2013 года, сцяг таксама быў з ім у космасе, але тады гэты крок насіў неафіцыйны характар.

Касманаўтам дазваляецца браць на борт толькі адзін кілаграм асабістых рэчаў. Алег Навіцкі прызнаўся, што сцяг Беларусі быў першым прадметам, які ён вырашыў абавязкова ўзяць у экспедыцыю.

— Гэта вельмі моцная маральная падтрымка, паколькі хочацца ўзяць тое, што табе асабліва дарага, — растлумачыў ён.

Урачыстая цырымонія перадачы беларускага сцяга адбылася 22 кастрычніка ў пасольстве нашай краіны ў Расійскай Федэрацыі.

Алег Навіцкі паабяцаў пасля вяртання з арбіты перадаць сцяг з афіцыйнымі адзнакамі аб датах стыкоўкі і расстыкоўкі карабля "Саюз МС-03" з МКС у музей пасольства.

## Дакумент як дарожная карта

**У Беларусі прыняты першы Нацыянальны план па правах чалавека**



Нацыянальны план атрымаў падтрымку Прэзідэнта Беларусі, зацверджаны пастановай Савета Міністраў. "Гэты Нацыянальны план — палітычны дакумент, які з'яўляецца своеасаблівай дарожнай картай і вызначае асноўныя напрамкі дзейнасці па імплементацыі нашых абавязкаў па захаванні правоў чалавека, — сказала на мерапрыемстве, прысвечаным Дню ААН, намеснік Міністра замежных спраў Алена Купчына. — Для мяне асаблівы гонар аб'явіць аб прыняцці Нацыянальнага плана ў дзень старту кампаніі "Інклюзіўная Беларусь".

Кампанія накіравана на павышэнне дасведчанасці грамадства аб бар'ерах і няроўнасці, на барацьбу са стыгматызацыяй уразлівых груп насельніцтва.




# Годнае месца

**Беларусь заняла 30-е месца сярод 144 дзяржаў свету ў рэйтынгу забеспячэння раўнапраўя паміж жанчынамі і мужчынамі**

Такія дадзеныя прыводзяцца ў штогадовым дакладзе Сусветнага эканамічнага форуму, прадстаўленым у Жэневе. На лідзіруючых пазіцыях у сусветным рэйтынгу — Ісландыя, Фінляндыя і Нарвегія. Беларусь займае ў падагульняючай табліцы 30-ы радок — паміж Іспаніяй і Партугаліяй. Расія — на 75-м месцы. Аўтары даклада аналізуюць сітуацыю ў галіне забеспячэння роўных правоў жанчын і мужчын з прымяненнем так званага індэкса гендарнага разрыву, распрацаванага ў СЭФ. Гэты індэкс улічвае становішча, правы і ролю жанчын і мужчын у розных сферах грамадскага і эканамічнага жыцця, а таксама ў палітыцы. У выніку Беларусь атрымала 0,737 бала, гэта значыць разрыў у забеспячэнні гендарнай роўнасці ў Беларусі пераадолены на 73,7 працэнта, што істотна перавышае сярэднесусветны паказчык (68 працэнтаў). Дарэчы, у Расіі гэты гендарны індэкс складае 69,1 працэнта, а ў Ісландыі — 87,4 працэнта. Беларусь займае высокае 5-е месца ў забеспячэнні роўнасці жанчын і мужчын у эканамічнай сферы (0,823 бала), 29-е — па доступе да адукацыі (1,000), 40-е — па доступе да аховы здароўя (0,979). А ў графе "палітычны ўплыў" СЭФ вызначыў Беларусь на 80-е месца (Расію — на 129-е). У цэлым у свеце сітуацыя, паводле версіі СЭФ, адносна паспяховая ў сферы доступу да адукацыі (95 працэнтаў) і аховы здароўя (96 працэнтаў). Але па іншых двух паказчыках — эканоміка (59 працэнтаў) і палітыка (23 працэнты) — патрабуецца прыкласці немалыя намаганні для дасягнення гендарнага раўнапраўя. Як палічылі эксперты СЭФ, пры цяперашніх тэмпах змен для пераадолення гендарнага разрыву спатрэбіцца 83 гады. У сферы эканомікі на гэта можа спатрэбіцца 170 гадоў, у сферы адукацыі гендарны разрыў магчыма ліквідаваць праз 10 гадоў, у палітыцы — праз 82 гады. Што датычыцца аховы здароўя, то з 2006 года гендарны разрыў у гэтай сферы павялічыўся, таму экспертам складана рабіць прагнозы на будучае.

# У рэгіёне Персідскага заліва — спрыяльнае надвор'е

**Катар і Аб'яднаныя Арабскія Эміраты з тых дзяржаў, узроўню гандлёва-эканамічных адносінаў з якімі яшчэ трэба будзе падцягнуцца да палітычнага. Мы вядзём даверны дыялог. Выдатна разумеем адзін аднаго і на многія пытанні сучаснага светапарадку глядзім з падобных пазіцый. Аказваем узаемную падтрымку на міжнародных пляцоўках. А вось эканамічнае ўзаемадзеянне наяўнаму патэнцыялу яшчэ яўна не адпавядае. Аб'ёмы тавараабароту — мільёны і дзясяткі мільёнаў долараў, хоць відавочна, што маглі б быць як мінімум на парадак вышэйшыя. Візіты Прэзідэнта Беларусі ў гэтыя краіны якраз і заклікаюць надаць большую дынаміку дзелавому супрацоўніцтву.**

Візіт у Катар меў статус афіцыйнага. Яго цэнтральным мерапрыемствам сталі перагаворы Прэзідэнта з Эмірам гэтай краіны шэйхам Тамімам бен Хамадам аль-Тані. Катарскі бізнес ужо мае сваю візітную картку ў беларускай сталіцы. Гэта атэльны комплекс "Марыёт" на праспекце Пераможцаў. Цяпер рэалізуецца яшчэ адзін інвестыцыйны праект з катарскім капіталам у сферы аховы здароўя. Гэтыя прыклады цалкам можна лічыць апорнымі пунктамі супрацоўніцтва, на досведзе якіх можна развіваць сумесную работу.

Кіраўнікі дзвюх краін канстатавалі наяўнасць даверных адносінаў як на міждзяржаўным, так і на асабістым узроўнях. Гаварылі пра добрае ўзаемадзеянне ў палітыцы. Але на неабходнасць нарошчвання гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва звярнулі ўвагу асаблівую. Ключавымі перспектыўнымі напрамкамі названы сферы інвестыцый і гандлю. Прычым з акцэнтам на стварэнне сумесных прадпрыемстваў. Катар заяўляе пра вялікую цікавасць да беларускай дрэваапрацоўкі, да нашых прадуктаў харчавання.

Мінск прапаноўвае Доху ўжо не раз апрабаваную з рознымі краінамі мадэль развіцця супрацоўніцтва. Руху наперад патрэбныя своеасаблівыя лакаматывы. Іх ролю маглі б выканаць тры-пяць добрых, выгадных абодвум бакам праектаў. Адпаведныя прапановы павінны сфармуляваць урады, а іх абмеркаванне будзе прыцягнута ўжо падчас будучага візіту Эміра Катара ў Беларусь.

Вынікам перагавораў у Доху стала падпісанне пакета дакументаў аб развіцці ўзаемадзеяння ў розных сферах. У прыватнасці, у ахове здароўя і фінансах. Наш Банк развіцця атрымаў магчымасць прыцягнення крэдытаў для фінансавання праектаў у Беларусі на вельмі льготных умовах. Так што ўсё ідзе да таго, што сімвалаў Катара ў Беларусі стане больш. Як і беларускіх у Катары.

Не менш дзейснымі былі і перагаворы Прэзідэнта з наследным прынцам Абу-Дабі, намеснікам Вярхоўнага галоўнакамандуючага ўзброенымі сіламі ААЭ шэйхам Мухамедам бен Заідам аль-Нахаянам. Візіт у ААЭ мае статус рабочага, і змест яго адпаведны. Прэзідэнт і прынц гаварылі пра канкрэтныя праекты на дзясяткі мільёнаў долараў.

***Візіты Прэзідэнта Беларусі на Блізкі Усход, як заўсёды, насычаныя дзелавым зместам. Яны маюць канкрэтнае вымярэнне ўжо рэалізуемымі і будучымі праектамі. Калі такія ініцыятывы патраніруюць асабіста кіраўнікі дзяржаў, то ў поспеху сумненняў няма***



БЕЛТА

Аляксандр Лукашэнка і шэйх Мухамед бен Заід аль-Нахаян

Пасол Беларусі ў ААЭ і Катары па сумяшчальніцтве Раман Галоўчанка расказаў, што большую частку гутаркі суразмоўцы прысвяцілі вынікам рэалізацыі тых дамоўленасцяў, якія былі дасягнуты падчас папярэдніх сустрэч:

— Мы вельмі шчыльна ў апошні год адпрацоўвалі тыя напрамкі і задачы, якія былі пастаўлены кіраўнікамі дзяржаў перад беларускімі суб'ектамі гаспадарання, і цяпер падвялі прамежкавыя вынікі. Мы выходзім на даволі сур'ёзныя праекты ў сферах высокіх тэхналогій, ваенна-тэхнічнага супрацоўніцтва, навуковай, навукова-вытворчай.

Тут дарэчы будзе прывесці рэальныя прыклады. Так, Мінскі завод колавых цягачоў у наступным годзе пачне пастаўку ў Эміраты найноўшых высокапраходных аўтамабіляў. Тэхніка праходзіць апошнія выпрабаванні ў краіне-заказчыцы. Гэта не першая падобная здзелка. Тэхніку МЗКЦ ААЭ набывалі і раней. Яна добра сябе зарэкамендавала, і тое, што супрацоўніцтва працягваецца, гаворыць пра сур'ёзныя канкурэнтныя перавагі мінскіх аўтамабілебудаўнікоў. Прычым прапаноўваюць яны не толькі ўласна вырабы, але і спадарожны сэрвіс, абслугоўванне, навучанне. Такія здзелкі называюцца пакетнымі, што само па сабе павінна ўспрымацца як арыенцір іншымі беларускімі вытворцамі, якія імкнуцца на эмірацкі рынак.

Асабліва важным напрамкам бачыцца працяг і нарошчванне інвестыцыйнага ўзаемадзеяння. Добра зарабляючы на экспарце энерганосьбітаў, ААЭ глядзяць у будучыню і імкнуцца ўкладваць грошы ў перспектыўныя праекты па ўсім свеце. Беларусь эмірацкі бізнес бачыць вельмі прывабнай пляцоўкай для размяшчэння капіталаў. Гэтак жа як і Катар, ААЭ цікавяць нашы дрэваапрацоўка і харчаванне. Тамтэйшы бізнес гаворыць аб гатоўнасці ўкладваць сродкі ў стварэнне сумесных прадпрыемстваў у нашай краіне, арыентаваных на беларускую сыравіну і вытворчасць прадукцыі пад запатрабаванні Арабскіх Эміратаў. Мінск такія ініцыятывы вітае.

Як відаць, візіты Прэзідэнта Беларусі на Блізкі Усход, як заўсёды, насычаныя дзелавым зместам. Яны маюць канкрэтнае вымярэнне ўжо рэалізуемымі і будучымі праектамі. Калі такія ініцыятывы патраніруюць асабіста кіраўнікі дзяржаў, то ў поспеху сумненняў няма.

Дзмітрый **Крат**



БЕЛТА

Лідары краін АДКБ вырашылі выступіць супраць міжнароднага тэрарызму адзіным фронтам

## Савет калектыўнай бяспекі АДКБ:

# Нас павінны паважаць, а не баяцца

**У Ерэване прайшла сустрэча кіраўнікоў дзяржаў — удзельніц арганізацыі. Старшынства перайшло да Беларусі. І, галоўнае, вызначана стратэгія дзейнасці АДКБ да 2025 года.**

### Улічылі ўсе пагрозы

Для ўдзелу ў нарадзе ў сталіцу Арменіі з'ехаліся кіраўнікі дзяржаў — удзельніц арганізацыі, якія дамовіліся аб супрацоўніцтве ў складаных умовах цяперашняй міжнароднай абстаноўкі.

— Сёння разбураны глабальныя сістэмы бяспекі. Паміж вядучымі сусветнымі гульцамі прыпынены любыя кантакты і супрацоўніцтва ў такіх сферах, як барацьба з тэрарызмам, нелегальным абаротам наркотыкаў ды іншымі выклікамі і пагрозамі, — абмаляваў міжнародную абстаноўку Генеральны сакратар АДКБ Мікалай Бардзюжа.

У рамках саміту было падпісана больш за 20 дакументаў, якія адлюстроўваюць перспектывы развіцця арганізацыі. Але галоўным з іх стала Стратэгія калектыўнай бяспекі, разлічаная да 2025 года.

— Дзяржавы зноў пацвердзілі сваю рашучасць выбудоўваць адносіны з членамі сусветнай супольнасці на асновах роўнасці і непадзельнасці бяспекі, устрымлівацца ў міжнародных адносінах ад пагрозы сілай або яе прымянення, пры гэтым у вырашэнні ўзнікаючых праблем аддаваць прыярытэт палітыка-дыпламатычным метадам. Лічу, што прыняцце Стратэгіі прадэманстравала новую якасць каардынацыі ў АДКБ, — сказаў Прэзідэнт Арменіі Серж Саргсян.

Паводле слоў саветніка Прэзідэнта Расіі Юрыя Ушакова, да знешніх пагроз дакумент у тым ліку адносіць аднабаковае разгортванне амерыканскай сістэмы супрацьракетнай абароны.

Акрамя таго, Савет калектыўнай бяспекі вырашыў стварыць Цэнтр крызіснага рэагавання АДКБ. У гэтай структуры дзве галоўныя функцыі. Па-першае, гэта аналітычнае і арганізацыйнае суправаджэнне прынятых кіраўніцтвам арганізацыі рашэнняў. А па-другое, абмен інфармацыяй, якая датычыцца забеспячэння бяспекі, у рэжыме рэальнага часу паміж краінамі-ўдзельніцамі дагавора. У бліжэйшы час у нашых краін з'явіцца агульны спіс тэрарыстычных і экстрэмісцкіх арганізацый.

— Гэта выхад на новы ўзровень якасці каардынацыі ў рамках АДКБ, — упэўнены Серж Саргсян.

## "Не трэба чакаць прызнання ад НАТА"

Старшынствуюць у арганізацыі краіны па чарзе. На саміце руль кіравання перайшоў ад Арменіі да Беларусі. Свае прыярытэты ў якасці старшыні АДКБ Беларусь прадставіць у бліжэйшы час.

Кіраўнікі дзяржаў — прыехаць з-за хваробы не змог толькі Прэзідэнт Казахстана Нурсултан Назарбаеў — некалькі гадзін мелі зносіны за зачыненымі дзвярамі. Гутарка, галоўным чынам, ішла пра ваенныя канфлікты ў свеце і тыя пагрозы, якія перашкаджаюць развіццю краін — членаў арганізацыі.

Мінск не хоча прапаноўваць калегам агульныя словы, замест гэтага беларусы паабяцалі распрацаваць канцэпцыю па вывадзе АДКБ на якасна новы ўзровень.

— Каб яе не баяліся, але паважалі, — сфармуляваў задачы старшынства Беларусі ў арганізацыі Аляксандр Лукашэнка. — Мы ўсе канстатавалі, што АДКБ ніхто не хоча прызнаваць, асабліва НАТА, — ці бачыце, арганізацыя не тая. Я слухаў гэтыя размовы і думаў: калі мы будзем іх прасіць, каб яны нас прызналі, яны ніколі нас не прызнаюць. Нам трэба зрабіць такім чынам, каб прымусіць іх прызнаць нашу арганізацыю.

Паміж тым і ў межах АДКБ застаюцца ачагі напружанасці. Кіраўнікі дзяржаў прынялі дакумент, асабліва важны для Арменіі, — заяву па нагорна-карабахскім канфлікце. У ім пацвярджаюцца прынцыпы ненасільнага вырашэння пытання.

— АДКБ стваралася для купіравання пагроз знешняга характару, — нагадаў Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін. — Мы павінны імкнуцца да таго, каб усе праблемы, якія дасталіся нам з мінулага, вырашаліся мірным шляхам на аснове кампрамісаў. У гэтым кантэксце мы абмяркоўвалі і карабахскую праблему.

### Каментарый эксперта



**Юрый ШАЎЦОЎ, дырэктар Цэнтра па праблемах еўрапейскай інтэграцыі (Мінск):**

*— Рашэнні, прынятыя на саміце, нельга назваць нечаканымі, хутчэй, доўгачаканымі. Пункт апоры і для Расіі, і для яе саюзнікаў трэба шукаць ва ўмацаванні сувязяў паміж сабою. Што і адбылося ў Ерэване. Стратэгія калектыўнай бяспекі заключаецца не толькі з палажэнняў аб ваенным супрацоўніцтве. Асобна вынесены блок пытанняў аб унутраных пагрозах і процідзеянні "гібрыднай вайне" і "каляровым рэвалюцыям". Рыхтуюцца новыя меры па барацьбе з самым шырокім спектрам выклікаў: ад вербавання грамадзян нашых краін тэрарыстычнымі арганізацыямі да "брудных" фінансавых патокаў.*

## Пра што дамовіліся прэзідэнты

- **узгадняць пазіцыі па рэгіянальных праблемах бяспекі;**
- **забяспечваць адкрытасць АДКБ для любых дзяржаў, якія падзяляюць яе мэты і прынцыпы;**
- **садзейнічаць фарміраванню новай архітэктуры еўраатлантычнай і еўразійскай бяспекі, заснаванай на забеспячэнні роўнай бяспекі для ўсіх дзяржаў;**
- **вырашыць пытанні нераспаўсюджання зброі масавага знішчэння і яе ліквідацыі;**
- **сфарміраваць сістэму крызіснага рэагавання АДКБ;**
- **узгадніць пытанні аператыўнага абсталявання тэрыторый дзяржаў — членаў АДКБ у інтарэсах калектыўнай бяспекі;**
- **узгадніць праграму падрыхтоўкі ваенных спецыялістаў;**
- **скаардынаваць планы распрацоўкі, вытворчасці, паставак і рамонту ўзбраення і ваеннай тэхнікі;**
- **забяспечыць для вытворцаў роўныя ўмовы пры пастаўках узбраення, ваеннай і спецыяльнай тэхнікі;**
- **сумесна дзейнічаць пры вышуку асобаў, якія маюць дачыненне да тэрарызму, і пры перакрыцці каналаў вербавання грамадзян у зоны ўзброеных канфліктаў;**
- **стварыць базу дадзеных аб тэрарыстычных і экстрэмісцкіх арганізацыях, аб асобах, якія належаць або падазраюцца ў прыналежнасці да іх, і іх перамяшчэннях, у тым ліку з выкарыстаннем падробленых дакументаў;**
- **падчас ліквідацыі надзвычайных сітуацый разгортваць гуманітарныя цэнтры з папаўняемым запасам медыкаментаў і гуманітарных грузаў;**
- **сфарміраваць калектыўную сістэму рэагавання на пагрозу "каляровай рэвалюцыі".**




# Пад знакам даверу і прызнання

## Беларусь атрымала права правядзення другіх Еўрапейскіх гульняў у 2019 годзе

Па законе жанру апісанне пасяджэння Генеральнай асамблеі Еўрапейскіх алімпійскіх камітэтаў, якое прайшло ў Мінску, патрабавала б інтрыгі. Маўляў, затаіўшы дыханне сачылі за ходам галасавання па галоўным для нас пытанні. Трымалі кулакі пры падліку галасоў, і эмоцыі захліснулі, калі даведаліся, што перамог Мінск. Аднак тут яўна не той выпадак. Яшчэ да разгляду пытання, з першых хвілін пасяджэння, прадстаўнікі кіраўніцтва асамблеі гаварылі з трыбуны пра рашэнне правесці Гульні ў нас як пра ўжо вядомы факт. Іх цёплыя словы пра краіну, заслугі дзяржавы ў справе папулярызацыі спорту, ды і проста прывітальныя абдымкі Аляксандра Лукашэнкі і выконваючага абавязкі прэзідэнта Еўрапейскіх алімпійскіх камітэтаў Янеза Качыянчыча ўсё растлумачылі без лішніх слоў. Узаемаразуменне ў нас поўнае. Усе члены Генасамблеі на пазітыўнай хвалі. І калі ўжо ў пытаннях далікатных мы не хаваем тоеснасці ацэнак, то і інтрыгу ў працэдурныя моманты ўжо ніяк не ўпісаць.

Гэта да таго, што ў самым пачатку свайго выступлення Прэзідэнт сказаў словы падтрымкі ў адрас кіраўніка ЕАК Патрыка Хікі. Чалавека па надуманай падставе абвінавацілі ў спекуляцыі білетамі на Гульні ў Рыа. Доказаў не прадстаўлена. І агучаная Аляксандрам Лукашэнкам пазіцыя Мінска ў гэтым пытанні супадае з ацэнкамі Выканкама ЕАК:

— Часам крыўдна і смешна, калі з нашых радоў па надуманых прычынах пачынаюць вырываць самых дзейных людзей, функцыянераў, якія не толькі маюць уласнае меркаванне, а гатовыя ў любы момант заявіць яго. Нам ніхто рот не закрые. Мы павінны сумленна, адкрыта і прынцыпова выказвацца па ўсіх пазіцыях, а любога з нашых сяброў, супрацоўнікаў мы здолеем абараніць разам.

Гэтыя словы зала сустрэла апладысментамі.

Што датычыцца арганізацыі маючых адбыцца Гульняў, то ў поспеху няма сумненняў ні ў нас, ні ў выканкама ЕАК. Прыклад чэмпіянату свету па хакеі ў 2014 годзе пераканаў усіх, што Беларусь умее прымаць турніры самага высокага ўзроўню. Цікавую думку выказаў Янез Качыянчыч на сустрэчы з Прэзідэнтам перад пасяджэннем. На ЧС-2014 яго вельмі ўразіла работа з балельшчыкамі і фанатамі. Гэта значыць тая частка спартыўных мерапрыемстваў, якая дастаўляе больш за ўсё галаўнога болю арганізатарам. Мінск жа паказаў, што можа стварыць такую атмасферу дружалюбнасці, у якой камфортна ўсім. Менавіта на такі стыль мы будзем нацэльвацца і пры падрыхтоўцы Еўрапейскіх гульняў. Прэзідэнт запэўніў прысутных на пасяджэнні: мы будзем рабіць перш за ўсё добрыя Гульні. Каб спартсмены і госці, якія прыедуць, тут адпачылі душой. У гэтым наша візітная картка.

Пра гэта Аляксандр Лукашэнка сказаў і на сустрэчы з віцэ-прэзідэнтам Нацыянальнага алімпійскага камітэта Азербайджана Чынгізам Гусейнзадэ:

— Мы шукалі нейкі алгарытм правядзення падобных Гульняў. Думаю, што мы зробім іх душэўнымі, зробім іх для спартсменаў.

Баку, вядома, задаў вельмі высокую планку першымі спаборніцтвамі. Сяброўская парада нам будзе патрэбна. Але і контуры ўласнага сцэнарыя, як відаць, ужо ёсць.

У гэты ж дзень Аляксандр Лукашэнка правёў сустрэчы з прэзідэнтам Асацыяцыі нацыянальных алімпійскіх камітэтаў, прэзідэнтам Алімпійскага савета Азіі, членам Міжнароднага алімпійскага камітэта шэйхам Ахмадам аль-Фахадам аль-Сабахам, з прэзідэнтам НАК Арменіі Гагікам Царукянам. Ад ЕАК, шэрага нацыянальных алімпійскіх камітэтаў, Міжнароднай федэрацыі бокса кіраўніку НАК А.Лукашэнку былі ўручаныя ўзнагароды. Яшчэ яркі штрых да ацэнак сусветнай спартыўнай супольнасці справы папулярызацыі здаровага ладу жыцця ў нашай краіне. Аляксандр Лукашэнка падзяліўся некаторымі сваімі думкамі пра пажаданае развіццё спорту на планеце. Яны датычацца непрымання допінгу, але выключаюць калектыўную адказнасць. Мінск вітае правядзенне трансгранічных спаборніцтваў, выступаючы за спорт без межаў. Яшчэ адна беларуская ініцыятыва заключаецца ў тым, каб прадумаць сістэму адукацыі спартсменаў, якія завяршаюць кар'еру.

Удзельнікі пасяджэння не хавалі добрага настрою. У такой жа дружалюбнай і душэўнай атмасферы, бясспрэчна, пройдуць праз некаторы час і самі Гульні.

Дзмітрый **Крат**

## З першых вуснаў



**Леанід Тараненка, алімпійскі чэмпіён 1980 года па цяжкай атлетыцы:**

*— Еўрапейскія гульні, вядома, адрозніваюцца ад Алімпіяд, але гэта ўсё роўна міжнародны старт вельмі высокага ўзроўню. Правядзенне Гульняў у Мінску — не толькі знак даверу і прызнання Беларусі як сур'ёзнай спартыўнай дзяржавы, але і магчымасць для развіцця спорту. У свой час я прымаў удзел у Алімпіядзе 1980 года ў Маскве і памятаю, які эфект тыя Гульні аказалі на ўвесь савецкі спорт. Іх спадчынай усе мы карысталіся яшчэ не адзін дзясятак гадоў. Нешта падобнае чакае цяпер і Беларусь. Падрыхтоўка да такога старту — гэта не толькі стварэнне ўмоў для трэніровак вядучых атлетаў, але і прывядзенне ўсёй спартыўнай інфраструктуры да належнага ўзроўню. Сумарны ж эфект ад наладжвання кантактаў на міжнародным спартыўным узроўні, стварэння іміджу і прывядзення ў парадак спартыўнай гаспадаркі, упэўнены, дапаможа беларускаму спорту выйсці на новы ўзровень.*



**Леанід Гейштар, алімпійскі чэмпіён Рыма-1960 у веславанні на каноэ:**

*— Ну якія тут могуць быць эмоцыі? Навіна на ўра! Наша сталіца больш чым годная прымаць спаборніцтвы такога ўзроўню. Вядома ж, для краіны — гонар стаць пляцоўкай еўрапейскіх спаборніцтваў. І паказчык таго, што Беларусь займае вядучыя пазіцыі ў сусветным спорце і да нас ставяцца вельмі паважліва. Тым больш за апошнія дзесяцігоддзі краіна не аднойчы паказвала і даказвала, што здольная праводзіць сур'ёзныя спаборніцтвы прыгожа, арганізавана і якасна. Досвед у нас ужо ёсць. А яшчэ, на мой погляд, што самае галоўнае, гэта будзе сапраўднае свята для беларусаў!*

***— Вы хочаце сказаць, беларускіх спартсменаў...***

*— Ды не толькі. Успомніце тую атмасферу, якая панавала ў дні чэмпіянату свету па хакеі. Гэта ж усеагульны ўздым і адзінства. Убачыць вядомых спартсменаў, пагрузіцца ў дух барацьбы лепшых сярод лепшых. На самай справе ўсё гэта дарагога варта. А як важна, што відавочцамі Еўрапейскіх гульняў стануць дзеці і падлеткі. Успамінаю свае малыя гады. Пасля вайны для нас, хлопцаў, было за шчасце нават першынство горада па футболе. А калі гомельская каманда выйграла ў масквічоў, гэта ж увесь Гомель радаваўся. Незнаёмыя людзі, сустракаючыся на вуліцах, адзін аднаго віншавалі і абдымалі. Дзятву нельга было выгнаць з дваровых пляцовак, дзе круглымі суткамі ганялі футбольны мяч, пераймаючы дарослых гульцоў. Што ўжо гаварыць пра турнір такога маштабу.*

## З першых вуснаў



**Марыя Мамашук, сярэбраны прызёр Алімпіяды ў Рыа па вольнай барацьбе:**

*— Дзякуй за навіну! Што такое Еўрапейскія гульні, я ўжо ведаю. Давялося прымаць удзел у першых такіх спаборніцтвах, якія ў мінулым годзе праходзілі ў Баку. Магу сказаць, арганізаваны яны былі выдатна. Так што спаборніцтвы, якія, прыемна ўсведамляць, пройдуць у Мінску ў 2019 годзе, сапраўды, вельмі сур'ёзныя. Але нічуць не сумняваюся, што наша краіна да гэтай падзеі падрыхтуецца на ўсе дзесяць балаў.*



**Аляксандр Каршакевіч, віцэ-чэмпіён Алімпійскіх гульняў у Маскве-1980 і чэмпіён Алімпійскіх гульняў у Сеуле-1988 у гандболе:**

*— Ёсць лёгкі прысмак шкадавання ад таго, што мой любімы гандбол не ўваходзіць у праграму Еўрапейскіх гульняў. Аднак так ці інакш я зведваю гонар за нашу краіну. Мы правядзём Еўрапейскія гульні — і гэта прызнанне.*

***— Вы ўдзельнічалі ў дзвюх Алімпіядах...***

*— Калі прыязджаў на чэмпіянат свету ці Алімпійскія гульні, у мяне ўсе думкі ў першую чаргу былі пра спаборніцтвы, а не пра тое, як усё арганізавана вакол. І тым не менш атмасфера, безумоўна, запаміналася. У Сеуле жылі ў Алімпійскай вёсцы, знаходзіліся ў цэнтры алімпійскага руху — нельга было не пранікнуцца ўсімі гэтымі эмоцыямі. Ды і 1980-ы, хоць мы тады практычна не жылі ў Алімпійскай вёсцы, а ў асноўным былі на базе ў Навагорску, як цяпер перад вачамі. Калі на цырымоніі закрыцця маскоўскай Алімпіяды ў начное неба ляцеў той вялізны Мішка, рыдаў, напэўна, увесь свет. Я, зрэшты, тады рыдаў з іншай нагоды. З-за таго, што мы ўсё-такі прайгралі немцам адзін мяч у фінале.*



**Марына Літвінчук, бронзавы прызёр Алімпійскіх гульняў у Лондане-2012 і Рыа-дэ-Жанейра-2016 у веславанні на байдарках:**

*— Навіна пра тое, што Беларусі даручана правядзенне другіх Еўрапейскіх гульняў, мяне, зразумела, узрадавала. У нас ёсць усе спартыўныя будынкі, у якіх можна на вельмі годным узроўні праводзіць самыя маштабныя спаборніцтвы. І для людзей Еўрагульні стануць вялікім святам. У Беларусі шмат балельшчыкаў, і знатакі напэўна атрымаюць вялікае задавальненне.*

# Гульні зладзім разам

## У Мінску прайшла Генеральная асамблея Еўрапейскіх алімпійскіх камітэтаў

Калі кіраўнікі Еўрапейскіх алімпійскіх камітэтаў і міжнародных федэрацый па відах спорту вырашылі сабрацца на штогадовае падвядзенне вынікаў у Мінску, у Беларусі будучую асамблею разглядалі як падставу для святкавання прыгожай даты. Роўна 25 гадоў назад быў створаны Нацыянальны алімпійскі камітэт. Гэтай жа падзеі быў першапачаткова прысвечаны і арганізаваны ў Тэатры оперы і балета ўрачысты вечар. І, дарэчы, вечар удаўся. Сабраць разам такую колькасць спартсменаў, трэнераў і тых, хто так ці інакш у розныя гады ўнёс істотны ўклад у развіццё беларускага спорту, за гэтыя 25 гадоў не ўдавалася яшчэ нікому. У чаканні трэцяга званка ў прасторным холе Тэатра оперы і балета ўсміхаліся, здзіўляліся і ўспаміналі самыя яркія перамогі больш за тысячу чалавек. Аднак усе размовы пачыналіся з адной агульнай тэмы — Еўрапейскіх гульняў, якія нечакана аказаліся “нашымі”.

Выклік сур'ёзны і цікавы. Праводзіць паралелі паміж класічнымі і кантынентальнымі Алімпіядамі не зусім правільна. Аднак атмасфера першых Еўрапейскіх гульняў, якія адбыліся год назад у Баку, аказалася нават лепшай, чым у Рыа-дэ-Жанейра, і таму цяперашнія вынікі галасавання можна лічыць поспехам. Незадаволеныя, праўда, таксама знайшліся. Прадстаўнікі гульнявых відаў спорту, напрыклад, наракалі на агучаную першым намеснікам Міністра спорту Аляксандрам Гагіевым перспектыву ўключэння ў праграму “беларускіх” Гульняў толькі баскетбола 3х3 і настольнага тэніса. Спіс, праўда, яшчэ не закрыты (прымаючая Еўрапейскія гульні краіна можа сама акрэсліваць кола спаборніцтваў, якія цікавяць яе). Больш за тое, памочнік Прэзідэнта па пытаннях фізічнай культуры, спорту і развіцця турызму Максім Рыжанкоў адзначыў, што ў праграму Еўрапейскіх гульняў можа быць уключана нават некалькі неалімпійскіх відаў, у якіх традыцыйна моцныя беларусы. У сваю чаргу намеснік старшыні Беларускай федэрацыі гандбола Іван Семяненя запэўніў: кропка ў гэтым пытанні пакуль не пастаўлена.



БЕЛТА

## З нагоды

■ Прызёрамі першых Еўрапейскіх гульняў у Баку з’яўляюцца 43 беларускія спартсмены. Чэмпіёнамі сталі самбісты Сцяпан Папоў і Таццяна Мацко, канаісты Андрэй і Аляксандр Багдановічы, байдарачніца Марына Літвінчук выйграла золата як асабіста, так і ў экіпажы з Маргарытай Махневай, у веласпорце па-за канкурэнцыяй былі Васіль Кірыенка і Алена Амялюсік, у гімнастак на вышэйшую прыступку п’едэстала паднялася зборная ў групавых практыкаваннях, у спаборніцтвах па стральбе з пнеўматычнай вінтоўкі першынстваваў Віталь Бубновіч, а Васіліса Марзалюк выйграла тытул чэмпіёнкі ў вольнай барацьбе.

— Мы маем намер змагацца за месца ў праграме. Зразумела, што ўсе віды ўключыць у яе немагчыма, але гандбол, як, зрэшты, і іншыя гульнявыя віды спорту, па-першае, відовішчны і папулярны, а па-другое, мае багатыя традыцыі ў нашай краіне. Ды і шанцы прабіцца на Алімпіяду ў нас нядрэнныя.

Вялікія амбіцыі ў лёгкаатлетаў. Каралева спорту таксама можа не турбавацца за месца ў раскладзе другіх Еўрапейскіх гульняў. Больш за тое, прымаць гасцей яна будзе ў новым доме — на абноўленым стадыёне “Дынама”. Пры гэтым старшыня БФЛА Вадзім Дзевятоўскі бачыць у гэтым шырокія магчымасці для таго, каб сур’ёзна замахнуцца на правядзенне ў Мінску паўнацэннага чэмпіянату Еўропы ды іншых міжнародных стартаў. А заадно нагадвае, што ў лёгкаатлетаў акурат на 2019 год запланавана яшчэ адно вельмі сур’ёзнае і маштабнае мерапрыемства — матчавая сустрэча ЗША — Еўропа па лёгкай атлетыцы:

— Працэс арганізацыі гэтага турніру ўваходзіць у фінальную стадыю, прычым правядзенне Еўрапейскіх гульняў нам ніколькі не перашкаджае. А з прэзідэнтам Еўрапейскай федэрацыі лёгкай атлетыкі Свенам Арнэ Хансэнам, які прыехаў да нас на Генеральную асамблею ЕАК, мы абмеркавалі перспектывы правядзення ў нас і іншых буйных лёгкаатлетычных турніраў.

Барацьба, веласпорт. Мастацкая гімнастыка, плаванне, веславанне… Спіс традыцыйна “беларускіх” відаў спорту пры бліжэйшым разглядзе аказваецца вельмі вялікі. Наўрад ці нехта з іх захоча прайграць перад сваімі балельшчыкамі, і таму работа ў трэнераў і спартыўных кіраўнікоў у бліжэйшыя 2,5 года намячаецца маштабная. Тым больш што, акрамя спартыўных аб’ектаў Мінска, для правядзення спаборніцтваў плануецца задзейнічаць і іншыя спартыўныя аб’екты. Гэта значыць, што спартыўнае свята закране, без перабольшання, усю краіну, а эфект ад яго правядзення беларускі спорт будзе адчуваць яшчэ не адзін алімпійскі цыкл.

Дзмітрый **Камашка**

## Кампетэнтна

### Першы віцэ-прэзідэнт НАК Максім Рыжанкоў: “Эканоміць, але не на якасці”

*— Еўрапейскія гульні — вельмі сур’ёзны выклік для нашай краіны, і таму нас усіх чакае вельмі вялікая праца. Але мы не баімся яе. Ужо падчас Генасамблеі ЕАК засядала спецыяльная рабочая група з прадстаўнікоў Еўрапейскіх алімпійскіх камітэтаў, намі створаны падраздзяленні, якія будуць адказваць за розныя ўчасткі падрыхтоўкі, пачынаецца збор інфармацыі пра тое, якая канкрэтна дапамога нам спатрэбіцца ад Еўрапейскіх алімпійскіх камітэтаў… У бліжэйшы час трэба будзе ўзгадніць спіс відаў спорту, якія будуць прадстаўлены на Гульнях у Беларусі…*

***— Ужо ёсць уяўленне, што гэта будуць за віды?***

*— Пакуль магу сказаць, што фарміраваць спіс мы будзем зыходзячы з той інфраструктуры, якая ўжо пабудавана ў краіне. Гэта дазволіць сур’ёзна мінімізаваць расходы на правядзенне Гульняў. І, верагодней за ўсё, некалькі відаў спорту мы возьмем з тых, якія не ўваходзяць у алімпійскую праграму, але з’яўляюцца традыцыйна паспяховымі для беларусаў. Напрыклад, акрабатыку ці самба.*

***— Наколькі правядзенне ў Беларусі Генеральнай асамблеі ЕАК дазволіць у будучыні вырашаць спрэчныя каляспартыўныя пытанні?***

*— За некалькі апошніх дзён у Беларусі з’явілася нямала вельмі блізкіх сяброў у галіне спорту. І пры разглядзе “беларускіх” пытанняў яны цяпер будуць не шукаць месца на карце, а ўспамінаць свае ўражанні ад візіту ў Мінск. І нам ужо не давядзецца нікога пераконваць у тым, што Беларусь здольная і годная прымаць спаборніцтвы самага высокага рангу. Тым больш што па выніках мінскай асамблеі дасягнута дамоўленасць аб прасоўванні беларускіх прадстаўнікоў у кіруючыя органы міжнародных федэрацый.*



## У межах разумнага балансу

**Інфляцыя да канца года не перавысіць 12 працэнтаў, курс беларускага рубля стабільны, і ёсць відавочныя вынікі атрымання знешняга фінансавання ад Сусветнага банка, Еўрапейскага банка рэканструкцыі і развіцця і Міжнароднай фінансавай карпарацыі. Гэтыя аптымістычныя заявы прагучалі на XIII Міжнародным форуме па банкаўскіх інфармацыйных тэхналогіях "БанкІТ'2016".**

Старшыня Праўлення Нацыянальнага банка краіны Павел Калаур аптымістычны: "Курс рыначны, нейкіх тэндэнцый, якія б негатыўна ўздзейнічалі на аплатны баланс краіны, няма". У насельніцтва вяртаецца давер да беларускага рубля, пра што гаворыць рост рублёвых укладаў. Як сказаў кіраўнік Нацбанка, у аснове разлікаў прагнозных паказчыкаў на наступны год таксама ляжаць пытанні макраэканамічнай збалансаванасці. Хоць, вядома, "прымаўся да ўвагі фактар магчымага росту рэгулюемых цэн на тарыфы на ЖКП".

Пытанне датацый камунальных паслуг — галоўнае на парадку дня распачатых перагавораў з Міжнародным валютным фондам аб чарговай праграме крэдытавання. "Праграма МВФ з Беларуссю павінна быць асаблівай, павінна ўлічваць спецыфіку развіцця краіны, — пракаменціраваў першыя вынікі Аляксандр Забароўскі, першы намеснік Міністра эканомікі, падкрэсліўшы, што прынцыповыя індыкатары сацыяльна-эканамічнага развіцця павінны быць улічаныя.

## Крыміналісты ведаюць як зберагчы сляды

**Доказы з месцаў злачынстваў цяпер змогуць расказаць значна больш. Спецыялісты Дзяржкамітэта судовых экспертыз Беларусі распрацавалі і прэзентавалі ўнікальныя доследныя ўзоры для захавання рэчыўных доказаў.**

Падрабязней пра гэта расказаў дырэктар прадпрыемства "Белсудэкспертзабеспячэнне" Максім Мішчанка:

— Мы распрацавалі шырокую лінейку найноўшых упаковачных матэрыялаў для захоўвання і перавозкі, да прыкладу, грошай, адзення, тэлефонаў, сістэмных блокаў, зброі і іншых прадметаў, якія захавалі сляды злачынства. Упакоўка, зразумела, пламбуецца. Дарэчы, Беларусь адзіная з краін былога Савецкага Саюза, якая запусціла падобную вытворчасць упаковачных матэрыялаў. Нашай прадукцыяй ужо зацікавіліся расіяне.

Новаўвядзенні стануць выдатнай дапамогай у працы следчых і экспертаў, упэўнены начальнік крыміналістычнага аддзела СК Уладзімір Шышко: "Прадстаўленыя аб'екты, магчыма, пачнём выкарыстоўваць у бліжэйшы час. Рэчыўныя доказы, знойдзеныя на месцах злачынстваў, дапамагаюць выбудоўваць дакладную лінію ў расследаванні справы. Таму вельмі важна захаваць такія доказы, і развіццё дадзенага напрамку мае для нас асаблівае значэнне".



ВІТАЛІЙ ГІЛЬ

## Бар'ераў не павінна быць

**Дарожную карту па паляпшэнні інвестклімату распрацуюць у Беларусі**

У дарожную карту будуць уключаны прапановы, прадстаўленыя ў тым ліку на форуме "Пашыраючы далягляды: інвестыцыі, фінансы, развіццё", які прайшоў у Мінску. "Гэты дакумент можа выкарыстоўвацца Урадам для карэкціроўкі эканамічнай палітыкі па шэрагу напрамкаў", — растлумачыла дырэктар Нацыянальнага агенцтва інвестыцый і прыватызацыі Наталля Нікандрава.

Чакаецца, што ў дарожнай карце будуць прадстаўлены прапановы прыватнага бізнесу, замежных інвестараў па стварэнні дадатковых спрыяльных умоў для прыцягнення і асваення інвестыцый, а таксама па пераадоленні існуючых бар'ераў у інвестыцыйнай дзейнасці.

Форум "Пашыраючы далягляды: інвестыцыі, фінансы, развіццё" праходзіў у Мінску ў канцы верасня. Эксперты абмеркавалі стратэгіі прыцягнення замежных інвестыцый у Беларусь, перспектывы інвестыцыйнага супрацоўніцтва з фінансавымі інстытутамі ЕС, Еўразійскага эканамічнага саюза і Кітая, а таксама магчымасці для прыцягнення да ўдзелу ў рэалізацыі праектаў амерыканскіх інвестараў ды іншыя актуальныя пытанні.



## Знайшлі кароткі шлях

**Пачалася новая гісторыя дружбы двух прыгранічных гарадоў — Гродна і Аўгустова**

Старшыня гарвыканкама Мечыслаў Гой і бургамістр Войцех Валюлік падпісалі пагадненне аб супрацоўніцтве ў трансгранічных праектах. Дарэчы, польскі госць разам з камандай прыбыў у Гродна на байдарках. Бургамістр ацаніў складанасць і прыгажосць маршруту — сам неаднаразовы чэмпіён Польшчы ў спаборніцтвах на байдарках.

"Трансгранічны праект, у якім мы плануем прыняць сумесны ўдзел, прадугледжвае будаўніцтва велапешаходных мастоў праз Нёман у Гродна і раку Нету ў Аўгустове, — раскрыў планы Мечыслаў Гой. — Гэта дасць магчымасць скараціць шлях паміж двума прыгранічнымі гарадамі. Хутка ў Любліне адбудзецца стартавая канферэнцыя "Польшча — Беларусь — Літва". З'явіцца рабочая група. Візіт бургамістра — гэта яшчэ адзін плюс для таго, каб наша задумка была адобрана Еўракамісіяй. Дарэчы, у Аўгустове вельмі моцная спартыўная школа па водных відах спорту. Нешта падобнае мы зможам з часам арганізаваць на нашым Гродзенскім вадасховішчы.

Наведваннезамежнікамібеларускай часткі Аўгустоўскага канала без віз адкрывае вялікія магчымасці для рэалізацыі сумесных праектаў у самых розных сферах — турыстычнай, медыцынскай, спартыўнай, адукацыйнай.

## З пакупнікамі будзе кантакт

**У новай кнігарні ў Гродне гатовыя гаварыць з пакупнікамі на пяці мовах**

У кнігарні ў Гродне гатовыя гаварыць з пакупнікамі на пяці мовах, у тым ліку англійскай, італьянскай, партугальскай.

Кнігарня "Багач" размясцілася ў адным з будынкаў у гістарычным цэнтры Гродна. Новы аб'ект задуманы як магазін, які задаволіць шырокія запыты пакупнікоў розных катэгорый, асабліва — турыстаў. Тут прадстаўлена не толькі кніжная прадукцыя, упор сярод якой зроблены на беларускамоўную. У магазіне ёсць кафейная зона, можна набыць канцылярскія тавары, сувенірную прадукцыю і скарыстацца электроннымі паслугамі. Таксама можна выканаць ксеракопіі, раздрукаваць тэксты, зрабіць тэрміновае фота на дакументы ці 3D-фота, зарадзіць мабільны тэлефон. Усё гэта ператварае магазін у комплекс аказання невялікіх, але часта так патрэбных паслуг. "Пры гэтым прынцыповай пазіцыяй для магазіна ў гістарычным цэнтры горада, дзе заўсёды шмат турыстаў, было ідэальнае веданне прадаўцамі беларускай мовы, а таксама замежных, каб яны маглі дапамагчы замежным пакупнікам", — сказаў дырэктар Гроднааблсаюздруку Павел Скрабко. Паводле яго слоў, гэта першы магазін такога фармату ў Гродне. У перспектыве сетка рознічнага гандлю прадпрыемства будзе развівацца менавіта ў такім выглядзе.






ЮРЫЙ МАЗАЛЕЎСКІ

## Гасцінная патэльня

**Кірмаш-фестываль пад дэвізам "Беларуская восень. Бульба. Плады. Гародніна" быў проста асуджаны на поспех. Тым больш што за яго правядзенне ўзяўся Навукова-практычны цэнтр па бульбаводстве і плодаагародніцтве Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.**

Купіць бульбу дзясятка гатункаў, насенне для пасадкі, яблыкі, буракі, цыбулю і саджанцы прыехалі тысячы людзей. І ўсё ж у цэнтры ўвагі была... вялізная чыгунная патэльня дыяметрам 3 метры і вагой 2,5 тоны, на якой адначасова смажылася 380 кілаграмаў найсмачнейшай бульбы папулярнага гатунку "Скарб" беларускай селекцыі. Добра ішла бульбачка пад выдатнае віно з агрэсту і брусніц, свежы яблычны сок!

Наведвальнікі выставы маглі азнаёміцца з інфармацыяй пра той ці іншы гатунак, а таксама з машынамі і механізмамі для пасадкі, копкі, падсушкі, фасоўкі клубняў.

Многае з усяго гэтага разлічана і на расійскі рынак, створана ў адпаведнасці з саюзнай навукова-тэхнічнай праграмай па інавацыйным развіцці вытворчасці бульбы, якая завяршаецца сёлета.



ЮРЫЙ МАЗАЛЕЎСКІ

# Час збіраць камяні

**Візіт Прэзідэнта Беларусі ў Кітайскую Народную Рэспубліку многіх прымусіў успомніць пра асаблівасці гандлёва-эканамічнага ды інвестыцыйнага супрацоўніцтва з гэтай краінай. Напэўна, самы раскручаны праект у гэтай сферы — Кітайска-беларускі індустрыяльны парк “Вялікі камень”. Пра тое, як ідуць справы на аб’екце, мы расказваем у развіцці. Бо гэта ўжо не першы матэрыял з будаўнічай пляцоўкі парка.**

Гаворачы шчыра, колькасць рэзідэнтаў у парку за апошні час нават скарацілася. Кітайскай соладавай кампаніі “Цзюй Сінь Солад” нядаўна адмовілі ва ўзвядзенні прадпрыемства на адведзеным раней месцы і прапанавалі пачаць будаўніцтва на іншым участку.

— Проста вытворчасці соладу заўсёды спадарожнічае вялікая колькасць птушак. Якім бы сучасным і тэхнічна развітым прадпрыемства ні было, без рэзкага павелічэння папуляцыі птушак у акрузе справа не абыдзецца. А ў блізкасці ад узлётна-пасадачнай паласы Нацыянальнага аэрапорта Мінск-2 гэта проста небяспечна. Цяпер інвестару якраз шукаюць новы ўчастак, які адпавядаў бы ўсім яго патрабаванням. Не выключана, што ён акажацца за межамі першай чаргі будаўніцтва “Вялікага каменя”, — расказвае галоўны інжынер кампаніі па развіцці індустрыяльнага парка Аляксей Семенянкоў.

Сам па сабе “Вялікі камень” пачаў набываць рысы будучага горада: ужо аформіліся вуліцы, і, калі спрабуеш

зверыць ландшафт з картай перспектыўнай забудовы, гэта атрымліваецца без вялікіх намаганняў.

На ўездзе прама ад вагончыкаў, дзе часова размяшчаецца кампанія-забудоўшчык, пачынаецца праспект, які называецца Мінскім. Далей праз паўкіламетра ён перасякаецца з Пекінскім праспектам. Прарысаваны дарогамі абрысы будучых вуліц з рабочымі назвамі — Гарызантальная, Вертыкальная і Праектуемая. Відаць, пазней яны набудуць больш уласцівае гарадскім вуліцам гучанне.

Дарогі, дарэчы, вельмі шырокія і з нанесенай разметкай, па абочынах разбіты газоны і пабудаваны аўтобусныя прыпынкі. Праўда на таблічцы, дзе павінны быць напісаны нумары маршрутаў, час прыбыцця транспарту і інтэрвалы руху — пуста. Грамадскі транспарт па парку пакуль не ходзіць.

Аднак галоўныя перамены — гэта зусім не дарогі, ліхтары і газоны. Вялікая частка трансфармацый схавана пад зямлёй — гэта камунікацыі. Менавіта неразуменне, хто ж павінен займацца будаўніцтвам інфраструктуры "Вялікага каменя", доўгі час тармазіла праект. Але цяпер ужо пабудавана падстанцыя на 110 кВт, якая будзе забяспечваць электраэнергіяй будучы вялікі горад; цалкам скончаны, але пакуль не здадзены ў эксплуатацыю водазабор з шасцю артэзіянскімі свідравінамі; набліжаецца час здачы ачышчальнага калектара. Апошні праект — гэта тое, чым можна па-сапраўднаму ганарыцца. Ачыстка будзе ажыццяўляцца па тэхналогіях, якіх няма больш нідзе ў Беларусі. Гаворацць, што вада пасля ачысткі будзе адпавядаць усім нормам для рыбагаспадарчага водакарыстання. Прасцей кажучы, па хімічным складзе будзе нават пераўзыходзіць тую ваду, якая цячэ ў кранах мінчан. У свой час жыхары Смалявіч, Сокала і навакольных дачных кааператываў былі не на жарт устрывожаныя будучым суседствам з кітайскім паркам. Іх асцярогі дарэмныя — тэхнічна калектар відавочна лепшы, чым нават мінскія, і будуюць яго з вельмі вялікім запасам. У цяперашні час разглядаецца магчымасць далучэння да яго смалявіцкага калектара, а таксама Нацыянальнага аэрапорта Мінск-2.

Мы з першым намеснікам генеральнага дырэктара СЗАТ "Кампанія па развіцці індустрыяльнага парка" Кірылам Карацеевым стаім на даху невысокі — усяго восем паверхаў, але зверху адкрываецца выдатны від на вялікую будоўлю.

— Нехта ацэньвае эфектыўнасць "Вялікага каменя" колькасцю ўдзельнікаў, мы ж лічым гектарамі рэалізаванай зямлі. На сённяшні момант ужо 92 га з 350-ці першай чаргі аддалі ў арэнду — гэта значыць амаль трэць. Для нас гэта самы галоўны крытэрый, — гаворыць Карацееў.

Па другі бок Пекінскага праспекта размяшчаюцца плошчы, якія забудоўвае кампанія China Merchants Group. Кітайскі дзяржаўны шматпрофільны кангламерат разгарнуў дзейнасць, маштабы якой, напэўна, цудоўна ілюструюць амбіцыі Паднябеснай на сусветнай арэне. Гандлёва-выставачны цэнтр, дзелавы і гандлёвы цэнтр ўзводзімага адміністрацыйнага цэнтра. Будынак

***На ўездзе ў парк на вялікай расцяжцы на дзвюх мовах напісана выслоўе кітайскага рэфарматара Дэна Сяапіна: "Час — грошы, аператыўнасць — жыццё". Здаецца, што рэзідэнты парка вырашылі зрабіць яго сваім дэвізам***




ЮРЫЙ МАЗАЛЕЎСКІ

з гасцініцай, а ў цэнтры размешчаны каласальныя складскія памяшканні з вялікай адкрытай пляцоўкай для кантэйнераў. Кітайскі бізнес плануе ў поўнай меры скарыстацца ўсімі бонусамі, якія абяцае фармат ЕАЭС. Нядаўна было аб'яўлена, што ў мэтах удасканалення ўмоў вядзення бізнесу ў свабодных эканамічных зонах наш парк будзе надзелены ўласцівасцямі партовай зоны. Гэта дасць магчымасць хутчэй апрацоўваць грузы, праходзіць мытныя працэдуры, атрымліваць больш паслуг рэзідэнтам. Іншымі словамі, грузы, якія прыбылі ў аэрапорт Мінск-2, пры ўмове іх далейшага перамяшчэння за межы саюза не будуць абкладацца мытнымі пошлінамі.

На самай справе 8 кампаній — рэзідэнтаў парку — гэта толькі вяршыня айсберга. Адміністрацыя "Вялікага каменя" мае пагадненні яшчэ прыкладна з 50 кампаніямі, якія не супраць далучыцца да ліку ўдзельнікаў асаблівай эканамічнай зоны. І некаторыя з гэтых пагадненняў здабудуць больш канкрэтную форму ўжо ў бліжэйшы час — інвестары падбіраюць участкі, рыхтуюць тэхнічную дакументацыю, каб прыступіць да будаўніцтва.

— Стаць рэзідэнтам парка проста. Трэба толькі падпісаць пагадненне з адміністрацыяй парка — вось і ўсё. Але менавіта з гэтага моманту пачынае адлічваць лічыльнік. Па законе менавіта з дня рэгістрацыі ў парку кампаніі прадастаўляецца вызваленне ад падатку на прыбытак на 10 гадоў, а наступныя 10 гадоў стаўка паменшана на 50 працэнтаў. Таму некаторыя прадпрыемствы не спяшаюцца падпісваць паперы, а хочуць зрабіць гэта бліжэй да даты пуску вытворчасці, — гаворыць Карацееў.

Дарэчы, падпісаць пагадненне ўжо пасля запуску прадпрыемства — тэхнічна таксама магчыма. Проста інвестар будзе пазбаўлены на этапе будаўніцтва пэўных ільгот, але тут кожны лічыць свой бізнес — альбо ў яго пры будаўніцтве вялікія выдаткі, альбо пры абароце.

"Вялікі камень" не раз крытыкавалі за няспрытнасць інвестараў. Калі б агучаныя некалі Урадам планы былі выкананыя ў тэрмін, парк у цяперашні час быў бы ўжо ў стане 50-працэнтнай гатоўнасці. А так пакуль толькі заканчваецца будаўніцтва інфраструктуры і сям-там пачата актыўнае ўзвядзенне сцен будучых прадпрыемстваў. У наступным годзе пачнецца і актыўная жылая забудова. Дарэчы, падчас візіту Прэзідэнта ў Кітай было падпісана адно важнае пагадненне. Мемарандум прадугледжвае штогадовае вылучэнне тэхніка-эканамічнай дапамогі на праекты парка. Гэта плюс да тых дамоўленасцяў, якія існавалі раней.

— Мемарандум — гэта сістэмны дакумент. Плануецца, што ў першым квартале кожнага года будуць вызначацца напрамкі і канкрэтныя праекты для фінансавання, узгадняцца бакамі. Вызначаны прыярытэты — сацыяльная і жыллёвая інфраструктуры. Пакуль плануецца ўзвесці дзіцячы сад і паліклініку, — адзначае Кірыл Карацееў.

Кітайскія прадпрымальнікі сапраўды вельмі доўга запрагалі. Але цяпер пачалі будаваць вельмі нават актыўна. На ўездзе ў парк на вялікай расцяжцы на дзвюх мовах напісана выслоўе кітайскага рэфарматара Дэна Сяапіна: "Час — грошы, аператыўнасць — жыццё". Здаецца, што рэзідэнты парка вырашылі зрабіць яго сваім дэвізам. Акрамя China Merchants Group, на пачатковым этапе будаўніцтва ўжо знаходзіцца карпарацыя "Чынду Сінджу Шаўковы шлях развіцця", якая ўзводзіць завод па вытворчасці суперкандэнсатараў, пачала актыўна будавацца карпарацыя Zoomlion. Адміністрацыя парка цяпер узводзіць вытворчыя і адміністрацыйныя комплексы, у тым ліку і пад патрэбы кампаній Huawei, ZTE і Yoto. Так што пытанне, шмат гэта ці мала, восем рэзідэнтаў, адкрытым заставацца будзе нядоўга.

Аляксандр **Бянькоўскі**


ЮРЫЙ МАЗАЛЕЎСКІ

Будаўніцтва жылля ў "Вялікім камені" пачнецца ўжо ў 2017 годзе. Так планаваная забудова выглядае на макеце

# Эксперты ўбачылі станоўчыя практыкі

**У Беларусі ўпершыню пабывала місія IRRS. Так называюць экспертаў МАГАТЭ, якія праводзяць комплексную ацэнку рэгулюючай інфраструктуры ядзернай і радыяцыйнай бяспекі. Іх вердыкт: патрэбная інфраструктура ў краіне створана. Акрамя таго, Беларусь назвалі адной з самых передавых краін сярод “ядзерных пачаткоўцаў”.**

— Больш за 20 экспертаў на чале з кіраўніком місіі гендырэктарам Фінскага агенцтва па ядзернай бяспецы (STUK) Петэры Тыіпана ўсебакова вывучылі розныя аспекты рэгулюючай дзейнасці, — расказала намеснік начальніка Дзяржатамнагляду Зоя Трафімчык. — Эксперты місіі разгледзелі папярэдне падрыхтаваныя нашай краінай матэрыялы самаацэнкі, праінспектавалі пляцоўку будаўніцтва АЭС, Аб’яднаны інстытут энергетычных і ядзерных даследаванняў “Сосны”, Рэспубліканскую клінічную бальніцу медыцынскай рэабілітацыі, прадпрыемствы “Ізатопныя тэхналогіі” і “Экарэс”.

Падчас такіх інспекцый эксперты займаюцца “ўстанаўленнем станоўчых практык”. Гэта значыць выяўляюць карысны і паспяховы досвед, які не грэх рэкамендаваць і іншым краінам. Дык вось, у Беларусі адзначаны дзве такія практыкі. Па-першае, моцныя і эфектыўныя механізмы каардынацыі работы. А па-другое, арганізацыйнае развіццё Дэпартамента па ядзернай і радыяцыйнай бяспецы МНС, яго інавацыйныя механізмы. Напрыклад, экспертаў уразіла прынятае ў нас дэлегаванне маладым спецыялістам такой важнай і адказнай задачы, як перадача ведаў тым, хто паступае на работу. У выніку МАГАТЭ назвалі Беларусь адной з самых перадавых краін сярод “ядзерных пачаткоўцаў”.




**МАГАТЭ: Беларусь — адна з самых перадавых краін сярод “ядзерных пачаткоўцаў”**

Што ж да прапаноў і рэкамендацый місіі, яны датычацца аказання пастаяннай падтрымкі і прапрацоўкі пытанняў, якія ўжо адзначаны нашым бокам — у справаздачы Беларусі. Петэры Тыіпана лічыць падобную самакрытыку карыснай:

— Нарматыўныя патрабаванні трэба абнаўляць і дапрацоўваць, каб рэгулюючы орган і эксплуатуючая арганізацыя былі гатовыя да рэагавання ў складаных сітуацыях. Трэба яшчэ шмат працаваць, і да гэтага трэба быць гатовым. Намі вылучана шмат напрамкаў, па якіх у Беларусі ўжо вядзецца работа. Спадзяюся, наша місія будзе садзейнічаць таму, што ўсе дзяржорганы, якія задзейнічаны ў праекце па запуску атамнай станцыі, будуць удзельнічаць ва ўдасканаленні гэтай работы і правядуць яе найбольш паспяховым чынам.

# Спяшацца рабіць дабро

Сёлета Арганізацыі Аб'яднаных Нацый споўніўся 71 год. ААН, нягледзячы на ўсе выклікі сучаснасці, працягвае працаваць у Беларусі і ва ўсім свеце дзякуючы адданасці справе і шырокай падтрымцы.

Летась мы прыклалі нямала намаганняў, каб адсвяткаваць 70-годдзе ААН і прыняцце Мэт устойлівага развіцця (МУР), але, пачынаючы з гэтага года, нам давядзецца прыкласці яшчэ больш намаганняў, каб рэалізаваць намечаныя планы. Наша задача — пераканацца ў тым, каб ніхто не застаўся ўбаку падчас выканання гэтай важнай місіі. Бо ў нас з вамі ёсць унікальная магчымасць выкараніць галечу, дабіцца эканамічных і сацыяльных пераўтварэнняў, а таксама ўмацаваць ахову навакольнага асяроддзя і абарону правоў чалавека, мір і бяспеку на планеце. Настае час для глабальных дзеянняў. І, магчыма, мы апошняе пакаленне, у якога яшчэ ёсць шанц захаваць нашу планету. Давайце ж не ўпусцім гэтай магчымасці.

Новыя Мэты ўстойлівага развіцця ўзаемазвязаныя і ўзаемазалежныя. Таму мы не можам падыходзіць да іх выбарча. Да з'яўлення гэтых 17 Мэт сама ААН засноўвалася на трох прынцыпах: мір і бяспека, развіццё і правы чалавека. Сёння, праз 71 год, цалкам відавочна, што ўстойлівы мір і бяспека немагчымыя без развіцця. Устойлівага развіцця не можа быць без міру і бяспекі. І нельга дасягнуць ні таго, ні другога без паважання чалавечай годнасці і захавання правоў чалавека.



Санака Самарасінха

Гэтае ж правіла распаўсюджваецца і на Мэты ўстойлівага развіцця:

- Без моцнага здароўя і якаснай адукацыі немагчымы эканамічны рост.
- Без адказнага спажывання, экалагічна чыстай энергіі і абароны нашага навакольнага асяроддзя на сушы і на моры немагчыма ўстойлівае развіццё гарадоў.
- Без барацьбы са зменай клімату пры дапамозе інавацый і будаўніцтва ўстойлівай інфраструктуры мы не можам быць упэўненыя, што нават развітыя краіны не сутыкнуцца з голадам і галечай у будучыні.
- Без моцных інстытутаў, міру, справядлівасці і роўнасці нішто з вышэйпералічанага не можа быць рэалізавана.

Калі мы хочам захаваць нашы народы і нашу планету, мы павінны стварыць умовы для таго, каб не толькі кожны з нас прыняў удзел у дасягненні гэтых мэт, але і каб самі мэты дасягаліся з улікам кожнага члена грамадства.

Барацьба з дыскрымінацыяй, стыгматызацыяй і няроўнасцю, стварэнне ўмоў для таго, каб найбольш уразлівыя групы насельніцтва мелі доступ да асноўных паслуг і маглі прымаць удзел у дыялогу і ў барацьбе з існуючымі прадузятасцямі адносна іх — гэта і маральныя, і прагматычныя імператывы для нас усіх.

Іншымі словамі, мы павінны разумець, што розныя сітуацыі закранаюць жыццё людзей па-рознаму. Калі мы будзем аднолькава ставіцца да тых, хто знаходзіцца ў іншым становішчы, мы такім чынам можам толькі паспрыяць захаванню дыскрымінацыі. Нам трэба выпрацаваць падыходы, адпаведныя розным групам насельніцтва. У гэтым і ёсць сутнасць недыскрымінацыі.

У той жа час, ствараючы спрыяльныя ўмовы для людзей з рознымі магчымасцямі з тым, каб яны жылі, цалкам рэалізуючы свой асабісты патэнцыял, мы можам выкарыстаць важную частку нашага калектыўнага рэсурсу, які ў адваротным выпадку быў бы страчаны для чалавецтва. Давайце не будзем забываць пра тое, што бацька Стыва Джобса быў бежанцам з Сірыі. Што адзін з найразумнейшых людзей на планеце — Стывен Хокінг — жыве ў паралізаваным целе. Што Мары Кюры і Жанна д'Арк заплацілі высокую цану толькі за тое, што яны былі жанчынамі. Што ёсць так многа таленавітых людзей, якія па-ранейшаму працуюць з намі і нашымі дзецьмі, жывучы з ВІЧ.

Вось чаму ўсе мы разам — дзяржаўныя органы, грамадскія аб'яднанні, прыватны сектар, нашы міжнародныя партнёры, каманда ААН у Рэспубліцы Беларусь — паклалі пачатак кампаніі "#ІнклюзіўнаяБеларусь". І хоць наша сумесная работа па забеспячэнні ўстойлівага развіцця для ўсіх не пачалася ў нейкі вызначаны дзень і не скончыцца датуль, пакуль не будуць дасягнутыя гэтыя мэты, мы спадзяёмся, што падчас гэтай кампаніі ніхто не застанецца ззаду і ніхто не застанецца абыякавым. Мы спадзяёмся, што наша кампанія:

- дапаможа людзям паглядзець на свет, у якім яны жывуць, крыху па-іншаму;
- дапаможа людзям з другога боку паглядзець адзін на аднаго інакш;
- дапаможа людзям паглядзець па-новаму на саміх сябе.

І, у рэшце рэшт, мы разам зможам выкарыстаць беспрэцэдэнтную жыццяздольнасць чалавечага духу, які з'яўляецца рухаючай сілай інавацый ды інклюзіі.

І, нарэшце, калі мы сапраўды збіраемся выратаваць чалавецтва і нашу планету, сумесная работа з'яўляецца абавязковай умовай. Свет становіцца ўсё меншы, і сёння амаль немагчыма адрозніць глабальныя выклікі ад праблем на нацыянальным і рэгіянальным узроўнях.

- Калі ў Арктыцы растае айсберг, на Мальдывах знікае чарговы востраў.
- Калі кажан заражае хваробай чалавека ў Ліберыі, ліхаманка Эбола з'яўляецца ў Амстэрдаме.
- Калі ваенны канфлікт разбурае дамы людзей і сем'і ў Сірыі, мы становімся сведкамі канфлікту на вуліцах Парыжа.
- Калі адбываецца падзенне фондавага рынку ў Нью-Ёрку, на наступны ж дзень людзі бяднеюць у Кітаі.

Краіны сутыкаюцца і вымушаны займацца праблемамі, што выходзяць за межы тэрытарыяльных граніц намнога часцей, чым калі б там ні было ў гісторыі чалавецтва. Глабалізацыя адбываецца на многіх узроўнях і закранае ўсіх нас. З гэтым прыходзяць пазітыўныя перамены, але гэта ж прыводзіць і да разыходжанняў паміж суверэнітэтам і інтэрнацыяналізмам, а таксама да таго, што людзі пачынаюць баяцца тэмпу і напрамку такіх змен.

Вось у гэтым і заключаецца выклік сучаснага свету, з якім сутыкаецца Арганізацыя Аб'яднаных Нацый і яе краіны-члены.

Якім чынам мы можамператварыць міжнароднае супрацоўніцтва і ўзаемазалежнасць у пазітыўныя прыклады і рэальнасць? Як зрабіць так, каб знешні свет стаў крыніцай перспектыў і патэнцыялу, а не крыніцай небяспекі або праблем? Як нам дасягнуць ідэальнай мэты ў гэтым узаемазалежным свеце: каб у канчатковым выніку добрыя рашэнні, што прымаюцца на міжнароднай арэне, былі ў нацыянальных інтарэсах дзяржаў? І як нам арганізаваць сваю ўласную работу, каб мы маглі эфектыўна вырашаць праблемы гэтага ўзаемазалежнага свету?

Таму ў завяршэнне свайго ўступнага слова дазвольце мне нагадаць пра наш калектыўны лозунг на працягу мінулага года, але які сёння становіцца яшчэ больш актуальным з улікам таго, што змена клімату, канфлікты, тэрарызм, арганізаваная злачыннасць ды інфекцыйныя захворванні пагражаюць разбурыць саму матэрыю нашага глабальнага грамадства.

З моцнай Арганізацыяй Аб'яднаных Нацый у нас ёсць шанц стаць часткай лепшага свету. Таму што толькі разам мы можам зрушыць горы, мы можам выратаваць планету.

Санака **Самарасінха,**
Пастаянны каардынатар ААН
у Рэспубліцы Беларусь




Канцэрт "#ІнклюзіўнаяБеларусь" у гонар 71-й гадавіны Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Пастаянны каардынатар ААН Санака Самарасінха выступае з вітальнай прамовай на адкрыцці

З 1992 года, амаль з самага моманту ўтварэння незалежнай беларускай дзяржавы, Арганізацыя Аб'яднаных Нацый працуе ў Беларусі. Яе работа ў нашай краіне ахоплівае шырокі спектр пытанняў: змена клімату, абарона навакольнага асяроддзя, энергаэфектыўнасць, міграцыя, эканамічнае развіццё, гандаль людзьмі, дэмакратычнае кіраванне, правы чалавека і многае іншае. Дзякуючы сумесным праектам і прадуктыўнаму супрацоўніцтву ўжо на працягу трэцяга дзесяцігоддзя можна гаварыць пра значныя поспехі, дасягнутыя ў краіне.






Экспрэс-тэставанне на ВІЧ на выставе ў гонар дня ААН і запуску кампаніі "#ІнклюзіўнаяБеларусь" у Палацы Рэспублікі

На дадзены момант у Беларусі дзейнічае 8 агенцтваў краінавай каманды ААН. У іх ліку Праграмы Развіцця ААН (ПРААН), Дзіцячы Фонд ААН (ЮНІСЕФ), Упраўленне Вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў (УВКБ ААН), Фонд ААН у галіне народанасельніцтва (ЮНФПА), Сусветная арганізацыя аховы здароўя (САЗ), Аб'яднаная праграма ААН па ВІЧ/СНІДу (ЮНЭЙДС), Міжнародная арганізацыя па міграцыі (МАМ) і Дэпартамент грамадскай інфармацыі ААН (ДГІ ААН). Усе яны, а таксама агенцтвы, якія не маюць свайго прадстаўніцтва ў краіне, але таксама працуюць для Беларусі, — частка Рамачнай праграмы ААН (ЮНДАФ) па аказанні дапамогі Беларусі ў мэтах развіцця на 2016-2020 гады. Дадзеная Рамачная праграма з'яўляецца другім па ліку дакументам, які вызначае сумесную стратэгію дзейнасці арганізацый сістэмы ААН у Рэспубліцы Беларусь. Гэты дакумент быў падрыхтаваны краінавай камандай ААН сумесна з Урадам, арганізацыямі грамадзянскага грамадства, прадстаўнікамі прыватнага сектара, уразлівых груп насельніцтва, нацыянальнымі і міжнароднымі партнёрамі з мэтай заахвочвання і абароны праvоў чалавека ў Рэспубліцы Беларусь і павышэння якасці жыцця яе жыхароў і грамадзян.



Агульны напрамак дзейнасці і супрацоўніцтва ў інтарэсах развіцця паміж арганізацыямі сістэмы ААН і Урадам на бліжэйшыя пяць гадоў вызначаецца наступнымі прыярытэтнымі напрамкамі:

- Інклюзіўнае, апеpатыўнае і падсправаздачнае дзяржаўнае кіраванне.
- Устойлівае эканамічнае развіццё.
- Захаванне спрыяльнага навакольнага асяроддзя і ўстойлівае выкарыстанне прыроднага патэнцыялу, заснаванае на "зялёных" прынцыпах эканомікі.
- Устойлівае развіццё чалавечага капіталу: ахова здароўя, адукацыя, сацыяльная ўключанасць і абарона, комплекснае постчарнобыльскае развіццё.

Рамачная праграма пабудавана на аснове прынятых у верасні мінулага года Мэт устойлівага развіцця, і ўсе арганізацыі краінавай каманды ААН працуюць для іх рэалізацыі. Каб падрабязней пазнаёміцца з дзейнасцю ААН, варта расказаць пра дзейнасць асобных яе агенцтваў і арганізацый.

Праграма развіцця ААН (ПРААН) дапамагае краінам, якія сталі на шлях развіцця, справе мабілізацыі і эфектыўнага выкарыстання дапамогі. У кантэксце ўсёй сваёй дзейнасці яна

аказвае садзейнічанне ў галіне абароны правоў чалавека і пашырэння магчымасцяў жанчын. Праграма развіцця ААН, якая працуе ў Беларусі з 1992 года, факусіруе сваю дзейнасць на дапамозе краіне ў пошуку вырашэнняў праблем у наступных сферах: дэмакратычнае кіраванне; паніжэнне беднасці; пераадоленне і прадухіленне крызісаў; энергетыка і навакольнае асяроддзе; ВІЧ/СНІД; пашырэнне сацыяльнага ўплыву жанчын; трансгранічнае супрацоўніцтва.

ПРААН у Беларусі працуе па наступных тэматычных напрамках:

- эканамічнае развіццё і сацыяльная абарона;
- энергазберажэнне і ахова навакольнага асяроддзя;
- прафілактыка распаўсюджвання ВІЧ/СНІД і барацьба з сухотамі;
- эфектыўнае і адказнае дзяржаўнае кіраванне, а таксама бяспека чалавека.

У сваёй рабоце ПРААН выкарыстоўвае рэсурсы беларускага грамадства, перш за ўсё патэнцыял урадавых устаноў на нацыянальным і дзяржаўным узроўнях, арганізацый грамадзянскага грамадства і прыватнанага сектара. ПРААН таксама імкнецца прыцягнуць большы аб'ём замежнай дапамогі ў мэтах садзейнічання Беларусі ў вырашэнні названых праблем.

Насельніцтва Беларусі — 9,5 мільёна чалавек, з якіх амаль што 2 мільёны — дзеці. Агульная мэта Дзіцячага Фонду ААН (ЮНІСЕФ) — абараняць іх правы. Больш за ўсё намаганняў Арганізацыя накіроўвае на самых слабаабароненых — дзяцей ва ўзросце да 8 гадоў, дзяцей-інвалідаў, тых, хто застаўся без бацькоўскага клопату, падлеткаў, якія знаходзяцца ў канфлікце з законам, а таксама на дзяцей і жанчын, якія перажылі насілле і/ці сталі яго сведкамі.

У 1997 годзе ў Мінску было адкрыта Прадстаўніцтва ЮНІСЕФ. У снежні 2007 года ў Нью-Ёрку падпісана Асноўнае пагадненне аб супрацоўніцтве паміж Рэспублікай Беларусь і ЮНІСЕФ. Беларусь неаднаразова з'яўлялася членам кіруючага органа ЮНІСЕФ — Выканаўчага савета.

Супрацоўніцтва Рэспублікі Беларусь з ЮНІСЕФ ажыццяўляецца на даўгачаснай праграмнай аснове. У цяперашні час рэалізуецца краінавая праграма на 2016-2020 гады. У яе аснове — нацыянальныя прыярытэты Рэспублікі Беларусь у галіне сацыяльнага развіцця, аховы здароўя і адукацыі.

Да ліку прыярытэтных напрамкаў дзейнасці адносяцца:

- бяспечнае і падтрымліваючае асяроддзе для дзіцяці;
- рэалізацыя правоў дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця і інваліднасцю;
- спрыяльнае асяроддзе для паніжэння ўразлівасці падлеткаў і іх паўнацэннага ўдзелу ў прыняцці рашэнняў;
- маніторынг, вывучэнне становішча дзяцей і ўмацаванне партнёрства ў мэтах рэалізацыі правоў дзяцей.

ЮНІСЕФ імкнецца да забеспячэння сацыяльнай роўнасці ўсіх дзяцей — незалежна ад таго, дзе яны жывуць, хто іх бацькі. Зразумела, што дасягнуць такой глабальнай мэты магчыма толькі ў аддаленай перспектыве і разам з партнёрамі, якія падзяляюць місію ЮНІСЕФ. І ў гэтым напрамку трэба пастаянна і планамерна працаваць.

Кожны дзень вайны на нашай планеце вымушае тысячы людзей пакінуць свае дамы. Дапамагаць перасяленцам пабудаваць жыццё ў бяспецы — місія УВКБ ААН, Агенцтва ААН па справах бежанцаў.

У Беларусі УВКБ ААН функцыянуе ўжо больш за 20 гадоў — за гэты час краіна стала новым домам для прадстаўнікоў больш як 60 нацыянальнасцяў, большасць з іх — грамадзяне Украіны, Афганістана, Грузіі і Сірыі.

У цэлым колькасць людзей, якія знаходзяцца ў кампетэнцыі УВКБ ААН у Беларусі — а гэта асобы, якія звярнуліся па абарону, асобы са статусам бежанца або дадатковай абаронай, а таксама асобы без грамадзянства, — больш за 7720 чалавек.

Працуючы ў цесным супрацоўніцтве з Урадам, грамадзянскім і прыватным сектарамі, Агенцтва ААН па справах бежанцаў займаецца прадастаўленнем юрыдычнай, фінансавай дапамогі, а таксама дапамогі з атрыманнем адукацыі, медыцынскага абслугоўвання, працаўладкавання і агульнай адаптацыі вымушаных перасяленцаў.

Офіс Міжнароднай арганізацыі па міграцыі (МАМ) быў адкрыты ў 1996 годзе. Сёлета МАМ святкуе сваё 20-годдзе ў Рэспубліцы Беларусь, а таксама афіцыйнае далучэнне да сям'і ААН на глабальным узроўні. На працягу сваёй дзейнасці ў Беларусі, МАМ рэалізавала шэраг праектаў у цесным супрацоўніцтве з Міністэрствам унутраных спраў Рэспублікі Беларусь,



Падчас пасадкі дрэва, прысвечанага 71-й гадавіне ААН і кампаніі "#ІнклюзіўнаяБеларусь" у Лошыцкай сядзібе

дзяржаўным пагранічным камітэтам Рэспублікі Беларусь, дзяржаўным мытным камітэтам Рэспублікі Беларусь і шэрагам грамадскіх аб'яднанняў па барацьбе з гандлем людзьмі, інтэграваным пагранічным кантролі, а таксама па прадастаўленні прамой дапамогі мігрантам, уключаючы аказанне падтрымкі ў сферы добраахвотнага вяртання на радзіму.

Сёлета МАМ таксама запусціла кампанію "Мам Ікс (X)" з мэтай пашырэння бяспечнай міграцыі і далучэння грамадскасці да барацьбы з эксплуатацыяй і гандлем людзьмі. Міграцыя з'яўляецца адным з ключавых аспектаў Мэт устойлівага развіцця, якіх краіны свету будуць дасягаць да 2030 года.

Сусветная арганізацыя аховы здароўя (САЗ) з'яўляецца накіроўваючым і каардынуючым агенцтвам у галіне аховы здароўя ў рамках сістэмы Аб'яднаных Нацый. Яна забяспечвае вядучую ролю пры вырашэнні праблем глабальнай аховы здароўя, складанні парадку дня для навуковых даследаванняў у галіне аховы здароўя, устанаўленні нормаў і стандартаў, распрацоўку палітыкі на аснове фактычных дадзеных, забеспячэнні тэхнічнай падтрымкі краінам, а таксама кантролю за сітуацыяй у галіне аховы здароўя і ацэнкі дынамікі яе змены.

Краінавае бюро САЗ у Рэспубліцы Беларусь было адкрыта ў Мінску 1 красавіка 1994 года для аказання падтрымкі краіне ў галіне ўдасканалення сістэмы аховы здароўя і асноўных напрамкаў грамадскай аховы здароўя. Роля САЗ — адказваць на запыты аб кансультатыўнай і тэхнічнай дапамозе для падтрымкі ў сферы прыняцця рашэнняў для стымулявання ўстойлівага развіцця аховы здароўя і ўмацавання здароўя ў цэлым.

Пры садзейнічанні экпертаў САЗ была распрацавана канцэпцыя і праведзены свабодны ад курэння Чэмпіянат свету па хакеі з шайбай.

У рамках праграмы па барацьбе з неінфекцыйнымі захворваннямі праведзены дзве ацэначныя місіі — місія Міжустаноўскай мэтавай групы Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па прафілактыцы неінфекцыйных захворванняў і барацьбе з імі (ліпень 2014 года) і місія САЗ па ацэнцы сістэмы аховы здароўя краіны для дасягнення лепшых вынікаў у галіне неінфекцыйных захворванняў.



Выстава, прысвечаная Мэтам устойлівага развіцця ў Палацы Рэспублікі ў Дзень ААН

У верасні 2015 года праведзена місія па сумеснай ацэнцы патрэбаў для падтрымання працэсу рэалізацыі Рамачнай канвенцыі САЗ па барацьбе супраць тытуню (РКБТ) у Беларусі. Сумесна з экспертамі САЗ у 2013 годзе падрыхтаваны Агляд сістэмы аховы здароўя Беларусі.

З 2016 года Еўрапейскае рэгіянальнае бюро САЗ удзельнічае ў рэалізацыі праекта "Прафілактыка неінфекцыйных захворванняў, папулярызацыя здаровага ладу жыцця і падтрымка мадэрнізацыі сістэмы аховы здароўя ў Рэспубліцы Беларусь" ("БЕЛМЕД") фінансуемы Еўрапейскім саюзам сумесна з ПРААН, ЮНІСЕФ і ЮНФПА ў супрацоўніцтве з Міністэрствам аховы здароўя. Праект накіраваны на павышэнне эфектыўнасці дзяржаўных праграм і дзеянняў урада і мясцовых органаў улады ў галіне паніжэння цяжару неінфекцыйных захворванняў, умацавання здароўя насельніцтва і паляпшэння якасці медыцынскіх паслуг, а таксама на павышэнне актыўнасці насельніцтва ў пашырэнні мясцовых ініцыятыў па паляпшэнні здароўя.

Фонд ААН у галіне народанасельніцтва (ЮНФПА) пачаў сваю дзейнасць у Беларусі ў 1994 годзе. Кожная ініцыятыва Фонду адпавядае глабальнай мэце — забяспечыць правы кожнай жанчыны, мужчыны і дзіцяці на здаровае жыццё і роўныя магчымасці для яго захавання. ЮНФПА ажыццяўляе сваю дзейнасць у рамках краінавай праграмы, якая засноўваецца на нацыянальных прыярытэтах і ў рамках мандата арганізацыі. ЮНФПА цесна супрацоўнічае з Урадам Рэспублікі Беларусь, агенцтвамі сістэмы ААН, грамадскімі арганізацыямі, міжнароднымі і нацыянальнымі арганізацыямі і экспертамі.

Місія ЮНФПА — стварыць свет, у якім кожная цяжарнасць жаданая, кожныя роды бяспечныя, а патэнцыял усіх маладых людзей рэалізаваны

У 2016 годзе пачалася рэалізацыя разлічанага на 24 месяцы праекта па ўмацаванні нацыянальнага патэнцыялу ў сферы процідзеяння гендарнаму насіллю (з акцэнтам на насілле ў сям'і) у Рэспубліцы Беларусь. Праект рэалізуецца пры падтрымцы ЮНФПА і грамадскіх арганізацый: МГА "Гендарныя перспектывы", ГА "Беларуская асацыяцыя маладых хрысціянскіх жанчын" у партнёрстве з Вярхоўным Судом Рэспублікі Беларусь, Генеральнай пракуратурай Рэспублікі Беларусь, Міністэрствам аховы здароўя Рэспублікі Беларусь, Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь, Міністэрствам замежных спраў Рэспублікі Беларусь, Нацыянальным цэнтрам заканадаўчых і прававых даследаванняў Рэспублікі Беларусь, Мінскім гарадскім выканаўчым камітэтам, Гродзенскім гарадскім выканаўчым камітэтам, Кобрынскім раённым выканаўчым камітэтам.

Задачы праекта заключаюцца ва ўдасканаленні заканадаўства ў галіне процідзеяння насіллю ў сям'і ў адпа-



веднасці з міжнароднымі абавязальніцтвамі Рэспублікі Беларусь, міжнароднымі стандартамі; удасканаленне практычных механізмаў рэагавання на насілле ў сям'і; фарміраванне нецярпімых адносінаў грамадства да гендарнага насілля (з акцэнтам на насілле ў сям'і).

Працягваецца рэалізацыя праекта міжнароднай тэхнічнай дапамогі "Падтрымка рэалізацыі Нацыянальнай праграмы дэмаграфічнай бяспекі Рэспублікі Беларусь". Гэты праект ставіць перад сабою задачу ўдасканалення сістэмы маніторынгу і ацэнкі эфектыўнасці дэмаграфічнай палітыкі, а таксама паляпшэння сістэмы дэмаграфічнай адукацыі ў краіне. Праект рэалізуецца пры фінансавай і тэхнічнай падтрымцы Расійскай Федэрацыі, Фонду ААН у галіне народанасельніцтва (ЮНФПА) і Дзіцячага фонду ААН (ЮНІСЕФ). Нацыянальнае выконваючае агенцтва — Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь.

ЮНФПА разам з іншымі агенцтвамі ААН таксама займаецца рэалізацыяй мерапрыемстваў праекта ЕС-ААН "Прафілактыка неінфекцыйных захворванняў, папулярызацыя здаровага ладу жыцця і падтрымка мадэрнізацыі сістэмы аховы здароўя ў Рэспубліцы Беларусь" (БЕЛМЕД), фінансуемы Еўрапейскім Саюзам.

ЮНЭЙДС вызначае, распрацоўвае і служыць асноўнай крыніцай міжнароднай практыкі для вызначэння эфектыўнай і этычнай палітыкі, стратэгіі і прафілактыкі лячэння; аказвае садзейнічанне і падтрымку адпаведным навуковым даследаванням у мэтах распрацоўкі новых метадаў барацьбы з ВІЧ/СНІД. Аказвае тэхнічную экспертную і кансультатыўную дапамогу дзяржаўным і недзяржаўным арганізацыям Беларусі. ЮНЭЙДС выступае за забеспячэнне ўсімі неабходнымі рэсурсамі ўсёабдымнай дзейнасці ў галіне барацьбы з ВІЧ/СНІД.

Дэпартамент грамадскай інфармацыі ААН прадастаўляе грамадзянам Беларусі праўдзівую інфармацыю, забяспечвае шырокую інфармаванасць насельніцтва рэспублікі аб прадпрымаемых ААН намаганнях у галіне забеспячэння міру і ўстойлівага развіцця. Дэпартамент перакладае і выдае інфармацыйныя матэрыялы аб дзейнасці Арганізацыі Аб'яднаных Нацый і займаецца іх далейшым распаўсюджваннем, а таксама прадастаўляе паслугі наведвальнікам па атрыманні інфармацыі аб ААН.

Гэтыя агенцтвы і арганізацыі краінавай каманды ААН адыгрываюць ключавую ролю ў дзейнасці Арганізацыі Аб'яднаных Нацый у Беларусі. Іх дзейнасць непасрэдна звязана з рэалізацыяй Рамачнай праграмы ААН на 2016-2020 гады і Мэтамі ўстойлівага развіцця да 2030 года. Паводле слоў Пастаяннага каардынатара ААН у Беларусі, наш свет сапраўды становіцца ўсё меншы, а мы ўсё больш залежым адзін ад аднаго. Таму мы павінны глядзець шырэй на вырашэнне сучасных праблем. Усё ўзаемазвязана. Бо, напрыклад, вырашэнне праблем, абумоўленых зменай клімату і стымуляванне ўстойлівага развіцця — гэта два ўзаемадапаўняльныя напрамкі работы, паколькі ўстойлівае развіццё немагчыма забяспечыць, не ажыццяўляючы мер па змякчэнні наступстваў змены клімату. У сваю чаргу, многія Мэты прадугледжваюць прыняцце мер па ўхіленні асноўных фактараў змены клімату. Так і ўсе астатнія Мэты патрабуюць комплекснага падыходу да іх вырашэння.

Сёлета Арганізацыя Аб'яднаных Нацый у Беларусі мае намер вярнуцца ў рэгіёны, каб расказаць у чарговы раз пра парадак дня у галіне ўстойлівага развіцця і ў прыватнасці пра Мэту, якая падкрэслівае важнасць зніжэння няроўнасці. Кампанія "Інклюзіўная Беларусь: не пакідаючы нікога ўбаку ў дасягненні Мэт устойлівага развіцця" аб'ядноўвае дзейнасць усёй краінавай каманды ААН і аб'ездзе ўсю краіну, каб дасягнуць сваёй мэты — пераканацца, каб у кожным кутку Беларусі пачулі пра яе дзейнасць і пра праблемы ўразлівых груп насельніцтва.

Сама кампанія ставіць перад сабою тры асноўныя задачы:
- расказаць пра існуючую дыскрымінацыю, бар'еры і няроўнасці;
- перамагчы стыгматызацыю і стэрэатыпы ў дачыненні ўразлівых груп насельніцтва;
- прадаставіць платформу для дыялогу.

Падчас кампаніі "#ІнклюзіўнаяБеларусь" кожны зможа больш даведацца пра жыццёвыя гісторыі і праблемы, з якімі сутыкаюцца людзі, якія жывуць з інваліднасцю, пажылыя людзі, дзеці і моладзь, ахвяры хатняга насілля і гандлю людзьмі, жанчыны, мігранты, бежанцы, людзі з рознымі відамі залежнасцяў, жыхары аддаленых населеных пунктаў з нізкім узроўнем даходу, людзі, што жывуць з ВІЧ/СНІД, этнічныя меншасці ды іншыя слабаабароненыя групы.

Кампанія афіцыйна была запушчана ў Дзень Арганізацыі Аб'яднаных Нацый — 24 кастрычніка — і прадоўжыцца да 10 снежня. Расклад для кожнага з абласных гарадоў Беларусі: Гродна (21 лістапада), Брэст (24 лістапада), Гомель (30 лістапада), Магілёў (2 лістапада), Віцебск (6 лістапада), а таксама Мінск (9-10 лістапада). За больш падрабязнай інфармацыяй варта звяртацца на сайт www.inclusivebelarus.by.

Уладзімір **Міхайлаў**

**Дыскусійнае пытанне пра найбольш эфектыўныя шляхі развіцця навукі не з'яўляецца новым. Больш за тое, у розных краінах існуюць розныя варыянты яе ўладкавання. Адзіных клішэ папросту не існуе. Галоўнае ў іншым: любое грамадства разумее, што без развіцця навукі немагчыма дасягнуць поспехаў у эканоміцы. Прычым гаворка ідзе не толькі пра прыкладную навуку, але і фундаментальную. Бо калі была адкрыта электрычнасць, ніхто не ведаў, як гэта можа прымяняцца. І прайшло не адно стагоддзе, перш чым з'явілася лямпачка. Дык што ж трэба навукоўцам для плённай працы? Што мы гатовыя плаціць навуцы і чаго ад яе чакаем?**

# Калі ёсць сапраўдны інтарэс



БЕЛТА

Малады навуковец, стыпендыят Прэзідэнцкага фонду, Наталля Надзёжная з аспірантамі кафедры Андрэем Гнідэнкам і Ягорам Чарновым

З пачатку стагоддзя ў нашай краіне ажыццяўлялася рэформа навуковай сферы. І, як мне ўяўляецца, у асноўным усё зроблена правільна. Арганізацыйная структура навукі стала больш кампактнай, сама навука стала больш арыентаванай на запатрабаванні дзяржавы і грамадства. Былі аб'яднаныя Нацыянальная акадэмія навук і Акадэмія аграрных навук, у структуру НАН уключаны шэраг канцэрнаў. Больш цеснай стала кааперацыя з медыцынскімі і навукова-практычнымі цэнтрамі. І нават Расія, у якой навуковыя традыцыі больш працяглыя, у нечым паўтарае наш шлях.

Тым не менш у грамадстве ў цэлым і навуковай супольнасці ў прыватнасці час ад часу ўзнікае дыскусія: якія даследаванні патрэбныя краіне, чаму аддаць прыярытэт пры фінансаванні? Я думаю, што фундаментальныя даследаванні ў любым выпадку павінны заставацца ў прыярытэце. Менавіта так заведзена ва ўсім свеце. Бо, уласна кажучы, фундаментальныя даследаванні — і ёсць увасабленне навукі. Менавіта яны з'яўляюцца апорным слупом шатра ўсяго даследчага комплексу.

Вынік такой узважанай палітыкі ў дачыненні навуковай сферы — дасягненні нашых навукоўцаў у розных галінах. Ад удзелу ў эксперыментальным адкрыцці базона Хігса да стварэння дзясяткаў высокатэхналагічных навукова-тэхнічных фірм. Толькі з роднага мне Інстытута фізікі НАН выйшлі буйныя кампаніі “ЛОТІС”, “Солар”, “Галаграфічная індустрыя”, “Магія святла”, ЛЭМТ, “Крыптатэх” ды іншыя. А пра адкрыццё базона Хігса і зусім варта сказаць асобна. Праца суладнай каманды з двух дзясяткаў нашых навукоўцаў увайшла ў гісторыю сусветнай навукі. У працэсе работы яны сумесна з расійскімі калегамі рабілі крышталі для датчыкаў, якія стаяць на дэтэктарах Вялікага адроннага калайдара. Мадэлявалі і тэсціравалі падсістэмы асноўных дэтэктараў, рэдкі, але ўдалы. І нашы навукоўцы паказалі сябе больш чым дастойна.

Перакананы, што заўсёды неабходна адштурхоўвацца ад існуючай сітуацыі. Тым больш у такой тонкай сферы, як навуковая дзейнасць. Тут як нідзе лёгка разбурыць дасягнутае, аднавіць жа вельмі цяжка. Возьмем, напрыклад, навуковыя кадры. У свой час іх давялося нам запрашаць з іншых гарадоў СССР. Але тады мы жылі ў адной краіне. Цяпер запрашэнне таксама магчымае, але абыдзецца гэта, безумоўна, даражэй. Таму трэба гадаваць свае. І гэта вельмі важная задача.

Сёння дзяржаўная палітыка ў частцы фінансавання навукі такая. 30 працэнтаў расходаў павінна пакрывацца па праграме навуковых даследаванняў, яшчэ 30 працэнтаў — бюджэтныя дагаворы, напрыклад, з Фондам фундаментальных

***Фундаментальныя даследаванні — і ёсць увасабленне навукі. Менавіта яны з’яўляюцца апорным слупом шатра ўсяго даследчага комплексу***

якія зафіксавалі шукаемую часціцу. Менавіта гэтыя дэтэктары і датчыкі на іх дапамаглі зафіксаваць базон Хігса — адкрыццё, якое абяцае стаць сапраўды эпахальным.

Прыкладныя даследаванні, на мой погляд, павінны фінансавацца за кошт заказчыка. У тым ліку заказчыкам можа выступаць і дзяржава. Ці можна фінансаваць навуку праз гранты? Фундаментальныя даследаванні — несумненна. З прыкладнымі даследаваннямі — складаней, хоць наша супрацоўніцтва ў рамках буйнейшых міжнародных праектаў, такіх як ATLAS, COMET, паказвае, што досвед і вынікі, атрыманыя пры выкананні фундаментальных даследаванняў, могуць быць запатрабаванымі пры стварэнні прыбора ў рамках прыкладнога навукова-тэхнічнага праекта. Менавіта ў нашым Інстытуце фізікі склалася такая сітуацыя пры стварэнні прыбора навукоўцамі-ядзершчыкамі. Мне давялося кіраваць гэтым праектам. Фінансаваў яго менавіта замежны бок. Выпадак даволі даследаванняў. І навукова-тэхнічныя праграмы, у рамках якіх ствараецца новая тэхніка. І астатнія 30 працэнтаў — замежныя дагаворы або прамыя кантакты з нашымі прадпрыемствамі. Менавіта апошняя трэць і носіць звычайна найбольш прыкладны характар. А калі ёсць грошы — ёсць і кадры. Хоць гэта далёка не заўсёды вызначальны момант. З досведу работы Інстытута фізікі НАН магу сказаць: вельмі важны інтарэс чалавека да навукі. Калі мы ўдзельнічаем у буйных міжнародных праектах — такіх, якія былі на Вялікім адронным калайдары, і такіх, якія рэалізуецца сёння з Японіяй (COMET — нацэлены на пошук рэакцый, якія ляжаць за межамі стандартнай мадэлі), — да такіх праектаў маладыя навукоўцы шчыра цягнуцца.

І гэта пацвярджае асноўнае. Грошы ў навуцы вельмі важныя, але яны не галоўнае, калі ёсць сапраўдны навуковы інтарэс.

Юрый **Курачкін,**
доктар фізіка-матэматычных навук,
старшыня Фізічнага таварыства

# Рэформа фармулюе новыя задачы

**Міхаіл Кавалёў,
дэкан эканамічнага факультэта БДУ,
прафесар:**



Рэзкае “сцісканне” сусветных рынкаў прывяло да таго, што многія прадпрыемствы з цяжкасцю збываюць сваю прадукцыю і вымушаны скарачаць штат. Але крызісы надоўга не зацягваюцца. І не толькі буйныя прадпрыемствы фарміруюць сучасны рынак працы. Ёсць яшчэ сфера паслуг, малы бізнес, высокатэхналагічныя вытворчасці. І яны выглядаюць больш прывабнымі для моладзі, чым традыцыйныя прадпрыемствы.

Пенсійная рэформа фармулюе новыя задачы перад усім грамадствам. Трэба вучыць моладзь быць самастойнымі, не баяцца нешта спрабаваць. Каб адразу пасля школы або ВНУ моладзь была здольная адкрыць уласную справу, я рэкамендаваў бы ўвесці ў старэйшых класах выкладанне прадмета “Эканоміка і прадпрымальніцтва”.

У апошнія гады ў адукацыйнай сферы адбыўся перакос, калі спецыялістаў рыхтавалі без уліку рэальных патрэб народнай гаспадаркі. У кожнай ВНУ з’явіліся факультэты, якія рыхтавалі кучу эканамістаў і юрыстаў. У выніку ў нас празмерная колькасць уладальнікаў дыпломаў з вышэйшай, але не запатрабаванай рынкам адукацыяй. Прапанаваць работу па спецыяльнасці ім немагчыма. А пайсці ў рабочыя многім такім выпускнікам проста крыўдна.

Моладзь павінна акуратна падыходзіць да выбару прафесій, думаць пра перспектывы. Ёсць маса занятказ, дзе не хапае людзей. Напрыклад, праграмаванне. Экспарт камп’ютарных паслуг за мяжу рэзка расце.



ВІТАЛІЙ ПІВАВАРЧЫК

# У палёты — без пілотаў

**У Беларусі наладжана серыйная вытворчасць беспілотных авіяцыйных комплексаў. Яны ўжо пастаўляюцца заказчыкам на экспарт.**

Пра беспілотнікі многія чулі, бачылі іх на карцінках і відэароліках, а вось зблізку? Пакуль гэты цуд нам — у навіну. Хоць розныя радыёкіруемыя рэчы, у тым ліку і лятальныя апараты, пранiклі ў наша жыццё. Дарэчы, беларускія школьнікі, студэнты ў гуртках па авіямадэляванні таксама робяць класныя штукі. Перамагаюць, заваёўваюць прызы на розных выставах, конкурсах і радыёкіруемыя машынкі, і робаты. Ёсць у Мінску і “разумны”, пакуль эксперыментальны пыласос, які не толькі сам прыбірае кватэру, але і аналізуе паветра на наяўнасць шкодных газаў і дыму, у выпадку небяспекі аўтаматычна здольны звязацца са службай выратавання, можа прыносіць тапачкі… Свайго шматфункцыянальнага хатняга памочніка цяпер даводзіць да розуму таленавіты мінскі школьнік-вынаходца Аляксандр Дубавіцкі.

І ўсё-такі кіруемы з зямлі палёт — гэта нешта асаблівае. Помніцца, гадоў пяць назад на адным з чарнаморскіх пляжаў мы бачылі: з’явіўся хлопец з чатырохматорным верталёцікам-дронам. Здаецца, цацачны, а пад ім — відэакамера. І такія піруэты ён над морам выпісваў, накіроўваючыся на невялікай адлегласці за воднымі матацыкламі — дух займае. А самы прыемна-дзіўны момант: вяртаецца, завісае над гаспадаром, дае ўзяць сябе ў рукі... Ва ўсіх хлапчукоў, ды і старэйшых мужчын, што пацягнуліся на шум матора “стракаЗы”, вочы гараць. Як ні круці, а да такіх цудаў тэхнікі заўсёды, у любым узросце будзе ў нас павага.

А ёсць цяпер у Беларусі “цацкі” больш салідныя, прычым — уласнай вытворчасці. І таксама здольныя, як гавораць іх стваральнікі, выконваць розныя задачы па камандах аператара з зямлі. Зусім блізка мы ўпершыню ўбачылі такі самалёт-прыгажун, з двума вертыкальнымі стабілізатарамі і размахам крылаў метраў за сем, год назад. Супала: тады і яго мінскіх стваральнікаў, і нас, журналістаў, гасцінна сустракаў Туркменістан. У пачатку снежня ў Ашхабадзе праходзіла сумесная Беларуска-туркменская выстава-кірмаш. Прадстаўлялі свае тавары, паслугі розныя прадпрыемствы, вытворцы, універсітэты. Салідныя экспанаты — трактары, прычэпы, МАЗы, аўтакраны, сельгастэхніка… — размясціліся на пляцоўцы побач з выставачным комплексам “Сергі Кёшгі” (у перакладзе з туркменскага:

выставачны палац). Вядома, беспілотнік "Буравеснік" з нумарам "08" на борце ў такой "тэхкампаніі" быў вельмі дарэчы. Бо можна нават і не гаварыць пра значны навукова-тэхнічны патэнцыял Беларусі — проста паказаць нашу сучасную высокатэхналагічную тэхніку. Для тых, хто ўмее не толькі глядзець, але і бачыць, такія "дэталі" пра многае скажуць.

У Ашхабадзе мы і пазнаёміліся з Юрыем Яцынам, дырэктарам рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства "Навукова-вытворчы цэнтр шматфункцыянальных беспілотных комплексаў" Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, а таксама Рустамам Сіндаравым, адным з вядучых канструктараў прадпрыемства. Юрый Францавіч прама пры беспілотніку і гутарыў з намі.

***— Юрый Францавіч, удакладніце: на базе якога акадэмічнага інстытута ўзнік ваш навукова-вытворчы цэнтр?***

— Базавы для нас — Фізіка-тэхнічны інстытут НАН Беларусі. Як вядома, многія распрацоўкі навукоўцаў, спецыялістаў гэтага інстытута яшчэ ў СССР выкарыстоўваліся пры вытворчасці ў тым ліку і касмічнай тэхнікі. Вялікі досвед назапашаны і ў новы час — пры стварэнні беларускіх спадарожнікаў, сістэм дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі. Зрэшты, мы выкарыстоўваем у працы не толькі досвед, распрацоўкі, прыборы са сцен фізтэха — увесь патэнцыял беларускай навукі, іншых навукова-вытворчых цэнтраў. Так што база для стварэння менавіта беларускіх беспілотнікаў у нас — вельмі салідная. (Цяпер на базе навукова-вытворчага цэнтра Фізіка-тэхнічнага інстытута, дзе распрацоўваліся беспілотныя авіяцыйныя комплексы, створана РУП "Навукова-вытворчы цэнтр шматфункцыянальных беспілотных комплексаў" НАН Беларусі, якое працягвае распрацоўку і серыйны выпуск высокатэхналагічнай прадукцыі. — **Аўт.**)

***— Колькі гадоў займаецеся вы канкрэтна беспілотнай тэматыкай?***

— Параўнальна нядоўга: з 2009 года. Наш навукова-вытворчы цэнтр быў створаны, каб забяспечыць распрацоўку і серыйны выпуск шматфункцыянальных беспілотных лятальных апаратаў розных класаў. Для гэтага прыйшлося сканцэнтраваць у адным месцы кадравы патэнцыял, матэрыяльныя і фінансавыя рэсурсы. Задача ставілася няпростая: выканаць неабходныя навукова-даследчыя, доследна-канструктарскія работы, на іх аснове — арганізаваць серыйную вытворчасць і гарантыйнае абслугоўванне беспілотных авіяцыйных ды іншых робататэхнічных комплексаў. Для чаго яны патрэбныя? З дапамогай новай тэхнікі можна вырашаць разнастайныя актуальныя задачы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі. Прадукцыя наша — высокатэхналагічная, ідзе і на экспарт. А спачатку мы за два гады распрацавалі макетныя ўзоры. Такім


Наземны пункт, з якога ажыццяўляецца кіраванне беспілотнікам

чынам, паказалі нашу кваліфікацыю і даказалі: гэтай тэмай займацца — перспектыўна. І ўжо з 2011-га выконвалася дзяржаўная пяцігадовая Навукова-тэхнічная праграма па распрацоўцы беспілотных авіякомплексаў рознага класа і кампанентаў. Мы распрацавалі беспілотныя авіяцыйныя комплексы, якія забяспечваюць відэаназіранне, маніторынг мясцовасці і аб'ектаў, здольныя выконваць задачы ў радыусе 25, 50, 70 і да 300 кіламетраў — на базе самалётнай схемы. На базе дырыжабля — радыус 50 кіламетраў.

***— Дырыжаблі — гэта таксама сфера вашых інтарэсаў?***

— Так, імі таксама паспяхова займаемся. Але ў Ашхабадзе прадстаўлялі беспілотны авіякомплекс "Буравеснік", які мае радыус да 300 кіламетраў. Распрацавалі яго па тэхнічным заданні Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Беларусі. (У цяперашні час ён праходзіць увесь цыкл кваліфікацыйных дзяржаўных прыёмачных выпрабаванняў. У МНС Рэспублікі Беларусь будзе здольны маніторыць розныя рэгіёны Беларусі. — **Аўт.**) На борце "Буравесніка" стаяць відэасістэма, а таксама ІЧ-сістэма (працуе ў інфрачырвоным дыяпазоне), вымяральнік узроўню радыяцыі. Задачы можна задаваць розныя: маніторынг як пажараў, так і паводак, іншых надзвычайных сітуацый. Комплекс здольны вымяраць узроўні радыяцыі, напрыклад, у Прыпяцкім радыелагічным запаведніку — гэта чарнобыльская зона. Плануецца, што пры дапамозе гэтага комплексу будзе абноўлена карта Беларусі па радыенуклідах.

***— У тым ёсць неабходнасць?***

— Так. Як вядома, радыенукліды выпалі на нашай тэрыторыі пасля аварыі ў красавіку 1986 года ў розных месцах. Прайшло 30 гадоў. З-за пажараў, ветравых патокаў, а таксама натуральных вадацёкаў — ручаі, рэкі, паводкавыя і дажджавыя воды — радыенукліды пераносяцца. Бывае, у адным месцы іх няма — а потым з'яўляюцца. Спадзяёмся, наш комплекс для сістэмы МНС будзе вельмі карысны, у тым ліку і пры складанні карт-схем узроўню радыяцыі на тэрыторыі Беларусі. Раней для такіх работ — а карта выдавалася ў сярэдзіне 90-х — выкарыстоўваўся верталёт з грувасткай і дарагой імпартнай апаратурай, якую нашым спецыялістам давалі ў арэнду. Цяпер ёсць узор комплексу, які такія карты будзе складаць сам. На выхадзе навукова-тэхнічнай праграмы, пра якую я гаварыў, мы распрацавалі беспілотныя авіякомплексы рознага класа, наладзілі іх серыйную вытворчасць. Адпрацаваны мадэлі пастаўкі заказчыкам, тэхнічнага і гарантыйнага абслугоўвання, навучан-

ня аператараў, якія імі кіруюць. Такім чынам, развіваемся ў паўнацэннае авіяцыйнае прадпрыемства, у якім ажыццяўляецца ўвесь навукова-вытворчы цыкл: ад распрацоўкі ўзораў да выпуску прадукцыі, яе пастаўкі, гарантыйнага абслугоўвання.

***— Спецыялістаў, якія абслугоўваюць комплекс, вы таксама рыхтуеце? Для гэтага, відаць, трэба мець базавую вышэйшую тэхнічную адукацыю?***

— Пакупнікі прысылаюць нам на курсы людзей, якія ў іх будуць эксплуатаваць комплексы, і мы займаемся іх дападрыхтоўкай. Звычайна гэта — спецыялісты з вышэйшай адукацыяй, якія добра валодаюць камп'ютарам. Прыкладна за месяц навучаем аператараў усім неабходным навыкам з улікам пажаданняў заказчыкаў. Пастаўляем ужо сваю тэхніку ў Расію, В'етнам, Туркменістан. Вось Рустам Сіндараў таксама кіруе групай па навучанні аператараў. Гэта значыць ён у тым ліку і гэтымі пытаннямі ў нас займаецца.

***— На колькі працэнтаў, хоць бы прыкладна, новыя, арыгінальныя распрацоўкі беларускіх навукоўцаў у вашых праектах выкарыстоўваюцца?***

— Такое пытанне мне часта задаюць. Таму мы падлічылі: у прадаваемай цане беспілотніка 65 працэнтаў — гэта альбо распрацоўкі супрацоўнікаў нашага НВЦ, альбо прадукцыя беларускіх прадпрыемстваў.

***— Можа, напрацоўкі для беларускіх спадарожнікаў неяк былі прыстасаваныя? Бо і там — дыстанцыйнае зандзіраванне Зямлі?***

— Там — іншы падыход цалкам. Гэта іншы прынцып: глядзець на Зямлю з космасу. Камеры, якія ажыццяўляюць здымку мясцовасці, у нас хоць і таксама спецыяльныя, але іншыя. Аднак праграмнае забеспячэнне для апрацоўкі дадзеных, якое распрацавалі спецыялісты аператара спадарожніка, а гэта холдынг "Геаінфармацыйныя сістэмы кіравання", прыйшлося нам дарэчы. Калі мы робім такую ж здымку мясцовасці пры дапамозе беспілотнікаў, то матэрыялы апрацоўваюцца з выкарыстаннем гэтага ПЗ, і атрымліваецца фотаплан альбо артафотаплан. Яны неабходныя для пабудовы карт-схем, тапаграфічнай асновы і гэтак далей. Мы з іншымі спецыялістамі ў кантакце працуем, нашы праграмы сумяшчальныя. І было б неразумна такія напрацоўкі не выкарыстаць! Там — з космасу, у нас — з беспілотнікаў... Але ўсё роўна гэта маніторынг. З космасу калі воблачнасць, хмары — работа немагчымая, нічога нельга зняць. А беспілотнік падняўся пад аблокі — і хутка робіць здымку, якая неабходная.

***— На туркменскім рынку хто праяўляе да вас цікавасць?***

— Спецыялісты розных галін гаспадаркі цікавяцца гэтай тэхнікай. Пагранічнікі таксама: беспілотнік — добры памочнік пры ахове дзяржаўных граніц. Як вядома, ёсць у Туркменістане марскія акваторыі, цяжкадаступныя ўчасткі ў горных, пустынных раёнах: наземнае патруляванне тэрыторый там абцяжарана. З беспілотнікаў усё вельмі добра відаць. Адрознівальная здольнасць — да 10 сантыметраў. Прычым назіранне можна весці і днём, і ўначы. Карысць відавочная: замест таго, напрыклад, каб пагранічнікам лазіць па гарах — узлятаюць беспілотнікі. Пры іх дапамозе маніторыцца сітуацыя. Дарэчы, цяпер, калі ў Сірыі складанае становішча, вядуцца баявыя дзеянні, там беспілотнікаў лётае шмат. Дзе можна не закідваць людзей для вырашэння розных задач — там імкнуцца, каб не рызыкаваць іх жыццямі, пасылаць вось такую тэхніку. Беспілотнікі прымяняюцца ўсюды.

***— Можна сказаць, што вы сёння працуеце на ўзроўні вядучых сусветных вытворцаў? І ці ёсць серыйная вытворчасць беспілотнікаў у Беларусі?***

— Так, у нашым НВЦ арганізавана серыйная вытворчасць. Увесь цыкл забяспечваем самі: ад распрацоўкі да гарантыйнага абслугоўвання. Тэхнічныя характары-

> ***Мы распрацавалі беспілотныя авіяцыйныя комплексы, якія забяспечваюць відэаназіранне, маніторынг мясцовасці і аб'ектаў, здольныя выконваць задачы ў радыусе 25, 50, 70 і да 300 кіламетраў — на базе самалётнай схемы. На базе дырыжабля — радыус 50 кіламетраў***




СЯРГЕЙ ЛАЗЮК

Юрый Яцына — дырэктар Навукова-вытворчага цэнтра шматфункцыянальных беспілотных комплексаў




Беспілотны авіяцыйны комплекс "Буравеснік МБ" на выставе ў Ашхабадзе

стыкі беларускіх беспілотнікаў — на ўзроўні сусветных... Зрэшты, што значыць на ўзроўні сусветных? Гэта ж не тэлевізар, які можа купіць практычна кожны, паглядзець, як ён зроблены. А заказчыкі, якія купляюць беспілотнікі, канкурэнтныя нашым, яны ж нам іх не паказваюць. Аднак вядомыя характарыстыкі мы можам параўноўваць. І бачым: яны ў цэлым блізкія. Мы лічым: працуем на сусветным узроўні. І ўлічваючы, што нашу прадукцыю добра купляюць, гэта значыць, напэўна, аргументы за беларускія беспілотнікі. Відаць, па суадносінах цана-якасць яны выгадныя нашым заказчыкам.

***— Якой вам бачыцца будучыня беспілотнікаў у Беларусі? У якіх сферах іх сёння можна эфектыўна прымяняць?***

— Яны ўжо прымяняюцца і ў ваеннай справе, і для аховы граніцы. Іх выкарыстоўваюць службы МНС, для аховы запаведнікаў, для барацьбы з браканьерствам. Ёсць такі цікавы факт. Не сакрэт: у беларускай глыбінцы ёсць тыя, хто незаконна займаецца самагонаварэннем: вырабам гарэлкі саматужным спосабам. Дык вось, за адзін вылет невялікі наш беспілотнік, бывала, выяўляў да пяці заводзікаў у лесе. У прыватнасці, запускі былі эфектыўныя ў Налібоцкай пушчы. Нават старыя дасведчаныя браканьеры цяпер, гавораць, асцерагаюцца выходзіць з сеткамі лавіць рыбу: бо беспілотнікі лётаюць пастаянна, у тым ліку і ўначы. Зверху ўсё відаць — нікуды не схаваешся. Сам факт іх прысутнасці ў беларускім небе ўплывае на псіхалогію людзей. Кагосьці, магчыма, гэта спыняе ад правапарушэнняў.

***— Гэта як своеасаблівае ўсёвідушчае вока...***

— Накшталт таго... Калі раней толькі вернікі верылі, што за імі назіраюць — то цяпер і атэісты ўсё больш задумваюцца аб тым, што трэба жыць па законе. Прычым калі так званая расплата за грахі ў першым выпадку магла і адкладвацца, то па інфармацыі з беспілотніка меры могуць прымацца хутка, неадкладна.

***— Раскажыце пра беларускія дырыжаблі. Гандолы якога аб'ёму ў Беларусі распрацаваныя? Наколькі яны грузапад'ёмныя? Для чаго выкарыстоўваюцца дырыжаблі?***

— Прынцып разліку грузападымальнасці ў дырыжабляў просты: адзін кубаметр гелію ўздымае кілаграм вагі. Таму ўсё залежыць ад пажаданняў заказчыка. Калі заказчык жадае падняць 20 кг, то мы пралічваем, зыходзячы з гэтага, аб'ём гандолы. Распрацавалі два тыпы дырыжабляў — у рамках дзяржпраграмы, пра якую я гаварыў. Абалонка аднаго дырыжабля — 32 кубы. Яна кампактная: заходзіць у гараж для грузавых аўтамабіляў і там стаіць. А па заказе расійскага заказчыка распрацавалі дырыжабль з аб'ёмам абалонкі 62 кубы. Ён падымаецца, пачынаецца назіранне: на адлегласці да 3-х кіламетраў выяўляецца чалавек. Усё залежыць ад пажаданняў заказчыка. Прынцыпы кіравання, рухаў — вядомыя. Пытанне — у грузападымальнасці: гэта параўнальна з аўтамабілямі.

***— І дырыжаблі ў Беларусі таксама вырабляюцца серыйна?***

— Так, прычым гэта вельмі эфектыўны выраб для аховы тэрыторый запаведнікаў. У вялікіх лясных масівах калі беспілотнік ідзе з хуткасцю 65-70 кіламетраў у гадзіну, то не ўсё добра разгледзіш у летні, напрыклад, час. Няма лістоты — іншая справа: з лістапада па красавік. Для назірання за жывёламі, для іх падліку добры дырыжабль. У іх там базіраванне стацыянарнае — захоўванне ў невялікім элінгу. Бо самае дарагое пры эксплуатацыі дырыжабляў — гэта гелій. Ён губляецца пры перапампоўцы з дырыжабля ў балон і наадварот. А калі ў элінгу дырыжабль стаіць у запаведніку, то яго дастаюць, падвешваюць на 2-5 гадзін або колькі там трэба ў неабходных месцах — і зноў у элінг. Я чуў, у Бярэзінскім запаведніку выпусцілі статак дзікіх зуброў — і згубілі, доўгі час знайсці не маглі. А калі б у іх быў дырыжабль ды ў зубра ашыйнік з чыпам — пралецеў бы дырыжабль, сабраў сігналы, паказаў на карце месца, дзе яны знаходзяцца. Бо Бярэзінскі запаведнік — складанае месца

## Дарэчы




**■ У праектах па стварэнні беспілотных авіяцыйных комплексаў, іх складовых частак сёння заняты шэраг прадпрыемстваў Беларусі. Так, яшчэ ў 2012-м упершыню падняўся ў паветра ваенны беларускі беспілотнік “Грыф-1”, створаны на 558-м авіярамонтным заводзе ў Баранавічах. Галоўны выканаўца шматлікіх праектаў у “беспілотнай тэме”, які забяспечвае і каапераецыю розных прадпрыемстваў, гэта “АГАТ — сістэмы кіравання” — кіруючая кампанія холдынга “Геаінфармацыйныя сістэмы кіравання”. Паводле публікацый у СМІ, на 558-м авіярамонтным заводзе ствараюць планёр беспілотнага лятальнага апарата. Навукова-тэхнічны цэнтр “ЛЭМТ” аб’яднання БелОМА ўдасканальвае аптычную сістэму відэаназірання. У Інстытуце фізікі імя Б. І. Сцяпанава НАН Беларусі працуюць над сістэмай відэаназірання ў складаных метэаўмовах. Спецыялісты Навукова-вытворчага ўнітарнага прадпрыемства “АТАМТЭХ” ствараюць апаратуру радыяцыйнага і хімічнага назірання. Задзейнічаны ў праектах і Мінскі завод колавых цягачоў: выпускае спецыяльныя шасі для наземнага пункта кіравання і транспарціроўкі лятальных апаратаў.**

**Характэрна, што праграмнае забеспячэнне як для лятальных апаратаў, так і для наземнага пункта кіравання ствараюць беларускія праграмісты.**

для назіранняў за жывёламі. Вакол возера Палік, напрыклад, дзясяткі кіламетраў лясных балотаў: ні прайсці, ні праехаць. А зверху ўсё відаць, не трэба балоты пераадольваць.

— ***Служба ДАІ, магчыма, цікавіцца дырыжаблямі?***

— У іх ёсць больш простае рашэнне: калі складаны ўчастак — там камеры можна паставіць на мачту. А да іх — сістэму вымярэння хуткасці, напрыклад. Яны пакуль без нас абыходзяцца.

— ***Туркменскія спецыялісты праяўляюць цікавасць да беларускіх дырыжабляў?***

— Так, ёсць такая цікавасць. Ім важна маніторыць, ацэньваць сітуацыю на мяжы — у прыватнасці, на вельмі няпростым участку з Афганістанам.

— ***Ці ёсць перспектыва для турызму, экскурсій выкарыстоўваць дырыжаблі? Праляцець над балотам Ельня, напрыклад: вялізныя прасторы прыгажосці...***

— А вось прыгажосць дырыжабляў і беспілотнікаў якраз у тым, што вам самім і ляцець не трэба. Вы сядзіце ва ўтульным пакоі і ўсё бачыце… Падняць у паветра чалавека — гэта ўжо іншыя задачы, там вялікія ёсць абмежаванні. Нашы ўсе беспілотныя лятальныя апараты “завостраныя” на работу з апаратурай. Галоўнае: БПЛА не павінен сутыкнуцца з пілатуемай авіяцыяй. А пры аварыйнай сітуацыі — сесці так, каб не прынесці шкоды. Такія задачы. І над Ельняй лепш пусціць дырыжабль, усё запісаць — а потым запіс прайграць можна ў любой аўдыторыі, у любы час.

## Пасляслоўе

**Пасля знаёмства з беспілотнікам і яго стваральнікамі ў Ашхабадзе мы сталі цікавіцца: што пішуць на гэтую тэму калегі? У хуткім часе пасля выставы ў Ашхабадзе газета “Беларускі рынак” нагадала чытачам, што палёт “Буравесніка” ў Ашхабад быў невыпадковы. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка яшчэ ў 2013 годзе пасля завяршэння перагавораў з Прэзідэнтам Туркменістана Гурбангулы Бердымухамедавым зрабіў заяву: беларускія прадпрыемствы будуць пастаўляць у гэтую краіну беспілотныя авіяцыйныя комплексы і нават гатовыя наладзіць там зборку беспілотнікаў. І беларусы слова стрымалі. Газета паведаміла, што на выставе “быў прадэманстраваны беспілотнік “Буравеснік”, здольны выконваць разведвальна-ўдарныя задачы. Як вынікае са слоў спецыялістаў, якія прадстаўлялі гэтую навінку, выпуск дрона ўжо наладжаны на мясцовых прадпрыемствах”.**

**Ужо сёння цікавасць да беларускіх БЛА праяўляе шэраг краін СНД, у тым ліку краіны, якія ўваходзяць у АДКБ, а таксама Азіі, Афрыкі і Паўднёвай Амерыкі. У ліку патэнцыйных пакупнікоў беспілотнікаў made in Belarus значацца В’етнам, Туркменістан, Куба і нават Эквадор.**

**У канцы чэрвеня 2016-га з інфармацыі БелТА мы даведаліся пра падрабязнасці аб супрацоўніцтве з Туркменістанам: там зацікаўленыя як у БПЛА з радыусам дзеяння ў 290 км, так і ў беларускіх дырыжаблях. У гэтую краіну пастаўлены серыйныя вырабы, там і асвойваецца серыйная вытворчасць беларускай тэхнікі. Для гэтага Беларусь перадала ліцэнзіі, тэхналагічнае абсталяванне і дакументацыю. Дарэчы, у “Буравесніка”, якога мы бачылі ў Ашхабадзе, менавіта 290-кіламетровы радыус дзеяння. А ў НАН Беларусі, паведамляў карэспандэнту Юрый Яцына, распрацавана і серыя беспілотных авіякомплексаў класа міні пад назвай “Бусел”: яны могуць выкарыстоўвацца для маніторынгу мясцовасці і аб’ектаў. Радыус дзеяння такіх апаратаў — 25-70 кіламетраў.**

Іван і Валянціна **Ждановічы**

# Ад партнёраў сакрэтаў не трымаюць

**Эксперты з Казахстана, Расіі, Латвіі, Літвы, Украіны і Швейцарыі высока ацанілі работу беларускіх калег, прыняўшы ўдзел у міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі ў Мінску. Замежныя госці асабліва падкрэслілі, што беларусам адзіным на постсавецкай прасторы ўдалося стварыць адасобленую службу — Дзяржаўны камітэт судовых экспертыз. Таксама дэлегаты адзначылі якасць абсталявання, якое выкарыстоўваюць спецыялісты ДКСЭ, і кароткія тэрміны правядзення экспертыз.**




Вядучыя спецыялісты ў галіне судовай медыцыны, а таксама з праваахоўных органаў, навуковых устаноў і медыцынскіх арганізацый на працягу двух дзён абмяркоўвалі праблемы стану і развіцця судмедэкспертызы. Яе сучасныя магчымасці, прымяненне новых метадаў даследаванняў павышаюць ролю судовай медыцыны ў раскрыцці і папярэджанні злачынстваў, адзначыў старшыня ДКСЭ Андрэй Швед:

— Судмедэксперт адыгрывае важную ролю ва ўстанаўленні ісціны ў судаводстве, і вельмі дорага могуць абысціся любыя недахопы ў яго рабоце. Таму мы імкнёмся павысіць якасць нашых даследаванняў з дапамогай найноўшых тэхналогій і методык.

Падводзячы вынікі міжнароднага форуму, намеснік старшыні ДКСЭ Беларусі Юрый Аўсіюк паведаміў журналістам, што, магчыма, ужо з наступнага года нашы судмедэксперты пры даследаваннях пачнуць выкарыстоўваць камп’ютарную і магнітна-рэзанансную тамаграфію:

— Гэтым досведам з намі падзяліліся швейцарскія калегі. Ёсць добрыя напрацоўкі і ў экспертаў з Украіны. У цэлым, працуючы ў галіне судовай медыцыны больш як 20 гадоў, скажу, што ў апошнія гады са стварэннем камітэта мы сур’ёзна палепшылі сваю матэрыяльна-тэхнічную базу. За тры гады нам удалося падабраць і падрыхтаваць такі калектыў, які здольны спраўляцца з любымі пытаннямі. Водгукі нашых замежных калег, безумоўна, нас радуюць, але гэта вынік каласальнай працы і дакладнай арганізацыі працэсу правядзення экспертыз у адзіным дзяржаўным органе.

Людміла **Гладкая**

## З першых вуснаў

**Дырэктар Цэнтра судовай медыцыны міністэрства юстыцыі Казахстана Ахметкалі Джардэмаў:**

*— У нас цэнтры судовай медыцыны і судовых экспертыз працуюць пры міністэрстве юстыцыі. Нам яшчэ толькі трэба будзе сфарміраваць такую адзіную службу, як у беларускіх калег. І ваш досвед нам спатрэбіцца.*

**Дырэктар расійскага Інстытута судовых экспертыз, прафесар, заслужаны дзеяч навук РФ Алена Расінская:**

*— Для развіцця навукі “судовая эксперталогія” досвед Беларусі па аб’яднанні экспертных устаноў у адзіны дзяржорган — прыклад, як тэорыя і практыка могуць развівацца ў адзіным прававым полі. Мяне ўразілі кароткія тэрміны правядзення экспертыз: больш за 90 працэнтаў — у тэрмін да 30 сутак. Гэта ў асноўным дзякуючы граматнай арганізацыі самога працэсу даследаванняў.*

# Паглядзець на прыгажосць і адчуць гісторыю

**Гэтае падарожжа спадабаецца аматарам прыгожых краявідаў, тым, хто захапляецца архітэктурай розных эпох і наогул любіць даўніну. Можна ехаць па вялікім крузе: Гомель — Ветка — Чачэрск — Чырвоны Бераг — Тураў — Мазыр — Юравічы — Рэчыца — Лоеў — Гомель. А можна абмежавацца толькі абласным цэнтрам і яго бліжэйшымі наваколлямі.**

## Пабываць у сталіцы старавераў

Ветка — адзін з самых незвычайных гарадоў Беларусі. Мястэчка ў XVII стагоддзі заснавалі стараверы, якія беглі ад уціску ў Расіі. Яны лічыліся ўмелымі майстрамі. Разнымі аканіцамі і ліштвой можна любавацца, шпацыруючы па ціхіх вулачках.

Гісторыя горада і народнага побыту прадстаўлена ў Веткаўскім музеі стараверства і беларускіх традыцый. Адна з самых цікавых экспазіцый — калекцыя абразоў.

У сем'ях заўсёды было шмат кніг. Некаторыя "старадрукі", гэта значыць старадрукаваныя кнігі, перапісвалі ад рукі яшчэ ў пачатку мінулага стагоддзя. У Гомельскім філіяле музея захоўваецца надзвычай рэдкі экспанат — Евангелле XVI стагоддзя са слабады Касіцкай.





Ёсць і калекцыя самавараў — ад малюсенькага паходнага да вялізнага ў выглядзе вазы. "Чайная" з'явілася не выпадкова. Культура сямейнага чаяпіцця ў Ветцы шанавалася асабліва. Ваду для самавара бралі прама з ракі Сож, якая да Чарнобыльскай аварыі лічылася самай чыстай ракой Еўропы.

## Даведацца пра вялікую бітву на Дняпры

Лоеў называюць беларускай Швейцарыяй. Сапраўдны рай для рыбакоў і паляўнічых: у навакольных лясах — багацце дзічыны, у рэках — самыя веліканы. З цэнтральнай плошчы горада відаць месца, дзе ў Днярпо ўпадае іншая магутная рака — Сож.



годзе на яе асвячэнні прысутнічала Кацярына II.

У горадзе пабывалі і іншыя царскія асобы — імператары Аляксандр II і Мікалай I. Двойчы — праездам па дарозе ў ссылку на поўдзень і назад — спыняўся Аляксандр Пушкін і, як гавораць, вельмі весела бавіў час.

## Памаўчаць на “плошчы сонца”

Ніхто не праязджае паблізу пасёлка Чырвоны Бераг. На Жлобінскім мемарыяле ў памяць пра дзяцей — ахвяр вайны — заўсёды стаіць гулкая цішыня. У цэнтры — “Плошча Сонца”. Жоўтая пляцоўка з сямю промнямі-дарожкамі, якія сыходзяць у яблыневы сад — сімвал радасці і шчасця. І побач “Мёртвы клас” — 21 пустая парта. Перад ім — скульптура дзяўчынкі-падлетка з рукамі, якія закрываюць твар. Галодная, худзенькая, у зношанай сукеначцы...

Словамі гэта цяжка перадаць. У гады вайны ў пасёлку быў зборны пункт, дзе ў дзяцей забіралі кроў для нямецкіх салдат. Дагэтуль невядомыя імёны дзвюх тысяч закатаваных. Такіх дзіцячых канцлагераў на тэрыторыі Беларусі ў гады вайны было шаснаццаць.

— зусім ручныя, не адпусцяць, пакуль не пачастуеце іх арэшкамі.

У Гомелі жыў, вучыўся і нават некалькі гадоў настаўнічаў, перш чым з’ехаць у Маскву, авіяканструктар Павел Сухой. Гомельскія карані і ў зоркі сусветнага тэніса Марыі Шарапавай. Мясцовыя жыхары з задавальненнем пакажуць вам Дом культуры, у якім



Яшчэ пра Лоеў гавораць, што гэта горад герояў. Больш за трыста салдат і афіцэраў удастоены звання Героя Савецкага Саюза за фарсіраванне Дняпра ў 1943 годзе — фашысты ўмацавалі бераг ракі “Усходнім валам”, які лічыўся непрыступным. Як усё было, можна даведацца ў музеі “Бітва за Дняпро”. Падчас гэтых баёў Лоеў быў сцёрты з твару зямлі. Тыя, хто выратаваўся, доўгі час жылі ў зямлянках.

## Убачыць, дзе весяліўся Пушкін

Чачэрск вядомы па летапісах з XII стагоддзя. Адна з галоўных яго славутасцяў — Замкавая гара. Пры Кацярыне Вялікай паселішча належала графу Чарнышову, які пабудаваў на месцы старажытнага замка свой палац. Ні адзін з грандыёзных будынкаў не захаваўся. Сёння на замчышчы — брацкая магіла воінаў і партызан, якія вызвалялі гэтыя месцы ў гады Вялікай Айчыннай.

У Беларусі захавалася пяць ратуш. Чачэрская — самая незвычайная. У яе архітэктуры можна знайсці і класічныя, і гатычныя, і ўсходнія элементы. Да таго ж у гэтай ратушы не адна традыцыйная вежа, а цэлых пяць. Цяпер тут размясціўся музей.

Абавязкова варта зазірнуць у Свята-Праабражэнскую царкву — рэдкі для Беларусі тып храма-ратонды з вялікай круглай залай. Царква распісана італьянскімі майстрамі. У 1793

## Адпачыць у графскім парку

Маёнтак Гомій генерал-фельдмаршалу Пятру Румянцаву царыца падарыла за выдатныя перамогі ў вайне з Турцыяй. Свой палац ён узвёў на месцы старога замка магнатаў Чартарыйскіх. Усе дарогі ў Гомелі вядуць да яго. Гэта сэрца горада.

Старажытны парк палаца Румянцавых — адзін з найстарэйшых у Еўропе. Тут сабраныя дрэвы з розных краін, з бярозкамі і серабрыстымі ялінамі суседнічаюць піхта сібірская, арэх маньчжурскі, клён ясенялісты ды іншая экзотыка. Адметнае месца — Лебядзіная сажалка. Дзясяткі пар чорных і белых лебедзяў слізгаюць па воднай гладзі. Ад дзіўнага відовішча адцягваюць увагу ваверкі

пачынаў свой рэперскі шлях Сярога з “Чорным бумерам”.

Недалёка ад цэнтральнай плошчы — цудоўныя пясчаныя пляжы. На беразе Сожа — набярэжная з утульнымі кавярнямі. Сонечных дзён у паўднёвым Гомелі больш, чым у іншых гарадах Беларусі.

Генадзь **Маскоў**



# Прэферэнцыі для рэзідэнтаў

## У Беларусі адзін з эпіцэнтраў, дзе імкліва развіваецца агратурызм, — Гродзенская вобласць






### Дваранскае гняздо

Культура земляробства на Гродзеншчыне найвышэйшая. З векавымі традыцыямі. У савецкі час збіралі па 80-90 цэнтнераў з гектара. З усяго Саюза аграномы прыязджалі вучыцца. Традыцыі захоўваюцца. Плюс найчысцейшая экалогія. Карацей, хочаце смачнай і здаровай ежы — тады вам абавязкова сюды. У вобласці ўжо дзейнічае каля трохсот аграсядзіб. Адна з іх — у маёнтку Свяцк Гурскіх у Радзівілках. Сустрэлі як самых дарагіх гасцей і пачаставалі вельмі смачным абедам. Дранікі са свінымі ножкамі — гэта нешта! Язык праглынеш. Дубовы стол накрылі ў трапезнай васямнаццатага стагоддзя. Масіўны мур з абпаленай цэглы, скляпеністыя столі. Некалі старажытны дом быў прадстаўнічым домам дваран Свяцк Гурскіх. У савецкі час тут размяшчалася спачатку пажарная часць, затым — санаторый, які закрыўся ў сямідзясятых гадах. Абязлюдзелы дом трухлеў, руйнаваўся. Некалькі гадоў назад яго выкупіла на аўкцыёне сям'я Барташэвіч з Гродна.

— Мы далі гэтаму месцу другое жыццё, вывелі яго з комы, — расказвае гаспадыня сядзібы Ірына Барташэвіч.

Курачкі, індычкі, бульба, буракі, морква, яблыневы сад — экалагічна чысты асартымент турыстам гарантаваны. За два крокі ад дома каскадныя сажалкі — карп, карась, акунь.

Роля агратурыстычнага цэнтра для маёнтка Свяцк Гурскіх не ў навіну. Да XVIII стагоддзя гэтае месца належала манахам-пустэльнікам з ордэна камедулаў. Вырошчвалі гародніну, вінаград, рабілі сыры. Адпачыць і падсілкавацца натурпрадуктамі да іх прыязджала гарадская шляхта. А цяпер — простыя турысты. Цэны самыя сходныя — двухмеснае размяшчэнне ў старажытным доме — пятнаццаць долараў у суткі з чалавека.



### Пячом пірог на дрэве

Наступны пункт маршруту — "Фальварак "У Рыся" у вёсцы Карэвічы за дзесяць кіламетраў ад Ваўкавыска. Летась гэтая аграсядзіба атрымала Гран-пры рэспубліканскага конкурсу як лепшая ў Беларусі. Комплекс з пяці дамоў на беразе ракі Рось — побач з запаведным лесам. У кожнага з дамоў — свая фішка. Дом ганчара. Дом разьбяра па дрэве. Дом ткачыхі. Дом траўніцы. А яшчэ — лазня-бочка, дзясяткі скульптур і ўтульных альтанак.

Для турыстаў ладзяць майстар-класы па народных рамёствах. У доміку разьбяра стаіць сапраўдная руская печ, тут па ўнікальным рэцэпце гатуюць нацыянальную страву беларусаў, літоўцаў і палякаў — банкуху, якую яшчэ называюць пірагом на дрэве. Даўней яго пяклі нявесты на вяселле. Працэс прыгатавання працаёмкі, але займальны. Для пачатку дзве гадзіны праграваюць печ, затым у асобных чанах уручную ўзбіваюць па шэсцьдзясят бялкоў і жаўткоў, дадаюць масла, муку і смятану. Пасля чаго цеста намотваюць



на верацяно (адгэтуль "пірог на дрэве") і запякаюць дзве гадзіны. Правільна прыгатаваны, ён застаецца свежым цэлы месяц!

Мудрагелістыя рачныя выгіны нібы створаныя прыродай для таго, каб за кожным з іх уладкаваць унікальны пляж. Напрыклад, жабін — для сем'яў з маленькімі дзеткамі, лебядзіны — для закаханых пар, востраў Рабінзона — для падлеткаў.

"Фальварак "У Рыся" — унікальная аграсядзіба. Тут створаны ўмовы для адпачынку і рэабілітацыі людзям з абмежаванымі магчымасцямі з дапамогай іпатэрапіі — верхавой язды. У стайні — тры кані. Заняткі праводзіць дыпламаваны інструктар. Плюс — тэрыторыя абсталявана пандусамі. Цана пражывання 600-900 расійскіх рублёў у суткі. Па расійскіх - прэйскурантах — амаль дарма.

## Рака, дзе плёскаецца фарэль



"Дом рыбака" ў пасёлку Каробчыцы за пяць кіламетраў ад Гродна — райскае месца для аматараў пасядзець з вудай на беразе ці ў лодачцы. Ён размешчаны на беразе вадасховішча Верхняе. Асартымент рыбалоўных трафеяў уражвае: плотка, шчупак, акунь, карась, карп, белы амур, сом. У рацэ з гаваркой назвай Ласасянка,




якая ўпадае ў вадасховішча, рыбаловы змогуць злавіць нават фарэль. Пад навесамі з мангаламі можна зрабіць шашлык. Або згуляць у валейбол на спартыўнай пляцоўцы.

У гэты дзіўны куток Беларусі прыязджаць можна круглы год. Побач знаходзяцца гарналыжная траса, конны клуб і яшчэ адзін агратурыстычны комплекс — "Гродзенскі маёнтак "Каробчыцы", у якім ёсць нават невялікі заапарк. Пражыванне ў "Доме рыбака" каштуе ў сярэднім ад 500 да 1500 расійскіх рублёў.

А ў сядзібе "Над Гаўей" у вёсцы Залейкі на 144-м кіламетры трасы Мінск — Гродна для гасцей выступае па вечарах ансамбль народнай беларускай песні. Побач сасновы бор і бярозавы гай — грыбоў і ягад безліч. Ці можна рвануць у падарожжа на байдарцы, любуючыся ўзбярэжнымі ляснымі краявідамі. Кошт пражывання — ад 700 да 2000 расійскіх рублёў, за якія можна арандаваць асобны домік.

## Інвестараў просяць патурбавацца

Тым, хто гатовы ўкласціся ў развіццё, — ільготы, адмена падатку ды іншыя прэферэнцыі.

Аўгустоўскі канал — цуд інжынернай думкі XIX стагоддзя. Злучае Віслу і Нёман. Яркі прыклад, як беражліва адносяцца да гістарычнай спадчыны. Яго пракапалі, калі Польшча ўвайшла ў склад Расійскай імперыі, каб вазіць тавары, абыходзячы Усходнюю Прусію. Абломкі драўляных рыдлёвак знаходзяць дагэтуль. Мужчыны самі рваліся ў грабары — казна не скупілася на грошы.

Са ста кіламетраў канала 22 — у Беларусі, астатнія — у Польшчы. Падчас вайны немцы, адыходзячы, падарвалі ўсе шлюзы. Палякі сваю частку з часам аднавілі і сталі выкарыстоўваць у турыстычных мэтах, атрымліваючы добры даход. Беларусы схамянуліся ў пачатку двухтысячных. І зрабілі нават лепш, з максімальнай гістарычнай дакладнасцю. У 2011-м быў створаны турысцка-рэкрэацыйны парк "Аўгустоўскі канал". Галоўная задача — прыцягнуць інвестараў для развіцця турыстычнай інфраструктуры.

— Прэферэнцыі для рэзідэнтаў самыя выгадныя, — расказвае намеснік кіраўніка адміністрацыі свабоднай эканамічнай зоны "Гродна-інвест" Дзмітрый Клімянок. — Вызваленне ад падатку на прыбытак на працягу першых пяці гадоў. Затым — 50-працэнтная льгота. Падатку на нерухомую маёмасць няма наогул. Участкі пад будаўніцтва прадастаўляюцца ў арэнду пад 0,0125 працэнта ад кадастравага кошту гектара. Мізер. Ніштo. Неабходны аб'ём інвестыцый, каб стаць рэзідэнтам, не меншы за дзвесце тысяч еўра.

Пяцізоркавы хмарачос грувасціць не дадуць. Міні-гатэлі, аграсядзібы — калі ласка. Расцэнкі для турыстаў па расійскіх мерках казачныя — 400-700 расійскіх рублёў з чалавека ў суткі. Прыехаць можна і з палаткай. Турыстычны паток імкліва расце. Калі ў 2011 годзе тут адпачылі 11 тысяч чалавек, то ў 2015-м — ужо 68 тысяч.

Барыс **Арэхаў**




99-гадовы ветэран вайны Сцяпан Цюшкевіч:

***Гэта наша агульная гісторыя, якую нельга забываць***

# Мінулае натхняе

**У Дзелавым і культурным комплексе Пасольства Беларусі ў Расіі прайшла прэм’ера дакументальнага фільма “Цытадэль памяці” — пра гісторыю абароны Брэсцкай крэпасці**

## Матэрыялу хопіць яшчэ на некалькі карцін

Гераічнае мінулае Брэсцкай крэпасці больш як паўстагоддзя працягвае натхняць кінематаграфістаў.

Аўтары дакументальнай стужкі “Цытадэль памяці” — члены грамадскай арганізацыі “Дух Эльбы”, якую ўзначальвае палкоўнік запасу Зарына Вашурына. Яе бацька, генерал-лейтэнант Пётр Вашурын, у 1945 годзе быў адным з удзельнікаў знакамітай сустрэчы на Эльбе. А пазней стаў ініцыятарам стварэння Музея гераічнай абароны Брэсцкай крэпасці, якому 8 лістапада споўніцца шэсцьдзясят гадоў. Фільм расказвае не толькі пра падзеі лета 1941-га, але і пра гісторыю стварэння мемарыяльнага комплексу.

— Нам удалося сабраць столькі матэрыялу, што хопіць яшчэ на некалькі фільмаў. Гэтая карціна можа стаць пачаткам для значна больш глабальных праектаў, — расказаў перад паказам рэжысёр Васіль Кіслоў.

Летась аўтары стужкі атрымалі грант Прэзідэнта Расіі. Ад пачатку і да канца здымак падтрымлівала іх і вышэйшае кіраўніцтва Саюзнай дзяржавы.

— З задавальненнем вырашылі дапамагчы, — прызнаўся саветнік-пасланнік Пасольства Беларусі ў Расіі Павел Лёгкі. — Я і сам даўно захапляюся гісторыяй абароны Брэсцкай крэпасці. Шмат чытаў. Яшчэ хлопцам аблазіў крэпасць зверху данізу — там, дзе гэта было магчыма.

## Вачамі відавочцаў

Галоўная каштоўнасць фільма — у тым, што пры яго стварэнні ўдзельнічалі ветэраны.

Кансультаваў аўтараў карціны Анатоль Цвяткоў. Доктар ваенных навук, член Саюза пісьменнікаў Расіі не прымаў удзелу ў абароне Брэсцкай крэпасці, але з ёй у яго жыцці звязана многае:

— Калі ваяваў пад Сталінградам, удзельнік абароны расказаў нам, салдатам, як амаль месяц змагаліся воіны Брэсцкай крэпасці. Гэта зрабіла на ўсіх вялікае ўражанне, дапамагло не апусціць рукі.

Ваенны гісторык, генерал-маёр Сцяпан Цюшкевіч абараняў землі Ленінградскай вобласці і Прыбалтыкі. Але ў ветэрана — беларускія карані, брат — ваенны лётчык, загінуў у 1944 годзе і пахаваны недалёка ад Брэста. У наступным годзе Сцяпану Андрэевічу споўніцца сто гадоў. — З задавальненнем паўдзельнічаў у здымках, — падзяліўся ўражаннямі С. Цюшкевіч. — Фільмы пра Вялікую Айчынную вайну трэба выпускаць часцей. Людзі праявілі гераізм, якога не ведала чалавецтва. Гэта наша агульная гісторыя, яе нельга забываць.

Пра падзеі чэрвеня 1941-га расказаў у фільме непасрэдны ўдзельнік абароны Брэсцкай крэпасці Пётр Кацельнікаў. Калі пачалася вайна, 12-гадовы хлопчык быў выхаванцам музыканцкага ўзвода. У гушчы падзей апынуўся з першых гадзін: здабываў патроны, хадзіў у разведку, дапамагаў параненым.

Паспеў прыняць удзел у здымках і першы кіраўнік мемарыяльнага комплексу Аркадзь Крупеннікаў. Да прэм’еры, на жаль, не дажыў: памёр у канцы лета на 94-м годзе жыцця.

Ірына **Мустафіна**

# “Чароўную флейту” і “Тоску” разбавім санетамі Шэкспіра

## Пра планы Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі расказаў генеральны дырэктар Уладзімір Грыдзюшка

У 84-м сезоне прыхільнікаў балета чакаюць адразу тры прэм’еры. Трупа Вялікага выканае “Пахіту” Людвіга Мінкуса ў пастаноўцы Паўла Сталінскага. Балетмайстар Аляксандра Ціхамірава 1 снежня прадставіць “Санеты” Пітэра Уорлака і Ральфа Воан-Уільямса па матывах паэзіі Шэкспіра. А ўжо ўлетку пакажам сучасны балет Міхаіла Крылова “Ор і Ора”.

У сакавіку па-новаму загучыць яшчэ адна знакамітая опера Моцарта “Чароўная флейта”. Яе паставіць у Мінску еўрапейскі рэжысёр і прадзюсар Ханс-Ёахім Фрай. Іншая сцэнічная рэдакцыя будзе і ў оперы “Тоска” Пучыні. Хто стане рэжысёрам спектакля, паведамім крыху пазней.

***— Нешта сыдзе з рэпертуару?***

— Оперы “Набука” і “Севільскі цырульнік”. На жаль, сёння цікавасць гледачоў да іх знікла. Але цалкам з рэпертуару тэатра яны не выпадуць. Прыйдзе час, мы іх “асвяжым” і вернем на сцэну.

***— На гастролі паедзеце?***

— У снежні плануем гастролі ў Германіі і ў Егіпце. У канцы красавіка балеты “Спартак” і “Лебядзінае возера” ўбачаць гледачы Нідэрландаў. Збіраемся і на гастролі па Беларусі. Філіялы тэатра ёсць у Магілёве, Наваполацку, Гомелі. Па традыцыі абавязкова зазірнём туды і ў новым сезоне.

***— Склад трупы зменіцца?***

— Калектыў папоўніцца на 16 чалавек. Прыкметна “памаладзеў” аркестр. Узрадую ўсіх прыхільнікаў Вольгі Гайко — пасля цяжкай траўмы народная артыстка Беларусі зноў выйдзе на сцэну.



У хуткім часе “Лебядзінае возера” будзе радаваць гледачоў Нідэрландаў

# Вялікі тэатр паказаў незвычайную пастаноўку

Знакамітае “Вяселле Фігара” не сыходзіла з афіш беларускага тэатра больш як 30 гадоў. І вось пасля трохгадовага перапынку опера Моцарта зноў вярнулася на сцэну. Паставіў спектакль галоўны рэжысёр Маскоўскага Камернага музычнага тэатра імя Пакроўскага Міхаіл Кісляроў. Дырыжорам-пастаноўшчыкам выступіў Алег Лясун.

На тым, каб “Вяселле Фігара” гучала на рускай, а не на італьянскай мове, настаяла дырэкцыя тэатра. За аснову ўзялі лібрэта Ларэнца да Понтэ ў перакладзе Чайкоўскага і Паўлавай. Галоўную ролю выконваюць барытоны Аляксандр Краснадубскі і Сяргей Лазарэвіч.

— “Вяселле Фігара” — бліскучая, лёгкая камедыя. Пастаноўка простая і зразумелая. Гэты класічны тэкст не мае патрэбы ў эксперыментах.

***— Беларускім гледачам чакаць Тэатр Пакроўскага на гастролі?***

— Запрашайце! Прыедзем з вялікім задавальненнем!

Крысціна **Хілько**





“Вяселле Фігара” ў пастаноўцы Міхаіла Кісларова



НАДЗЕЯ ПАНКРАТАВА



ПАВЕЛ БАС

Уладзімір Грыдзюшка, дырэктар Вялікага тэатра — прафесіянал і ў арганізацыі крэатыўных праектаў

# Усе таленты ў госці да Вялікага

**Нічога падобнага ў Вялікім тэатры Беларусі яшчэ гадоў гэтак дзесяць-пятнаццаць назад не было. А цяпер што ні спектакль, то з удзелам зорак з розных краін свету.**



Опера "Князь Ігар" з Якуціі пакарыла беларускую публіку

## Плюсы аб'яднання

Вось ён, вынік працэсаў глабалізацыі — інтэграцыя і ў свеце мастацтва, якая спрыяе фарміраванню ўніверсальных культурных каштоўнасцяў. Рэпертуар Вялікага тэатра Беларусі ў лістападзе — найяскравейшы прыклад такой інтэграцыі, якая ўмацоўвае міжнароднае братэрства і мір паміж народамі любых нацыянальнасцяў і рознага веравызнання.

Варта толькі паглядзець на афішу месяца. Хто толькі не пабываў у гэтыя восеньскія дні ў Мінску. Лаўрэат міжнародных конкурсаў Анэль Рустэмава з Казахстана танцавала партыю Гамзаці ў адным з найпрыгажэйшых балетаў Мінкуса "Баядэрка". А заслужаная артыстка Азербайджана Афаг Абасава, салістка Азербайджанскага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра оперы і балета, уладальніца ўнікальнага сапрана, чый талент адзначаны ганаровай стыпендыяй прэзідэнта Казахстана і ўдзелам у прэстыжных творчых праектах, выканала партыю Неды ў спектаклі "Паяцы" Руджэра Леанкавала. Некалькімі днямі пазней заслужаны дзеяч Рэспублікі Казахстан Айгуль Ніязава бліскуча выступіла ў ролі Чыа-Чыа-сан у легендарнай оперы Пучыні "Мадам Батэрфляй".

Якуты ж пакарылі беларускую публіку операй "Князь Ігар", спектаклем Дзяржаўнага тэатра оперы і балета Рэспублікі Саха, адной з самых маштабных пастановак. Яна радавала не толькі сваіх гледачоў, але таксама кітайскую

публіку ў Пекіне. У оперы заняты 49 артыстаў балета і 52 — хору, 22 салісты і 44 музыканты тэатра! Рэспект нашаму праслаўленаму тэатру, які здольны прыняць такую вялікую трупу. Дарэчы, гэтай пастаноўцы крытыкі прадказваюць быць у намінантах на самую прэстыжную тэатральную прэмію Расіі — "Залатая Маска".

І ўжо праз дзень адбыўся гала-канцэрт якуцкіх зорак. Нашы гледачы пачулі хоры, сцэны і арыі з сусветна вядомых опер Чайкоўскага, Вердзі, Маснэ, Дэліба, Даніцэці, Леанкавала, Дворжака, Беліні, Пучыні ды іншых кампазітараў, а таксама ўбачылі выдатныя нумары з балетаў "Талісман" Дрыга, "Прывал кавалерыі" Армсгеймера, "Сільфіда" Левенсхольда. Увесь вечар за дырыжорскім пультам была галоўны запрошаны дырыжор тэатра Рэспублікі Саха, лаўрэат міжнароднага конкурсу Аляўціна Іофэ.

Затым кіяўляне паказалі балет "Жызэль". Тэатр харэаграфіі "Кіеў Мадэрн-балет", як вядома, прызнаны міжнароднай мастацкай супольнасцю і ўжо з'яўляецца візітнай карткай Украіны. Пра "Жызэль" лепш не скажаш, чым у адным з інтэрв'ю выказаўся сам яго харэограф-пастаноўшчык Раду Паклітару: "Калі мы гаворым слова "балет", то на першым месцы, безумоўна, стаіць "Лебядзінае возера", а за ім трывала замацавалася "Жызэль". І знаходзіцца яна там з 1841 года. З усіх балетаў, якія ідуць на сусветных балетных сцэнах, менавіта гэты самы стары. Калі я задумаўся аб тым, што пара стварыць новую пастаноўку і рэмейк класічнага балетнага твора, я практычна адразу вырашыў, што гэта будзе "Жызэль". Па-першае, я сам танцаваў у гэтым балеце на сцэне Беларускага тэатра оперы і балета. Па-другое, там надзвычай прыгожая музыка Адольфа Адана. Дарэчы, Чайкоўскі высока цаніў музыку Адана і лічыў, што гэта самая лепшая балетная музыка ў свеце. А пачуць такое ад Чайкоўскага — дарагога варта. У выніку ўсе гэтыя пазлы сышліся, і я вырашыў, што "Кіеў Мадэрн-балету" час абзавесціся ўласнай "Жызэллю".

Дадам і я: гэты гранд-балет не пакінуў абыякавымі нават заўзятых прыхільнікаў класікі. Паколькі ўсё, што адбывалася на сцэне, было незвычайна ярка, стыльна і якасна. Што і гаварыць, мінчане ўбачылі сапраўдны еўрапейскі дарагі прадукт. Прыгожыя касцюмы, дэкарацыі, музыка радавалі вока. І сучаснае прачытанне ніякім чынам не перашкодзіла раскрыццю ідэі ўсіх часоў і народаў — ідэі кахання.

Да лістападаўскай тэмы не магу ўтрымацца, каб не дадаць парачку дзён з кастрычніка, бо 22-га чысла ў рамантычнай драме Чайкоўскага "Яўген Анегін" партыю Ленскага спяваў лаўрэат міжнародных конкурсаў Міхаіл Малафій, саліст Львоўскага опернага тэатра (Украіна). А дырыжыраваў маэстра з Германіі Аркадзь Берын.

27-га кастрычніка на сцэне Вялікага можна было ўбачыць "Травіяту" Джузэпэ Вердзі з удзелам запрошаных салістаў італьянскай і французскай оперы. Гэты сумесны праект пасольства Італіі і пасольства Францыі ў Беларусі выклікаў вялікую цікавасць прыхільнікаў опернага мастацтва. Дырыжыраваў у той вечар Франсуа Робер Жыроламі (Францыя). У цяперашні час ён — дырыжор аркестра Сібіу ў Сербіі, а таксама Філарманічнага аркестра Краёва. Дарэчы, маэстра запрашалі да супрацоўніцтва многія еўрапейскія калектывы: Нацыянальны аркестр Оперы Монтэ-Карла, Аркестравы ансамбль Парыжа ды іншыя музычныя калектывы з розных краін свету: Венгрыі, Балгарыі, Германіі, Ізраіля, Італіі, Бельгіі, Англіі ды Іспаніі. Думаю, працаваць з сімфанічным аркестрам Вялікага тэатра Роберу Жыроламі спадабалася. Здаецца, і публіцы маэстра, доктар філасофіі, які не пакідае кар'еру музыкан-



Балет "Жызэль" Тэатра харэаграфіі "Кіеў Мадэрн-балет" не пакінуў абыякавымі нават традыцыяналістаў — прыхільнікаў класікі



Афаг Абасава, заслужаная артыстка Азербайджана, салістка Азербайджанскага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра оперы і балета, выканала партыю Неды ў спектаклі "Паяцы"

та, пра што расказалі журналістам на прэс-канферэнцыі напярэдадні спектакля, спадабаўся: яго паклоны і жэсты былі хоць і сціплыя, але артыстычныя, што не магло не выклікаць сімпатыі да іх уладальніка.

Як выказаўся сам Робер Жыроламі на сустрэчы з журналістамі, дадому ён вернецца чалавекам, які духоўна ўзбагаціўся, таму што дзякуючы Вялікаму тэатру Беларусі спрычыніўся да беларускай культуры.

Кампліменты ў адрас Мінска сыпаліся з вуснаў выканаўцы партыі Віялеты Марылін Леанэці з Францыі, якой горад вельмі спадабаўся. Прыгажосць яго будынкаў, а таксама прыгажосць гараджан не пакінула абыякавым італьянскага спевака і кінаакцёра з Італіі Фульвіа Аберта, выканаўца партыі Альфрэда. А мастацкі кіраўнік Тэатра Вердзі ў Пізе Марчэла Ліпі-Жэрмон узняўся да глыбокіх абагульненняў, выказаўшыся пра аб'яднаўчыя пачаткі музыкі. Ад артыста мы і даведаліся, што для пастаноўкі "Травіяты" ў сваім тэатры ён запрашаў беларускую салістку Ганну Казлову. Працуючы з ёй, Марчэла Ліпі зразумеў, што ўзровень беларускіх выканаўцаў і балетнай школы даволі высокі.

А вось як прагучала адна з самых знакамітых опер у рэпертуары сусветнага музычнага тэатра ў выкананні знакамітых гасцей, сама, на жаль, сказаць не магу. Заўважу толькі, што чула розныя меркаванні. З захапленнем некаторыя мае калегі адгукаліся пра пяшчотнае сапрана і артыстызм Марылін Леанэці-Віялеты, гучанне нашага аркестра і, зразумела, пра музыку Джузэпэ Вердзі.

Таксама мне прыемна паведаміць, што канец месяца на сцэне Вялікага тэатра завершыцца знаёмствам з артыстамі балета з Казахстана — Айгерым Бекетаевай, якая станцуе партыю Адэты-Адыліі ў "Лебядзіным возеры" Чайкоўскага і з Олжасам Тарланавым — Зігфрыдам. У спектаклі ж "Травіята" праспяваюць: Міхаіл Малафій —Альфрэда, а Надзея Паўлава, салістка Пермскага тэатра оперы і балета з Расіі, уладальніца Гран-пры, вышэйшай узнагароды конкурсу маладых вакалістаў 2015 года, — Віялету.


АЛЯКСЕЙ СМОЛЬСКІ

Уладальніца Гран-пры Другога міжнароднага конкурсу маладых вакалістаў-2015 Надзея Паўлава(Расія) і ўладальнік Першай прэміі і Прыза сімпатый гледачоў Міхаіл Малафій (Украіна)

***Мінскі міжнародны Калядны конкурс вакалістаў быў заснаваны ў 2014 годзе па ініцыятыве Вялікага тэатра Беларусі***


Гала-канцэрт зорак сусветнай оперы ў 2015 годзе

# У чаканні ўрачыстасці

Існежань набліжаецца. З ім і лёгкае прыемнае хваляванне, выкліканае чаканнем Калядаў і Новага года. Але эмацыйны фон чакання, па-мойму, быў бы звычайным, калі б не Вялікі тэатр з яго шматлікімі праектамі. Не ведаю, як у каго, але ў мяне, пра што ўжо гаварыла неаднаразова, наведванне Оперы нараджае ў душы свята. І з гэтым прыўзнятым настроем жыву доўга, з ім жа і "ўваходжу" ў чарговы год жыцця.

Што падорыць нам Вялікі на гэты раз?

Як і чакалася, конкурс маладых вакалістаў! Спевакі з розных краін прыедуць у Беларусь з 7 па 13 снежня. Як паведаміла Алена Балабановіч, вядучы рэдактар службы маркетынгу, інфармацыі і рэкламы Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі, заяўкі на ўдзел у ІІІ Мінскім міжнародным Калядным конкурсе вакалістаў падалі 226 выканаўцаў з 20 краін: Беларусь, Расія, Украіна, Грузія, Узбекістан, Канада, Казахстан, Малдова, Літва, ЗША, Францыя, Манголія, Кітай, Арменія, Ізраіль, Латвія, Турцыя, Швецыя, Карэя і нават Ірландыя. А ацаніць вакальны талент удзельнікаў зможа не толькі высокае журы конкурсу, але і гледачы. Па традыцыі, мы зможам пачуць удзельнікаў у вялікай зале тэатра 11 снежня — на другім туры конкурсу — і 13 снежня — на Гала-канцэрце фіналістаў, дзе, акрамя дыпломаў і ўзнагарод, будзе ўручаны і Прыз сімпатый гледачоў. Акрамя таго, выступіць у фінальным гала-канцэрце ў якасці гасцей запрошаны пераможцы конкурсу мінулых гадоў. І гэтыя імёны сёння добра вядомыя аматарам opернага мастацтва: Раміз Усманаў з Узбекістана, Надзея Паўлава з Расіі , Міхаіл Малафій —Украіна, Лаша Сесіташвілі — Грузія, Алена Сціхіна — Расія, Віктар Мендзелеў і Ілья Сільчукоў — Беларусь.

Звычайна конкурс вакалістаў праходзіць у тры туры, першыя два — з канцэртмайстрам, трэці , фінальны — у суправаджэнні аркестра. У фінале конкурсу ўдзельнікі выконваюць адну з галоўных партый у сцэнах з опер класічнага ці сучаснага рэпертуару, а дапамагаюць ім у гэтым зоркі беларускага Вялікага тэатра.

Уладальнік Гран-пры конкурсу атрымае грашовы прыз у памеры 10 000 долараў ЗША, лаўрэат I прэміі — 8 000 долараў ЗША, лаўрэат II прэміі — 6000 долараў ЗША, а лаўрэат III — 4 000 долараў ЗША. І што ўяўляецца вельмі істотным: многія маладыя артысты конкурсу атрымаюць запрашэнні ў вядучыя оперныя тэатры і кампаніі свету.

Бо вызначаць лепшых з лепшых будзе кампетэнтнае журы, у склад якога ўваходзяць дырэктары оперных тэатраў, імпрэсарыа і вядомыя музычныя дзеячы. Па пратаколе журы ўзначаліць Уладзімір Грыдзюшка, генеральны дырэктар Вялікага тэатра Беларусі. Таксама ў лік суддзяў увойдуць: Тадэй Эдэр, генеральны дырэктар Львоўскага нацыянальнага акадэмічнага тэатра оперы і балета імя С.Крушальніцкай (Украіна), акадэмік Пламен Карталаў, дырэктар Сафійскага нацыянальнага тэатра оперы і балета, Джон Элісан, рэдактар часопіса "Опера" (Вялікабрытанія), прафесар Крыстаф Меер, генеральны дырэктар Нямецкай оперы на Рэйне (Германія), Морыс Ксіберас, генеральны дырэктар Оперы Марсэля (Францыя), Джанлука Марчыяна, дырыжор, мастацкі кіраўнік фестывалю "Аль-Бустан" у Бейруце (Італія) і многія іншыя.



VII Мінскі міжнародны Калядны оперны форум адкрыецца операй "Кармэн" з Аксанай Волкавай у ролі Кармэн, заслужанай артысткай Беларусі



АЛЯКСЕЙ СМОЛЬСКІ

Адразу ж за конкурсам — з 14 па 20 снежня — нас чакае VII Мінскі міжнародны Калядны оперны форум, у якім прымуць удзел зоркі, якія пакарылі сусветна вядомыя оперныя пляцоўкі свету!

У праграме — оперы "Кармэн", "Макбет", "Пікавая дама", "Вяселле Фігара", "Турандот". Адкрывае свята "Кармэн" з бліскучай Аксанай Волкавай у ролі Кармэн, а завершыцца форум вялікім гала-канцэртам.

Валянціна **Ждановіч**



# Паглядзець і не пазнаць

**Міжнародны тэатральны фестываль “ТЭАРТ”, які завяршаецца ў Мінску, — падзея чаканая. Форум праводзіцца ў шосты раз і выключае справаздачна-конкурсны прынцып. Няма журы. Няма канкурэнцыі. Хоць і ёсць відавочныя “хедлайнеры” — спектаклі, ад якіх многага чакаюць. Гэта пастаянны ўдзельнік “ТЭАРТа” — літоўскі рэжысёр Оскарас Каршуновас, піцерскі Юрый Бутусаў, тэатры з Польшчы, Венгрыі, Славеніі, Францыі, Германіі, Швейцарыі і, вядома ж, салідны дэсант з Расіі.**



Канцэпцыя фестывалю — толькі новае, актуальнае, разнастайнасць формаў і рэжысёрскіх вырашэнняў. Таму ў дзясяты ці нават соты раз можна глядзець шэкспіраўскага “Макбета” і “Мера за меру”, гогалеўскую “Жаніцьбу” і “Апошнюю стужку Крэпа” Бекета, “Візіт старой дамы” Дзюрэнмата і “На дне” Горкага. Паглядзець і... не пазнаць п’есу. Парадавацца, што вечная класіка гучыць сучасна і прымушае перачытваць арыгінал.

Раней можна было паказаць курачку, якая нясе залатыя яйкі. Сёння на сцэне можа з’явіцца вялізнае яйка, побач халадзільнік і волат, які абскубае і разбірае курыцу. Свет мяняецца — і гледачы мяняюцца.

Раскладка такая: 10 спектакляў міжнароднай праграмы і 13 — беларускай. Акрамя беларускіх спектакляў, больш за ўсё пастановак па рускіх п’есах, якія ставяць у нас і за мяжой. Для Беларусі вельмі важна параўнаць свае дасягненні з тым, што адбываецца ў Еўропе і Расіі.

Ад Беларусі сёлета ўдзельнічаюць тры рэпертуарныя драматычныя тэатры: з Мінска, Магілёва і Брэста. Чатыры тэатры лялек з тых жа гарадоў, плюс Гродна.

Адзін праект харэаграфічны — “Прадметная размова”. Адзін праект музычна-вакальны — “З жыцця насякомых”. Дзве праграмы беларускага перформанса. Адзін — спецыяльна створаны для форуму — “Опіум”. У 2016 годзе спектакль увайшоў у шортліст конкурсу новай драматургіі “Ремарка” і прызнаны адным з лепшых на інтэрнэт-партале “Культпрасвет”. Усе праекты ствараюць яркую карціну таго, што адбываецца ў беларускай тэатральнай прасторы.

Самы вялікі рэзананс выклікалі работы беларускіх маладых рэжысёраў і акцёраў: па паэзіі прадстаўніка рускіх абэрыўтаў Мікалая Алейнікава “З жыцця насякомых” і па прозе Святланы Алексіевіч “Час сэканд-хэнд”. Якасна і спрэчна прачытаны тэатрамі “Крэйцарава саната” Льва Талстога, “На дне” Максіма Горкага, апавяданне Андрэя Платонава “Фро”.

Рэжысёр з Санкт-Пецярбурга Сямён Александроўскі прывёз монаспектакль “Паліва”. Гэты праект — дакументальны, расказвае пра жыццё матэматыка Давіда Яна, распрацоўшчыка электронных слоўнікаў і зачынальніка флэшмобаў у Расіі.

Маскоўскі драматычны тэатр імя Пушкіна разам з рэжысёрам з Вялікабрытаніі, вядомым Дэкланам Данеланам здзівілі і парадавалі п’есай Шэкспіра “Мера за меру”. А на фінал фестывалю прыгатавана шакуючае тварэнне Юрыя Бутусава паводле п’есы Гогаля “Жаніцьба”.

Таццяна **Арлова**

# Шчаслівы бумеранг

## У мінскай галерэі сучаснага мастацтва “АртПорт” адкрылася мастацкая экспазіцыя “5=3”. Яе натхніцель і арганізатар — Ларыса Грыбалёва.

Удзел маёй візаві ў гэтым праекце, які прадстаўляе Максіма Петруля і Антона Слюнчанку (Anton Snt), двух мастакоў без дыпломаў акадэміі мастацтваў і акадэмічнага погляду на тое, як пісаць карціны, прызнаюся, мяне здзівіў. Як расказала Ларыса, у чым я потым і сама пераканалася, 5 і 3 — гэта колькасць работ, выстаўленых аўтарамі, якія на працягу трох месяцаў абяцаюць цалкам абнавіць экспазіцыю. Прычым, пераўтварэнні будуць ажыццяўляцца прама на вачах публікі. А лічбы 5 і 3, аказваецца, з’яўляюцца паслядоўнымі лічбамі Фібаначы, іх жа суадносіны — формулай залатога сячэння. Ці прысутнічае гармонія залатога сячэння ў саміх работах Максіма і Антона, сказаць непасвячонаму ў гэтыя тонкасці гледачу цяжка. Але ўсё ж, нешта ў іх стыльных, сказала б, авангардных экспанатах, якія разбураюць каноны класічнага мастацтва, зачароўвае, заахвочвае думаць і адчуваць. Але, зрэшты, пра першую беларускую галерэю, якая пазіцыянуе сябе як галерэя, гатовая заняцца стварэннем арт-бізнесу, пагаворым у іншы раз. Цяпер — пра Ларысу Грыбалёву.

І як яе, вядомай спявачкі, тэлевядучай, актрысы і дырэктара ўласнага івент-агенцтва “Святочнае бюро Ларысы Грыбалёвай”, хапае на ўсё, падумала я, узіраючыся ў работы Максіма і Антона. І з мастакамі вазіцца бескарысліва, і кар’еру рабіць, і дзяцей гадаваць … Бо нядаўна зноў стала маці. У трэці раз!

І вось Ларыса перада мною: маладая, прыгожая, у сукенцы пастэльных адценняў, з вачыма, якія свецяцца ад радасці, задаволеная сваім жыццём… Яна запрасіла да сябе дадому: падрыхтоўка да святкавання дня нараджэння не дазволіла выбрацца ў горад для інтэрв’ю.



АЛІСА КРАСОЎСКАЯ

Зорка беларускай эстрады сустрэла "па-сямейнаму": у хатняй сукенцы і без касметыкі. Пакуль астывала кава, яна варыла сваёй маленькай дачушцы кашу, частавала мяне малінамі і паспявала наносіць макіяж. У такой камфортнай абстаноўцы мы і гаварылі.

***— Ларыса, чаму агенцтва, якое супрацоўнічае з такімі салíднымі арганізацыямі, як Гандлёва-прамысловая палата і буйнымі страхавымі кампаніямі, раптам пачынае арганізоўваць выставы малавядомых мастакоў? Навошта вам гэта?***

— Неяк само сабою так атрымалася... Аднойчы да нас звярнуўся запатрабаваны ў Беларусі скульптар Андрэй Астаўшоў. Дарэчы, ён штогод выстаўляецца з новай экспазіцыяй. Як вы ведаеце, у яго ёсць свая персанальная галерэя, а некаторыя работы выкуплены Нацыянальным мастацкім музеем. Дык вось, яму захацелася нейкага перфоманса на адкрыцці чарговага праекта. Ён паставіў нам задачу: каб было крэатыўна, не сумна. І мы прыдумалі праграму. Андрэю ўсё вельмі спадабалася, і пасля сталі падцягвацца і іншыя. А чаму б і не? У нас шмат таленавітых, вядомых за мяжой мастакоў. Хочацца дапамагчы ім стаць такімі ж вядомымі і на радзіме. Думаю, на такі арт-эксклюзіў знойдуцца і пакупнікі.

***— Калі не памыляюся, ваша агенцтва па арганізацыі святаў неаднаразова прызнавалася лепшым па выніках фестывалю-конкурсу "Выбар года". Ёсць у вас узнагароды і прэміі ў сферы шоу-бізнесу. І як актрыса вы дэбютавалі ў спектаклі "Два падкаблучнікі" ў Сучасным мастацкім тэатры. Чула таксама, што хутка выйдзе на экраны кінафільм "Малая радзіма" Вячаслава Сікоры з Ларысай Грыбалёвай у галоўнай ролі. І спявае яна на канцэртах без стомы, і запісваецца ў тэлепраграмах... Нарэшце, дома чакаюць дзеці, муж. Як паспяваеце?***

— Мне часцяком падаецца, што я нічога не паспяваю…

***— Можа, час адпачыць?***

— Публічная прафесія не дае такой магчымасці. Лёгка выпасці з поля зроку на час. Але можа стацца так: калі вернешся, цябе могуць і не ўспомніць.

***— Аднак музычная праграма "Усё нармальна, мама!", якую вы вялі больш як дваццаць гадоў назад, жывая ў памяці дагэтуль. І "Ранішнюю пошту" на пару з Юрыем Нікалаевым, народным артыстам Расіі, усе добра памятаюць, хоць яна скончылася ў 2012-м годзе.***

— Таму што "Усё нармальна, мама!" у той час стала "выстралам" у медыйную прастору, нічога падобнага на экране раней не адбывалася. Цяпер жа наўрад ці хтосьці будзе глядзець "Ранішнюю пошту" па тэлевізары. Ёсць інтэрнэт, дзе можна выбіраць любога выканаўцу і слухаць тое, што хочацца. Свет стаў больш хуткасным, мабільным і віртуальным. Гэта трэба ўлічваць.

***— Таму вы і вырашылі адкрыць сваё івент-агенцтва?***

— Калі мне прыйшла ў галаву такая ідэя, рынак падобных паслуг быў свабодны. Маючы досвед у гэтай сферы і сувязі, я хутка зарыентавалася. Ну не будаваць жа было супермаркеты для дзяцей і цяжарных мам!.. Хоць хацелася спачатку стварыць нешта падобнае, бо трынаццаць гадоў назад я, нарадзіўшы першую дачку, сутыкнулася з праблемай "беганіны" па ўсім горадзе ў пошуках памперсаў і дзіцячага харчавання…

***— Вы гаварылі, што дапамаглі аўтарам выставы "5=3" бескарысліва. У якіх іншых дабрачынных праектах удзельнічаеце?***

— На жаль, на раскрутку сваіх ідэй у мяне пакуль не хапае часу. Таму я абмяжоўваюся тым, што спяваю на дабрачынных канцэртах. А ідэі дару бясплатна (*смяецца*). Напрыклад, падказала вось якую думку знаёмым мастакам: прымяраць работы ў інтэр'еры патэнцыйнага пакупніка. Бо чалавек можа набыць твор мастацтва за вялікія грошы, а ён можа не ўпісацца ва ўбранне дома. У выніку, дарагая карціна дзе-небудзь у куце будзе пыліцца…

***— Ларыса, чаму не засталіся "проста спявачкай"?***

— Ды я наогул не збіралася ёю станавіцца! Як гаворыць мая мама, гэта не прафесія. Я скончыла педагагічны ўніверсітэт і збіралася вучыць дзяцей у пачатковай школе. Але лёс прадаставіў шанц, і я ім скарысталася. Вось і спяваю. Да таго ж, як можна было адмовіцца ад цікавых тэлепраектаў, якія потым сталі хітамі?



Антон Слюнчанка (Anton Snt) прэзентуе свае карціны



***— Хацелі б прадоўжыць кар'еру драматычнай актрысы?***

— Наўрад ці. Мне больш даспадобы гісторыя з камерай. Прызнаюся, вельмі сумую па здымках у кіно, у якім здымалася каля дзесяці гадоў. Таму з задавальненнем разгледзела б цікавыя прапановы.

***— Што скажаце пра беларускую эстраду?***

— Я рада, што ў нас разнапланавая музыка, і ў песнях ёсць сэнс. Але, на жаль, мы пакуль не навучыліся ганарыцца сабою і сваімі дасягненнямі. Але ж у Беларусі, такой невялікай краіне, шмат таленавітых хлопцаў і дзяўчат, якія спяваюць..

жыццё — гэта такі падарунак! Таму я хачу атрымліваць ад яго задавальненне і не маю права быць няшчаснай.

***— А ў чым сэнс шчасця?***

— І ў каханні, і ў дзецях, і ў тым, каб рабіць якасна сваю любімую працу. Калі чую пра сябе пахвальныя водгукі, то думаю: значыць, я ўсё зрабіла правільна.

***— Напэўна, таму вы ўваходзіце ў топ-10 паспяховых жанчын Беларусі. У чым жа сакрэт сацыяльнай паспяховасці?***

— Асабіста мой сакрэт поспеху такі: нічога і ні ад кога не чакай. Помні: табе ніхто нічога не павінен — ні дзяржава, ні людзі. Трэба самой

чужы". Да яе з дзецьмі нянькаліся і мае стрыечныя сёстры. Дарэчы, усе яны ў хуткім часе ўдала павыходзілі замуж. Аднойчы я жартам параіла сваёй адзінокай сяброўцы паглядзець за маімі дзецьмі. Смешна, але факт: неўзабаве яна таксама выйшла замуж.

***— Ваш шлюб доўжыцца дваццаць гадоў. Сышліся характарамі?***

— І так можна сказаць. Але, па-мойму, вельмі важна, наколькі камфортна ты сябе адчуваеш у шлюбе. А трымаюцца тыя сем'і, дзе людзі здольныя ўжывацца з недахопамі адзін аднаго. Бо з вартасцямі мы ўсе выдатна ладзім! Ну і, зразумела, узаемапавага і кампраміс у шлюбным саюзе абавязковыя.



ВІТАЛІЙ ГІЛЬ



Скульптуры Максіма Петруля не пакінулі наведвальнікаў абыякавымі

***— Якім б вы хацелі бачыць выканаўца на эстрадзе?***

— Акрамя вакальных дадзеных, спявак павінен быць і акцёрам. Многія пішуць песні і музыку, надзяваюць брыльянты перад выхадам на сцэну, але забываюць пра вобраз, у якім трэба жыць.

***— І ўсё-такі, хто вы: актрыса, спявачка, тэлевядучая ці бізнес-лэдзі?***

— Я і то, і другое, і трэцяе… Але яшчэ асмелюся сябе назваць чалавекам, які імкнецца несці людзям дабро, пазітыў. Я лёгка падладжваюся да эмоцый іншых людзей. І адчуваю сябе добра ў любым месцы, дзе астатнім — добра. А калі камусьці дрэнна — выцягваю чалавека са стану апатыі, дэпрэсіі. Бо калі не я, то хто? Відаць, я закончаны аптыміст, таму мне камфортна, калі ва ўсіх усё ў парадку. Бо

паднімацца і пачынаць нешта рабіць. Але, дзейнічаючы, не варта забываць: у жыцці ўсё вяртаецца бумерангам.

***— А сакрэт "вечнага юнацтва", пра які гавораць у сувязі з вамі — у добрых генах?***

— Іншага тлумачэння не знаходжу, таму што на спартзалу і ўсякія працэдуры ў мяне не хапае ні часу, ні сіл, ды і ўвечары, а то і перад сном, люблю паесці. Так што маці з бацькам вялікі дзякуй: яны падарылі мне магчымасць нічога з сабою не рабіць і добра пры гэтым выглядаць.

***— Хто глядзіць за дзецьмі ў вашу адсутнасць?***

— Іх бабуля. Гэта было яе валявое рашэнне. Хоць маці маёй падабалася яе работа. Але аднойчы яна сказала: "Не магу спакойна працаваць, ведаючы, што за маімі ўнукамі глядзіць нехта

***— А калі шлюб "трашчыць па швах", ці варта яго захоўваць дзеля дзяцей?***

— Розныя бываюць сітуацыі, але формула сям'і павінна захоўвацца абавязкова: бацька — прыклад і аўтарытэт, маці — любячая і клапатлівая. А ў шлюбе або па-за ім гэтая схема выконваецца — усё роўна. Дзеці, вядома, заўсёды ў прыярытэце. Але і самой маці трэба адчуваць сябе шчаслівай. Інакш дзеці будуць трансфармаваць гэтае няшчасце на свой лёс.

***— Вы спакойна расказваеце пра сваё шчаслівае асабістае жыццё ў розных інтэрв'ю. Сурокаў не баіцеся?***

— "Па веры вашай ды будзе вам" напісана ў Бібліі. Лічу, што ўсе праблемы ў нас — у галаве. Пра што думаем, тое і прыцягваем.

Аліса **Красоўская**

# Малюнкі душы ў рытме тэта-хваляў

**Як часта мы чуем пра таго ці іншага мастака: малюе душой. А вось як гэта адбываецца, па-мойму, здольны зразумець толькі той, хто хоць бы аднойчы, узяўшы ў рукі пэндзаль і мальберт, адчуў, што рухае ім не логіка і разлік і нават не падказкі дасведчанага педагога, а тое, што на мове слоў прынята называць “шостым” пачуццём, калі мозг працуе ў рытме тэта-хваляў. Прызнаюся, дзіўнае адчуванне…**


ІВАН ЖДАНОВІЧ

Майстар-класы па жывапісе для дарослых — ідэя мінскага псіхолага Наталлі Ал-Фаяд (на фота злева)

Аб праекце мінскага псіхолага Наталлі Ал Фаяд “Жывапіс для дарослых”, якая з дапамогай аднадумцаў праводзіць у Мінску майстар-класы па жывапісе для ўсіх жадаючых, мне расказала адна знаёмая. На іх я і пабывала.

Што з гэтага атрымаецца — з гэтым пытаннем я ехала ў адну з гарадскіх арт-студый, успамінаючы, як малявалі каляровымі алоўкамі ва ўзросце 4-5 гадоў. Не скрыю: глыбока ўнутры нешта мне гаварыла: не сумнявайся, усё будзе ў лепшым выглядзе. А потым бойкі розум тут жа нагадаў: ці мала ты рабіла карандашных накідаў твараў родных і сяброў ды і сябе не забывала намаляваць прыгажэй, чым ёсць…

Дагэтуль памятаю той наіўны малюнак на лістку з альбома. Мне ён падаваўся шэдэўрам. Памяць захоўвае вобраз саду, хлопчыка і дзяўчынку, якія гуляюць у мяч, з носікамі, падобнымі да птушыных дзюб, хутчэй вераб’іных, блакітнае неба над імі, усмешлівае сонца… І сваю радасць памятаю: я нават не сумнявалася, што малюнак атрымаўся. І каляровыя алоўкі, сярод якіх быў асаблівы — ярка-зялёны, як маладая трава ў садзе майго ўкраінскага дзяцінства. І сіне-блакітны, які нагадвае “вочка” любімай кветкі — барвенка, у фіялетавую чашачку якога мне так падабалася ўзірацца, калі падавалася: я здзяйсняю падарожжа ў іншы свет, туды, дзе жыве чараўніцтва… І пахвалу дзетсадаўскай выхавальніцы Валянціны Паўлаўны



ІВАН ЖДАНОВІЧ

Святлану Калкоўскую, мастака-педагога вышэйшай катэгорыі, чуюць і дарослыя, якія ўпершыню ўзялі ў рукі пэндзаль

мне не забыць: мастачкай будзеш… Я таксама памятаю размовы бацькоў на тэму, кім стануць дзеці, дзе ім вучыцца. І смяшок майго старэйшага, тады 17-гадовага брата Юрыя, маўляў, якая мастачка з нашай беднотай… А беднота і сапраўды была. Хоць сям'я музыканта-франтавіка Міхаіла Чаркашына і не галадала, на піяніна, на якім мне так моцна хацелася навучыцца іграць, ды і на вялікую двух'ярусную каробку каляровых алоўкаў тых грошай, якія бацька зарабляў, іграючы на танцах у Доме культуры па выхадных і служачы па сумяшчальніцтве загадчыкам гаспадаркі ў дзіцячым садку, было недастаткова.

Думаю, у многіх маіх аднагодак і ў тых, хто прыйшоў у іастудыю выказаць сваё ўспрыманне прыгожага з дапамогай палатна і фарбаў, было ў дзіцячыя гады нешта, што перашкодзіла развівацца ў тым ці іншым відзе творчасці. Гэтую выснову раблю на аснове сумнай гісторыі, якую мне расказала дзяўчына-эканаміст падчас чаяпіцця ў перапынку: аказалася, пісаць на палатне алеем, седзячы або стоячы запар гадзіны тры-чатыры, вельмі нават нялёгка. Мы разважалі пра тое, як добра, што ў Беларусі столькі студый для творчасці: выбірай

**Наталля Ал-Фаяд**

***Галоўная мая адукацыя — школа Жыцця. Да любой сітуацыі ў ім стаўлюся як да ўрока, з якога здабываю мудрасць. Жыццё — гэта Шлях! А каб усвядомлена, лёгка і камфортна прайсці гэты шлях, не трэба баяцца раскрываць сябе і свае інтуітыўныя здольнасці***






Наталля Беразоўская, аўтар многіх карцін, здольная дапамагчы пачаткоўцам у жывапісе

любую, дзе дзеці могуць раскрываць свае здольнасці.

"А я магла б стаць балерынай", — сказала мне, назаву яе выдуманым іменем, Вольга. Яна з сумам успамінала пра тое, як добрая радня, спытаўшы, кім дзяўчынкі, якія гулялі "ў класікі", хочуць быць, калі вырастуць, забіла ў ёй мару пра балет. Так і сказала: забілі… Аказалася, мая суразмоўніца, прачытаўшы ў сямігадовым узросце кніжку пра знакамітую рускую балерыну Галіну Уланаву, так пранікнулася яе лёсам, што стала марыць і пра сваё харэаграфічнае жыццё ў будучыні.

— Я малявала балерын дзе даводзецца: на пяску, на паперы, прычым у мяне гэта нядрэнна атрымлівалася, — расказвала яна, — і балетныя па дагэтуль раблю, і танцую… Я цяпер разумею, што, напэўна, гэта быў не мой шлях, раз не змагалася і здалася адразу ж пасля грубых слоў стрыечнай цёткі: "якая з цябе балерына, ногі тоўстыя…" І потым мы гаварылі з Вольгай, дарэчы, стройнай і прывабнай, пра тое, як важна падтрымліваць дзяцей у іх творчых памкненнях, бо ўсе яны таленавітыя, бачаць свет інакш, чым дарослыя…

Не так даўно даведалася: менавіта дзеці ва ўзросце ад 2 да 8 гадоў здольныя засяроджвацца на адной крыніцы інфармацыі, і тады іх мозг знаходзіцца ў стане тэта, гэта значыць, у частотным дыяпазоне 4-8 герц. Гэты дыяпазон спрыяе глыбокай рэлаксацыі галаўнога мозга, больш глыбокаму і хуткаму засваенню інфармацыі, абуджэнню індывідуальнай творчасці і талентаў.

Пасля таго, як я пабывала на майстар-класах Наталлі Ал Фаяд, зведаўшы, паўтаруся, асаблівыя пачуцці, палезла ў інтэрнэт, каб вывучыць пытанне, звязанае са станам тэта. Аказваецца, існуе пяць розных частот, на якіх наш мозг можа працаваць: бэта-хвалі, альфа-хвалі, тэта-хвалі, дэльта- і гама-хвалі. Усё, што мы робім і гаворым, кіруецца хвалевай частатой дзейнасці мозга, якая ў кожнай канкрэтнай сітуацыі будзе пераважаць над астатнімі яго частотамі. І калі чалавек зведвае творчы ўздым і натхненне, а яго перажыванні носяць узнёсла духоўны характар, пераважаюць тэта-хвалі. Выходзіць, і я перажывала нешта падобнае малюючы. Мяркую, у гэтым стане знаходзяцца людзі мастацтва ў моманты праяўлення сябе ў творчасці.

Першымі былі гартэнзіі. Калі прыйшла ў студыю "Стварэнне", практычна не было дзе, як гаворыцца, яблыку ўпасці. Усе, а гэта былі дамы розных узростаў, бойка перагаворваліся, разглядалі натуру — гартэнзіі, напісаныя жывапісцам Святланай Калкоўскай, правяралі мальберты. У пакоі стаяў пах фарбаў і парфумы, гучала ненадзойлівая музыка. Калі ўсе сабраліся і паселі за мальберты, Наталля Ал Фаяд прадставіла Святлану, мастака-педагога, якая вяла заняткі. Яна па першым нашым клічы падыходзіла і дапамагала выпраўляць мастацкія "ляпы", якія здаваліся нам кашмарам. А спачатку растлумачыла, як трымаць пэндзаль, карыстацца палітрай, колькі браць фарбы… Дарэчы, працаваць мы пачалі на лістах паперы А-4, практыкаваліся, каб не сапсаваць палотны. Час ляцеў непрыметна, і працэс малявання займаў дух. Я знаходзілася ў стане шчасця, упершыню ў жыцці працуючы з палатном і алейнымі фарбамі. У сваім прывітальным слове Наталля Ал Фаяд пажадала нам адчуць сябе ў патоку творчасці і натхнення, малюючы гартэнзіі. Яна гаварыла і пра тое, што мы ўсе — таленавітыя, пра што не павінны ніколі і ні пры якіх абставінах забываць, давяраючы самім сабе. Яшчэ і пра безумоўную любоў гаварыла Наталля, пра тую, якой нас любіць Творца і якую мы ўсе здольныя зведваць, калі намеры нашы будуць чыстымі. А Святлана дадала, што мяне таксама ўразіла: "Што напіша ваша душа, якія вы, то мы сёння ў канцы заняткаў і ўбачым". У фінале


ІВАН ЖДАНОВІЧ

На майстар-класе ў арт-студыі “Сонца” мы малявалі півоню

майстар-класа тых, хто маляваў упершыню, пасвячалі ў мастакі, фатаграфуючы ў блакітным берэце і з уласнай, толькі што напісанай карцінай.

Скажу, што карціны ва ўсіх 15 чалавек, на самай справе, атрымаліся. Усе яны былі рознымі, усе без выключэння ўнікальнымі.

На другім занятку праз пару тыдняў, калі гартэнзіі яшчэ не высахлі, мы малявалі півоню. Працавала з намі ўжо Ала Кейге, член Саюза майстроў Беларусі, мастак-педагог і кіраўнік іншай арт-студыі — “Сонца”, вядомай у Мінску сваімі крэатыўнымі праектамі. Ала — прыроджаны педагог. Яе душэўная мяккасць і ўважлівасць мяне пакарылі адразу ж. І атмасфера заняткаў была асаблівай, яна схіляла да душэўнага камфорту, калі перастаеш думаць аб тым, каб у цябе ўсё атрымалася, а проста бярэш і малюеш, слухаючы настаўніка, забыўшы пра дух спаборнасці і пра эгаістычнае, уласцівае нам жаданне быць лепшымі і камусьці нешта даказваць.

Півоню мы пісалі ў іншай тэхніцы: ужо не пэндзлем, а пальцамі, што для мяне было яшчэ больш займальным. Часам нават падавалася: я выпадаю з рэальнасці — і побач няма нікога, толькі ты і тваё палатно…

Як і на першым занятку, нам дапамагала эканаміст Наталля Беразоўская, сяброўка Наталлі Ал Фаяд: раздавала палітры, выціскала і змешвала фарбы, падлівала растваральнік, бегаючы ад мальберта да мальберта, падказвала, што да чаго. Ці малюе сама?

— Я ніколі не захаплялася жывапісам. Аднойчы пабывала ў Наталлі Ал-Фаяд на лецішчы, гэта быў жнівень 2015. Менавіта там і натхнілася! У Наташы — сапраўдная майстэрня! Цудоўная атмасфера творчасці, пах алейнай фарбы ўперамешку з растваральнікам закружылі мне галаву. “А можа, ты таксама хочаш паспрабаваць?” — спытала яна. Як і што рабіць, я толкам не ведала, але ўнутры нешта загарэлася, і я ўзяла пэндзаль у рукі… Прайшоў роўна год, і ўжо нямала карцін напісана. Нешта пісала ў падарунак, нешта прададзена, а нешта паляцела за мяжу… А цяпер з задавальненнем дапамагаю на майстар-класах, якія Наташа арганізоўвае.

Што ж, добрую яны робяць справу, прадастаўляючы людзям магчымасць раскрываць свае таленты і здольнасці. Толькі вось навошта Наталлі Ал Фаяд гэта трэба? Скончыла эканамічны ўніверсітэт (БДЭУ), а пасля стала ўладальнікам яшчэ двух дыпломаў аб вышэйшай адукацыі — бізнесу вучылася ў Акадэміі Лявона Казьмінскага ў Варшаве, а псіхалогіі ў Мінскім інстытуце культуры. А пачынала, дарэчы, настаўнікам пачатковых класаў, бо з дзяцінства марыла вучыць дзяцей. Але, відаць, гаворыць, не яе гэта былі мары, хутчэй іх навеяла асяроддзе любімых школьных настаўнікаў, з якіх хацелася браць прыклад.


Пасвячэнне ў мастакі

Як часта ў выбары прафесіі мы становімся не тымі, кім хочам быць, і да мары ідзём доўгімі акружнымі шляхамі. І шчасце, калі ўсё-такі прыходзім да яе ажыццяўлення. Вось і Наталля прыйшла, але не адразу. Перажыўшы ў 16-гадовым узросце вялікае гора — у аўтакатастрофе загінулі бацькі, брат і яшчэ некалькі блізкіх сваякоў, — яна не толькі не зламалася, але і прыняла рашэнне стаць моцнай і паспяховай. Шукала сябе ў розных прафесіях. І не знаходзіла — ні ў менеджменце, ні ў бізнесе, хоць лічыць сябе нядрэнным экспертам у стварэнні бізнесу. Але бліжэй за ўсё ёй псіхалогія. Сёння Наталля — практыкуючы псіхолаг, які выкарыстоўвае новы напрамак у сферы самапазнання — тэта-хілінг, адзін з унікальных метадаў, заснаваных на адкрыццях квантавай фізікі. “Хілінг” у перакладзе з англійскай мовы азначае вылячэнне, а “тэта” — назва пэўных частот мозга. Тэта-Хілінг не медыцынская працэдура і не замена медыцынскага лячэння. Тэта-Хілінг — метад-медытацыя, які спрыяе гарманізацыі натуральных жыццёвых сіл арганізма для павышэння яго здольнасцяў да вылячэння і аднаўлення. Аднойчы і Наталля, зразумеўшы, што метад працуе, умацавалася ў ім. Таму, пастаянна паглыбляючы свае веды, дапамагае людзям навучыцца аказваць дапамогу сабе самім, раскрываць інтуітыўныя здольнасці і знаходзіць адказы на хвалюючыя пытанні. А пісаць карціны — адзін са спосабаў, які некалі і самой Наташы дапамог у жыцці, напоўніўшы яе прыгажосцю і энергіяй любові. Адсюль і майстар-класы па жывапісе для тых, хто разумее: жыццё — гэта шлях. І ўсе мы вучні на гэтым шляху. Але як па ім ісці, выбар за намі.

Часам перад сном, гледзячы на сваю півоню, дзе прама ў чашачцы кветкі залоцяцца тычынкі, абазначаныя літаральна некалькімі штрыхамі Алай Кейге, я патанаю ў яе глыбіні. І тады мне падаецца: чароўны свет зусім побач.

Валянціна **Ждановіч**


Мастачка Зузана Граус Рудаўска

# Свет, які стварае Зузана

## Мастацкая галерэя “Універсітэт культуры” ладзіць арт-праекты вядомых замежных аўтараў, знаёмячы беларусаў з іх творчымі дасягненнямі

Для чытачоў часопіса нагадаю: мастацкая галерэя “Універсітэт культуры” дзейнічае ў Мінску, у Палацы Рэспублікі (Кастрычніцкая плошча,1) з 2002 года, гэта структурнае падраздзяленне Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Асноўная місія галерэі — стварэнне спрыяльных умоў для развіцця творчага патэнцыялу студэнтаў, а таксама маладых таленавітых мастакоў, іх усебаковая падтрымка ў рэалізацыі сваіх ідэй. А для маладых творцаў важна бачыць, як рэалізуюць сябе ў мастацтве мастакі з розных краін — таму і ладзім мы арт-праекты вядомых замежных аўтараў.

Смелыя эксперыменты з формаю, аб’ёмам, колерамі, тэхнікамі, з рознымі матэрыяламі — гэта, на мой погляд, і ёсць адметная рыса творчасці знакамітай славацкай мастачкі Зузаны Граус Рудаўскай. На выставе ў нашай галерэі яна прадставіла творы з медзі, бронзы, шпагату, паперы, хрусталю, каштоўных і паўкаштоўных камянёў. Кожны твор — адметны, годны ўвагі ды захаплення: арт-аб’екты, элементы дэкору... Упрыгажэнні ад Зузаны здольныя

КАЦЯРЫНА АЛЯКСЕЕВА


Такія творы мастацтва ўпрыгожаць любы інтэр’ер

надаць кожнай жанчыне элегантнасць, непаўторнасць, элітарнасць. А на яе творы мастацтва хочацца глядзець, шукаць у іх усё новыя значэння і сэнсы. Плёнам творчасці Зузана дзеліцца з намі, прапаноўваючы стаць суаўтарамі: бо да таго, што бачыцца, у кожнага ж можа быць свая інтэрпрэтацыя.

Ювелір, скульптар, дызайнер вельмі ўдала ўзаемадапаўняюць у асобе адметнай майстрыхі адзін аднаго. І фантазія аўтаркі — не ведае межаў. А часам, падаецца мне, што гэта гарачае ды гуллівае, непасрэднае, проста-такі дзіцячае жаданне зрабіць прыгажосць з усяго, што бачыш навокал, штурхае ў рост яе чарговую кампазіцыю. Яшчэ цікава назіраць, як з нейкіх хаатычных мностваў мастачка сінтэзуе гарманічнае адзінства, сплавіўшы, дзякуючы "тыглю натхнення", рознае — у дасканалае. Гэтак, дарэчы, і прырода з розных кветак творыць суквецце, з розных ягадак — непаўторную па форме гронку. І шмат розных асацыяцый узнікае, калі сузіраеш такія незвычайныя "ўпарадкаваныя", адухоўленыя светлым талентам творы Зузаны. Калі спасцігаеш мудры і гарманічны свет, які яна стварае.

Між тым кожны мастак, ствараючы свае вобразы, гаворыць-творыць і ў плыні традыцый зямлі, народа, культуру якога ў сябе ўвабраў. Гэта — як вінаград: на якім вінаградніку ён вырас, такія й адценні смаку, флюіды ад мясцовасці ўвабралі ў сябе ягады, потым віну перадалі… Дарэчы, у даведніках для турыстаў знаходзім, што славакі — адмысловыя вінаробы, іх вінаградныя лозы ўбіраюць промні сонца і сокі зямныя ў вельмі спрыяльных умовах. Кажуць, славу знакамітых такайскіх він Славакія з гонарам дзеліць з Венгрыяй. А як цэніцца ў свеце славацкі хрусталь! Вазачкі, люстры, фантазійныя сасуды і скульптуры з карункавага шкла і хрусталю — гэта ж таксама Славакія. І мімволі на выставе славачкі Зузаны Граус Рудаўскай спрабуеш глядзець на ўсю Славакію — праз прызму яе твораў. Тым болей, што і назва мінскай выставы "падказвае" думкам, у які бок ім рухацца: "Дакрананне Славакіі. Малюнак. Аб'ект. Каштоўнасць".

Выстава з поспехам прайшла ў цэнтры Мінска, мела станоўчы розгалас у беларускай прэсе. Варта сказаць, што раней аўтарка паказвала свае арыгінальныя творы ў гарадах Браціславе





і Кошыцэ (Славакія), Нью-Ёрку і Тусоне (ЗША), Рыме (Італія), Капенгагене (Данія), Празе (Чэхія), Таяма (Японія). Беларусь прымала сёлета гэты арт-праект упершыню. Спачатку была выстава Зузаны ў Віцебскім мастацкім музеі — летам, падчас Міжнароднага фестывалю мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску". А ў Мінску мы віталі знакамітую мастачку, яе творы з нагоды Дня Канстытуцыі Славацкай Рэспублікі ды яе старшынства ў Савеце Еўрасаюза.

На вернісажы Пасол Славакіі ў Беларусь Ёзэф Мігаш выказаў задаволенасць, што ў беларускай сталіцы першае мерапрыемства Славакіі ў статусе старшыні Савета Еўрасаюза носіць культурны характар: "Тым самым мы пацвярджаем свае прыярытэты па развіцці культуры і прасоўванні высокіх каштоўнасцяў, па наладжванні міжкультурнага дыялогу". А намесніца Міністра замежных спраў Беларусі Алена Купчына заўважыла: культура заўсёды была і застаецца важным фактарам дыпламатыі. Выстава Зузаны Граус Рудаўскай, лічыць дыпламатка, безумоўна, у чарговы раз паслужыць умацаванню культурных сувязяў паміж нашымі краінамі.

Прадаўжаючы "вінаградны вобраз", варта заўважыць, што таленавітая мастачка ўвабрала ў сябе не толькі "водары Славакіі". З біяграфіі Зузаны вядома, што яна закончыла Школу прыкладнога мастацтва ў Браціславе, а яшчэ — Інстытут прыкладнога мастацтва ў Празе. Потым жа доўгі час жыла ў Злучаных Штатах Амерыкі, дзякуючы сваёй творчасці стала адной з самых вядомых прадстаўніц славацкага замежжа. Зузана Граус Рудаўска — лаўрэат прэміі Скульптурнага парку Сакрата (Нью-Ёрк), мае ўзнагароду "Залаты арол" (Вашынгтон) і грант Фонду Полак-Краснера. Творчыя праекты спадарыні Зузаны ў Беларусі, спадзяюся, будуць мець працяг.

Павел **Сапоцька,**
дырэктар мастацкай галерэі "Універсітэт культуры"



Упрыгажэнні ад Зузаны Граус Рудаўскай — гэта элегантнасць, непаўторнасць, элітарнасць



Экспазіцыя ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі

# У музейным куфры заўсёды шмат цікавага

**Нацыянальны мастацкі музей Беларусі — сапраўдная скарбніца прыгожага. У гэтым лёгка пераканацца, дастаткова прыйсці ў музей на экскурсію. Тут кожны знойдзе тое, што не можа не выклікаць цікавасці і пакінуць абыякавым да выстаўленых экспанатаў. Уся справа ў тым, што ў музея — адна з найбагацейшых у Еўропе пастаянных экспазіцый. Час ад часу яна абнаўляецца, калі з фондаў — таксама багатых на арыгінальныя рэчы — прадстаўляецца на агляд нешта асабліва цікавае. Але і гэта яшчэ не ўсё. Часам пры поўным аншлагу ў музеі праходзяць планавыя выставы. Далёка не апошнюю ролю тут адыгрывае тая акалічнасць, што выставы плануюцца вельмі дасканала, а крытэрый іх адбору заўсёды прафесійны.**

# Ажыятаж толькі падкрэслівае ўнікальнасць калекцыі

Вось і цяпер вялікую цікавасць у наведвальнікаў Нацыянальнага мастацкага музея выклікае прадстаўленая тут выстава работ з калекцыі прыватнага збіральніка Аляксандра Валадчынскага. Ужо два месяцы як адкрылася экспазіцыя, а ажыятаж вакол яе толькі нарастае.

Больш як 100 твораў рускага жывапісу XIX-XX стагоддзяў вядомых майстроў прадстаўлена на гэтай выставе. Дарэчы, яна будзе экспанавацца аж да пачатку лютага будучага года. На ёй гледачы могуць бачыць работы такіх майстроў, як Васіль Пяроў, Іван Айвазоўскі, Ілья Рэпін, Ісаак Левітан, Віктар Васняцоў, Канстанцін і Уладзімір Макоўскія, Аляксандр Бенуа, Мсціслаў Дабужынскі, Натан Альтман і іншых. Сярод работ — аўтарскія варыянты знакамітых твораў, у тым ліку “Бярозавы гай” Архіпа Куінджы, “Віцязь на ростанях” Віктара Васняцова, “Міраж у стэпе” Паўла Кузняцова, “У акне” Барыса Кустодзіева. Ёсць у калекцыі і творы жывапісцаў, якія належалі да аб’яднання “Блакітная ружа”: Мікалая Сапунова, Паўла Кузняцова, Мартыроса Сар’яна, Артура Фанвізіна, а таксама работы ўдзельнікаў таварыства мастакоў “Бубновы валет”.

Немалое месца ў калекцыі Валадчынскага займаюць творы майстроў, так ці інакш звязаных з роднай для яго Беларуссю, дзе нарадзіліся Апалінарый Гараўскі і Рыгор Баброўскі, Вітольд Бялыніцкі-Біруля і Станіслаў Жукоўскі. Дарэчы, адну з работ вядомага беларускага пейзажыста Вітольда Бялыніцкага-Бірулі Аляксандр Валадчынскі падарыў Нацыянальнаму мастацкаму музею ў дзень адкрыцця выставы ў Мінску.

Не будзе перабольшаннем сказаць, што збор Аляксандра Валадчынскага цікавы і шырокаму колу аматараў мастацтва, і спецыялістам у галіне жывапісу. У цяперашняй жа калекцыі ў Мінску прадстаўлены творы бытавога жанру другой паловы XIX стагоддзя, рускі пейзаж, карціны перадзвіжнікаў і рускіх імпрэсіяністаў.

Уладальнікі калекцый бываюць розныя. Адны хаваюць свае скарбы за сямю замкамі, атрымліваючы асалоду ад мастацтва ў адзіноце. Другія лічаць за лепшае паказваць карціны на выставах і ў музеях. Калекцыя Валадчынскага ўпершыню паўстала на суд гледачоў у Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі. Тым не менш, гэтая дэбютная экспазіцыя атрымалася вельмі годнай, усе карціны — музейнага ўзроўню. Дзіўна, але ў залах добра ўжываюцца палотны зусім розных жанраў. Сакрэт напэўна крыецца ў тым, што ўсе карціны сабраныя з вялікай любоўю і густам.

Сапраўды, усе імёны ў экспазіцыі — “старажылы” рускага жывапісу XIX-XX стагоддзяў: Аляксандр Кісялёў, Аляксей Багалюбаў, Віктар Васняцоў, Ісаак Левітан, Іван Айвазоўскі, Васіль Пяроў, браты Канстанцін і Уладзімір Макоўскія, Ілья Рэпін, Аляксандр Асьмёркін, Аляксандр Дэйнека, Аляксандр Тышлер, Натан Альтман... Акрамя эстэтычнай асалоды ад палотнаў рускіх майстроў, наведвальніка чакаюць прыемныя адкрыцці і сюрпрызы, паколькі некаторыя аўтары паўстануць у новым аспекце. Так, невялікі пейзаж зімовага Маскоўскага Крамля аказваецца карцінай... баталіста Васіля Верашчагіна, а вялікае гістарычнае палатно, прысвечанае судоваму працэсу па справе аб здачы Порт-Артура, належыць пэндзлю пейзажыста Мікалая Дубаўскога. У караблі “Марсэльеза” таксама не адразу адгадваецца рука Аляксандра Тышлера, а белаваты “Пейзаж з парусьнікам” Ісаака Левітана нагадае хутчэй жывапіс Архіпа Куінджы, чым звыклыя публіцы палотны спевака рускай прыроды.



Работы з калекцыі А. Валадчынскага



Х. Суцін. “Нацюрморт з рыбамі”. 1917



Ул. Макоўскі. “Вясёлы анекдот”. 1901



Д. Бурлюк. "Летні пейзаж". 1910



В. Васняцоў. "Віцязь на ростанях". Пачатак XX стагоддзя

Асобная зала аддадзена братам Макоўскім. Асабліва шмат тут Уладзіміра Макоўскага, які пісаў сцэнкі з гарадскога жыцця 1900-х гадоў. Мастак іранічна і тонка паказвае сваіх персанажаў, ставячыся да іх усё ж па-бацькоўску цёпла. Усе бытавыя замалёўкі Макоўскага, па сутнасці, цэлыя аповеды, у якіх адгадваецца і месца дзеяння, і статус герояў, якім сам аўтар спачувае, і, вядома, мараль... У карціне "Дэспат сям'і" Уладзімір Макоўскі іранізуе наконт стылю жыцця некаторых субратаў па цэху. Ён намаляваў мастака, які піша вялікае палатно, прымушаючы пазіраваць усіх дамачадцаў — ад старога да немаўляці. А ў карцінах "На выставе" ды "Інтэрв'ю" многія аматары мастацтва сёння пазнаюць будні сталічных вернісажаў.

Ёсць на выставе і партрэты пэндзля Ільі Рэпіна, Канстанціна Сомава і Канстанціна Макоўскага. Графічныя партрэты драматурга Эжэна Іанэска, створаныя рукой Юрыя Аненкава, і шарж на рэжысёра Усевалада Мейерхольда, зроблены Мікалаем Кульбіным. А побач з імі адзін з апошніх набыткаў Аляксандра Валадчынскага — малюнак Натана Альтмана "Спячы Міхаэлс".

Аляксандр Валадчынскі збірае жывапіс вось ужо больш як 25 гадоў. Так, ён родам з Беларусі, лічыць яе сваёй радзімай. Як гаворыць сам калекцыянер, да збіральніцтва ішоў цярністым шляхам, хоць яго цікавасць да мастацтва ўзнікла яшчэ ў юнацтве дзякуючы настаўніку музыкі, які расказваў не толькі пра музыку, але і пра мастакоў той ці іншай эпохі. Спачатку Валадчынскі купляў альбомы жывапісцаў, якія яго цікавілі. Калі з'явілася магчымасць, стаў набываць палотны. Любая калекцыя адлюстроўвае інтэлект уладальніка, яго прыхільнасці і густ. Перавагі Аляксандра Валадчынскага мяняліся: адзін час цікавілі авангардысты ды імпрэсіяністы, пазней захапіўся рэалістычным напрамкам у жывапісе. Галоўным для яго з'яўляецца адчуванне: "Калі купляеш карціну і бачыш у ёй толькі жывапіс, гэта не працуе. Гэта павінна перайсці ўсё ў нейкую іншую стадыю, калі яна цябе закранае, прыцягвае", — расказаў калекцыянер.

Сёння збор Аляксандра Валадчынскага налічвае каля 300 твораў і працягвае развівацца "па любві" — калекцыянер не абмяжоўвае сябе якімі-небудзь жорсткімі часовымі або



У экспазіцыі работ з калекцыі А. Валадчынскага

стылістычнымі рамкамі. Мастацтвазнаўца і эксперт Уладзімір Пятроў асабліва адзначае сабраныя Валадчынскім творы бытавога жанру другой паловы XIX стагоддзя, работы перадзвіжнікаў і "рускіх імпрэсіяністаў". Зрэшты, нараўне з рускай класікай у зборы ёсць еўрапейскія майстры — Маіс Кіслінг, Сюзанна Валадон, Каміль Каро.

Ну а на выставе ў Мінску на самых бачных месцах размясціліся "першыя імёны": аўтарскі варыянт "Віцязя на ростанях" Віктара Васняцова, "Плач Яраслаўны" Васіля Пярова, пейзажы Іваны Айвазоўскага суседнічаюць са "Жнівом" Аляксандра Кісялёва і з нечаканай для аматараў пейзажаў Мікалая Дубаўскога драматычнай работай "Порт-Артурская справа", дзе адлюстраваны судовы працэс па справе аб здачы Порт-Артура падчас Руска-японскай вайны. Так, неяк нязвыклыя добра знаёмыя аўтары: амаль сімвалісцкі позні "Паруснік" Ісаака Левітана і вытканы з пераліваў белага колеру "Від на Маскоўскі Крэмль узімку" Васіля Верашчагіна.

А вось калекцыя паступова перацякае ў XX стагоддзе — з карцінамі Канстанціна Каровіна і Барыса Кустодзіева, празрыстай работай Канстанціна Юона "Правінцыя. Кірмаш" і цудоўнай мініяцюрай Івана Пахітонава "Задворная сажалка. Жабаўшчызна". Фраза "як у Траццякоўскай галерэі" пастаянна гучыць у залах выставы, таму ўжо практычна чакаеш з'яўлення пейзажа Мсціслава Дабужынскага і партрэтаў Юрыя Аненкава, малюнка Натана Альтмана ("Спячы Міхаэлс" — нядаўні набытак калекцыянера), твораў Роберта Фалька і Аляксандра Асьмёркіна (яго "Півоні" 1951 года задаюць верхнюю часавую мяжу выставы).

Аляксандр Валадчынскі сам, паміж тым, гаворыць, што яго калекцыя сумбурная, бо перавагі пастаянна мяняліся: "Былі ў збіральніцтве і перамогі, і засмучэнні, але мяне гэта не спыніла, наадварот, толькі падагравала мой азарт. У нейкі момант я зразумеў, што гэта вялікая частка майго жыцця. Набываючы кожную работу, я думаў, ці зацікавіць яна маіх дачок, ці спадабаецца ім. А калі яны падраслі, я стаў з імі раіцца, і сам працэс збіральніцтва дастаўляе мне вялікае задавальненне, нават калі нашы погляды і густы не супадаюць".



На выставе "Свет і паветра. Жывапіс Натана Воранава"

## Статус, які дорага каштуе

Напэўна, з часовых экспазіцый у Нацыянальным мастацкім музеі ніяк нельга абысці ўвагай яшчэ адну: маштабную выставу карцін да стагоддзя з дня нараджэння Натана Воранава

На выставе "Святло і паветра. Жывапіс Натана Воранава" прадстаўлены творы 1940-1970-х гадоў са збораў Нацыянальнага мастацкага музея, сям'і і прыватных калекцый. Большасць з іх адносяцца да сталага перыяду творчасці гэтага дзіўнага аўтара.



Н. Воранаў. "Ружы". 1956

А за сваё яркае жыццё майстрам былі створаны незвычайныя па прыгажосці і выразнасці мастацкай мовы творы, якія вылучаюцца жанравай і тэматычнай разнастайнасцю. Аднойчы пагружаны ў свет поўнай цемры і цудам вернуты з яго — падчас вайны асколкі варожай міны патрапілі ў вочы будучага жывапісца, на нейкі перыяд пазбавіўшы яго зроку, — Натан Воранаў на працягу ўсяго жыцця апяваў прыгажосць свету рэчыўнага, азоранага разнастайнасцю колеру ва ўсёй яго паўнаце. Колер назаўжды заняў галоўнае месца ў яго творчасці.



Н. Воранаў. "Цікавая кніга". 1954

Дарэчы, прамяняць пэндзаль на вінтоўку ў гады Вялікай Айчыннай вайны ён вырашыў добраахвотна. Пайшоў на фронт на апошнім курсе інстытута перад самым дыпломам.

На фарміраванне мастацкай мовы Натана Воранава і яго творчага крэда паўплывала некалькі фактараў. Ён заўсёды займаў актыўную грамадскую па-



Творчасць Натана Воранава з гадамі не губляе цікавасці да сябе



Н. Воранаў. "Поўдзень". 1977



Н. Воранаў. "Раніца ў Кастрычніку. Мінск, 1917 год". 1955-1957

зіцыю. Неадназова выбіраўся членам праўлення Саюза мастакоў Беларусі, з 1963 па 1965 год выконваў абавязкі старшыні праўлення саюза. Мастак быў верны ідэалам свайго часу і прытрымліваўся ў творчасці асноўных догм сацрэалізму — адзінага тады дапушчальнага стылю ў афіцыйным мастацтве. За тры дзесяцігоддзі творчага шляху жывапісец стварыў нямала карцін на гісторыка-рэвалюцыйную і ваенную тэму, пісаў партрэты сучаснікаў, індустрыяльныя і лірычныя пейзажы, нацюрморты. Пры гэтым сюжэтна-тэматычная карціна заставалася для майстра прыярытэтнай.

Паміж тым, мастацкая спадчына Натана Воранава шмат у чым актуальная і сёння. Як бы там ні было, а ў аснове яго карцін ляжыць творчае пераасэнсаванне імпрэсіянізму, а таксама ў вядомай меры — постімпрэсіянізму. Гэта і стала фірменным почыркам аўтара.

Шчырае захапленне мастацтвам авангарду пачатку XX стагоддзя і яго разуменне Натану Воранаву прывіў выдатны савецкі мастак і педагог Аляксандр Асьмёркін. Спалучэнне розных мастацкіх традыцый з несумненным талентам каларыста і робіць яго аўтарскую манеру заўсёды пазнавальнай, запамінальнай.

Натан Воранаў пайшоў з жыцця ў самым росквіце творчых сіл. Колькі яшчэ ім было задумана, колькі планаў ён выношваў у сваім сэрцы — гэта назаўжды застанецца таямніцай. Аднак тое, што жывапісец пакінуў пасля сябе, з'яўляецца найвялікшым набыткам.

Зрэшты, для нашчадкаў сям'і палотны Натана Воранава — больш, чым шэдэўры савецкага мастацтва. Гэта гісторыя роду, захаваная дзедам у партрэтах. Унукі заслужанага дзеяча мастацтваў БССР Уладзімір і Павел працягваюць справу знакамітага продка і нават на адкрыццё яго выставы прыйшлі з пэндзлем. Уносілі праўкі. Карэкціравалі, праўда, не работы дзеда, а ўсяго толькі пастарэлы багет, які абрамляе яго работы.

Так, сёння творы Воранава са збораў сям'і майстра, прыватных калекцыянераў і ўласных фондаў прадстаўляе Нацыянальны мастацкі музей. Гэта больш за паўсотню гістарычных карцін, партрэтаў сучаснікаў, індустрыяльных і лірычных пейзажаў, нацюрмортаў. Акрамя таго, спецыяльна да стагоддзя майстра галоўнае сховішча жывапісу краіны выпусціла першую ў гісторыі кнігу, прысвечаную жыццю і творчасці Натана Воранава. А яшчэ непасрэдна на цырымоніі ўрачыстага адкрыцця выставы прайшла прэзентацыя канверта з паштовай маркай, якая адлюстроўвае творчасць жывапісца.

…Некалі пагружаны ў свет цемры, ён марыў пра колер. Пасля папраўкі да канца свайго жыцця эксперыментаваў з разнастайнасцю палітры. Перамога фарбаў над змрокам і дазволіла Натану Воранаву надоўга пакінуць за сабою статус аднаго з лепшых каларыстаў у гісторыі беларускага жывапісу. Гэта дарагога варта.

Веніямін **Міхееў**



Натан Воранаў. “Сонечны дзень”. 1958